ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1991 г.
№ 34 (954) 21 — 27 жніўня 2010 г.

КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-АСВЕТНІЦКАЯ ГАЗЕТА

ТВАЯ ДАБРАЧЫННАСЦЬ АД СЛОЎ — “НЕ ЗАБЫЦЬ!”

У адпаведнасці з Даручэннем Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі быў адкрыты спецыяльны дабрачынны рахунак на ўзвядзенне новага будынка Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Прымі ўдзел ва ўсенародным будаўніцтве аб’екта Памяці, Славы і Гонару нацыі!

Фота Юрыя ІВАНОВА

С. 3

- Р/С 3642900000887 у беларускіх рублях, філіял № 510 ААТ “АСБ Беларусбанк”, г. Мінск, код 603, УНН 100235472;
- Р/С 3642900000858 у доларах ЗША, філіял № 510 ААТ “АСБ Беларусбанк”, г. Мінск, код 603, УНН 100235472;
- Р/С 3642900000917 у еўра, філіял № 510 ААТ “АСБ Беларусбанк”, г. Мінск, код 603, УНН 100235472;
- Р/С 3642900000904 у расійскіх рублях, філіял № 510 ААТ “АСБ Беларусбанк”, г. Мінск, код 603, УНН 100235472.

З улікам банкаў даных адораных і таленавітых

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка падпісаў 17 жніўня Указ № 427 “Аб унясенні дапаўненняў ва ўказы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 26 ліпеня 2004 года № 354 і ад 29 лістапада 2005 года № 565”.

Гэты нарматыўны дакумент накіраваны на карэкціроўку шэрагу ўказаў Кіраўніка дзяржавы ў сувязі з прыняццем Указа Прэзідэнта Беларусі ад 26 красавіка 2010 г. № 199 “Аб некаторых пытаннях фарміравання, вядзення і выкарыстання банкаў даных адоранай і таленавітай моладзі”.

У мэтах стварэння ўмоў для прафесійнага і кар’ернага росту адоранай і таленавітай моладзі прадугледжваецца ўнясенне дапаўненняў ва Указ ад 26 ліпеня 2004 г. № 354 “Аб рабоце з кіруючымі кадрамі ў сістэме дзяржаўных органаў і іншых дзяржаўных арганізацый”. Цяпер пры фарміраванні рэзерву кіруючых кадраў і перспектыўнага кадравага рэзерву будзе вывучацца, у тым ліку, інфармацыя аб грамадзянах, уключаных у банкі даных адоранай і таленавітай моладзі.

Унесена дапаўненне таксама ва Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 29 лістапада 2005 г. № 565 “Аб некаторых мерах па рэгуляванні жыллёвых адносін”, згодна з якім, грамадзянам, уключаным у банкі даных адоранай і таленавітай моладзі, прадастаўляецца права пазачарговага атрымання жылых памяшканняў у інтэрнаце дзяржаўнага жыллёвага фонду на перыяд навучання.

Указ уступае ў сілу пасля яго афіцыйнага апублікавання.

Паводле паведамлення Прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

Беларускія знаходкі ў Шанхаі

Нацыянальны дзень Беларусі на “ЭКСПА-2010” адбудзецца 11 кастрычніка. На гэтую дату запланаваны афіцыйны візіт Прэзідэнта нашай краіны Аляксандра Лукашэнкі ў Кітайскую Народную Рэспубліку. Пра гэта паведаміў на прэс-канферэнцыі ў Грамадскім прэс-цэнтры Дома прэсы намеснік старшыні Беларускай гандлёва-прамысловай палаты Юрый Ласіцкі.



У рамках Нацыянальнага дня адбудзецца гала-канцэрт майстроў мастацтваў нашай краіны. Пасля, як мяркуецца, наша дэлегацыя накіруецца ў Пекін, дзе распачнуцца Дні культуры Беларусі ў Кітайскай Народнай Рэспубліцы.

Як адзначыў Юрый Ласіцкі, прадстаўнікі дырэкцыі Нацыянальнай беларускай экспазіцыі ўдзельнічалі ў мерапрыемствах Нацыянальных дзён Кубы, Аргенціны, Егіпта, Румыніі, Іарданіі, Кіргізіі ды іншых краін. “Выступленні айчынных артыстаў на Сусветнай выстаўцы “ЭКСПА-2010” у Шанхаі — добрая знаходка для ўспрымання гасцямі форуму Нацыянальнага павільёна Беларусі”, — дадаў ён. Ужо тры мільёны чалавек наведалі наш павільён. Чакаецца, што ўсяго іх будзе каля сямі мільёнаў. А творчасць беларускіх выканаўцаў з’яўляецца для іх найбольш яркім уражаннем.

Цяпер наведвальнікі Сусветнай выстаўкі два разы на дзень могуць пабачыць канцэрты артыстаў Мінскай вобласці: гэта ансамбль старадаўняй беларускай музыкі “Пастараль” з Дзяржынска і фальклорны ансамбль “Крупіцкія музыкі” з Мінскага раёна. 17 жніўня яны выступілі з сольным канцэртам на плошчы Еўропы, а таксама ў павільёне кітайскага горада Ханьчжоу.

У нашым павільёне пастаянна працуюць 12 чалавек: у іх лік уваходзяць беларускія студэнты, што навучаюцца ў ВНУ Кітая і валодаюць мовай гэтай краіны, а таксама кітайцы — валанцёры выстаўкі, якія засвойваюць беларускую і рускую мовы. Як было заўважана, кожны трэці наведвальнік (а іх у дзень праходзіць праз павільён 35 — 40 тысяч) набывае сабе сувенір, створаны ў нас. Найбольш гасцей — з Кітая, Далёкага Усходу, ЗША, Еўропы, Тайланда, В’етнама. Ёсць і беларускія турысты. Па словах Юрыя Ласіцкага, павільён дэманструе агульную, даволі змястоўную і цікавую, карціну Беларусі культурнай.

А вось які запіс быў пакінуты ў кнізе водгукаў павільёна яго мільённым наведвальнікам — спадаром Лі Хэ Мінгам: “Вельмі рады гэтай нечаканай і прыемнай падзеі. Наведанне Беларускага павільёна дарагога каштуе: дызайн — вельмі арыгінальны і прыгожы, стаўленне супрацоўнікаў павільёна — душэўнае і добрае. Спадзяюся, у будучыні ў мяне з’явіцца магчымасць наведаць вашу цудоўную краіну. Упэўнены, выстаўка дасць магчымасць кітайскаму народу больш глыбока даведацца пра культуру і быт беларусаў, і многія накіруюцца ў падарожжа да вас. Так трымаць і надалей, Беларусь!”

Алена САБАЛЕЎСКАЯ

На здымках: запіс у кнізе водгукаў мільённага наведвальніка Нацыянальнага павільёна Беларусі на “ЭКСПА-2010”; галаграфічныя аб’екты — нязменна ў цэнтры ўвагі гасцей павільёна.

Прыпяцкі паром... традыцыйны

17 — 18 верасня ў вёсцы Ляскавічы Петрыкаўскага раёна пройдзе Першы Адкрыты фестываль этнакультурных традыцый “Покліч Палесся”.

Начальнік упраўлення культуры Гомельскага аблвыканкама Дзмітрый Чумакоў паведамляе “К”, што фестываль заснаваны ў адпаведнасці з распараджэннем Прэм’ер-міністра Рэспублікі Беларусь. Арганізатарамі мерапрыемства з’яўляюцца Гомельскі аблвыканкам, Міністэрства культуры краіны, Нацыянальны парк “Прыпяцкі”, Петрыкаўскі райвыканкам.

Свята, як удакладняе Дзмітрый Чумакоў, ладзіцца для падтрымкі і развіцця мясцовай традыцыйнай культуры: фальклору, традыцый і абрадаў, промыслаў і рамёстваў, нацыянальнай кухні. Таму ў фестывальнай праграме — конкурсы рамесніцкіх падвор’яў і нацыянальнай кухні. У іх бяруць удзел прадстаўнікі 11 рэгіёнаў Прыпяцкага басейна: Жыткавіцкага, Петрыкаўскага, Нараўлянскага, Мазырскага, Калінкавіцкага, Лельчыцкага, Ельскага, Хойніцкага раёнаў Гомельшчыны, Столінскага, Пінскага і Лунінецкага раёнаў Брэстчыны.

Фестываль, як сцвярджае Дзмітрый Чумакоў, будзе спрыяць рэалізацыі сацыяльна-культурных праектаў Дзяржпраграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця і комплекснага выкарыстання прыродных рэсурсаў Прыпяцкага Палесся на 2010 — 2015 гады.

Спецыяліст аддзела культуры Петрыкаўскага райвыканкама Жанна Адаменка распавяла “К”, што вёска Ляскавічы стане фестывальнай сталіцай невыпадкова: па-першае, тут размешчана адміністрацыя Нацыянальнага парку “Прыпяцкі”; па-другое, вёска некалькі гадоў таму стала аграгарадком ды займела цудоўны Цэнтр культуры і адпачынку: адной апаратуры і аснашчэння для яго было набыта на 200 мільёнаў рублёў. Менавіта тут пройдуць фотавыстаўка, прэзентацыя кіна- і відэаматэрыялаў, мастацкіх твораў, што адлюстроўваюць прыроду і культуру Палесся.

Галоўная ж фестывальная сцэна размесціцца на плошчы ля ЦКА. А на Прыпяці будзе працаваць “дыскатэчны” паром.

Андрэй СТАРЖЫНСКІ

На здымку: аграгарадок “Ляскавічы” рыхтуецца стаць цэнтрам новага фестывалю.

Пачынаючы з верасня і да канца 2010 года ў краіне ўпершыню за апошнія дзесяцігоддзі праводзіцца агляд лепшых дасягненняў у галіне нацыянальнага выяўленчага мастацтва. Усе мерапрыемствы адбудуцца ў рамках Рэспубліканскай выстаўкі “Зямля пад белымі крыламі”.

“Зямля...” мастацкая: старт — у верасні

Сярод маштабных экспазіцый — выстаўка твораў народных мастакоў Беларусі і лаўрэатаў Дзяржаўнай прэміі краіны, а таксама выстаўка стыпендыятаў Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі (яна распачнецца ў Нацыянальным мастацкім музеі ў верасні). Тут жа пройдуць персанальныя юбілейныя выстаўкі вядомых беларускіх мастакоў Мая Данцыга, Леаніда Дударэнкі, а таксама нашага земляка Барыса Заборава, які жыве і працуе ў Парыжы.

Напрыканцы лістапада ў Рэспубліканскай мастацкай галерэі БСМ (Палац мастацтва) пачне працаваць II Біенале жывапісу, графікі і скульптуры, якая прадставіць лепшыя дасягненні нашых мастакоў за апошнія два гады. Таксама ў галерэі запланаваны выстаўкі “Грунвальд-600”, “Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва” і персанальная выстаўка Аляксандра Кошалева.

Музей сучаснага выяўленчага мастацтва прэзентуе канцэптуальны праект маладых мастакоў (відэа, медыя-арт, арт-аб’екты, інсталяцыі, эксперыментальны жывапіс), а таксама персанальныя выстаўкі Валянціна Губарава, Уладзіміра Цырыковіча, Сяргея Цімохава, экспазіцыю “SOS” мастакоў творчага аб’яднання “Арцель” і групавую выстаўку твораў маладых мастакоў. У лістападзе — снежні тут будуць працаваць экспазіцыя керамікі “Арт-Жыжаль”, фотавыстаўка “Плюс-мінус” Міхаіла Баразны ды Кацярыны Кёнігсберг і “Эмалі” Мікалая Кузьміча.

Музей і мастацкая галерэя Акадэміі мастацтваў у лістападзе прадставяць выстаўку твораў студэнтаў і выкладчыкаў установы, а ў кастрычніку — работы, створаныя студэнтамі мастацкага факультэта і факультэта дызайну і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва пад час летняй практыкі, а таксама экспазіцыю Таццяны Кандраценка. У снежні маладыя мастакі і выпускнікі кафедры ДПМ пакажуць выстаўку “Свет металу”, а Аляксандра Іванова і Алена Ліпінская — графіку і скульптуру. У мастацкай галерэі “Універсітэт культуры” з 19 лістапада запланавана маладзёжная экспазіцыя дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Тут жа, пачынаючы з верасня, пройдуць выстаўка-конкурс “Авантаж” (авангарднай моды), выстаўкі габелена “Джаз” Марыі Барысенка і “Тэхна-арт — знак якасці”.

У галерэйна-выставачным комплексе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі сябрамі Міжнароднай гільдыі жывапісцаў будзе арганізавана Рэспубліканская выстаўка жывапісу, акварэлі, керамікі, скульптуры, фота.

Шырокая і цікавая праграма паказу твораў выяўленчага мастацтва чакае гледача і ва ўсіх рэгіёнах нашай краіны. Пра запланаваныя праекты “К” распавядзе ў бліжэйшы час.

З архіва Радзівілаў

Як паведаміла “К” прэс-служба Міністэрства культуры, 16 жніўня міністр культуры Рэспублікі Беларусь Павел Латушка сустрэўся з прадстаўнікамі роду Радзівілаў: княгіняй Эльжбетай Радзівіл-Тамашэўскай, яе ўнукам Аляксандрам Тамашэўскім і яго жонкай Сільвіяй.

Нашчадкі магнацкага роду прыехалі ў Беларусь з Варшавы з прыватным візітам. У праграму іх прабывання ўключаны паездкі ў Мірскі і Нясвіжскі замкі, а таксама азнаямленне з Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатрам оперы і балета Рэспублікі Беларусь.

У ходзе сустрэчы адбыўся абмен думкамі па пытаннях рэстаўрацыі Нясвіжскага замка. Княгіня Эльжбета Радзівіл-Тамашэўская прадставіла міністру культуры для азнаямлення фотаматэрыялы з сямейнага архіва. Высокая госця паабяцала наведаць Беларусь і ў наступным годзе.

Дыярыуш тысячагоддзя

Пазнаёміцца са старадаўнімі творамі беларускага пісьменства зможа цяпер не толькі айчынны чытач.

Зборнік “Кладезь мудрости и благодати. Фольклор и литературные памятники Беларуси” выйшаў у маскоўскім выдавецтве “Художественная литература”. Гэтае выданне ў серыі “Класіка літаратур СНД” з’явілася пры падтрымцы Міждзяржаўнага Фонду гуманітарнага супрацоўніцтва дзяржаў — удзельніц СНД. Адкрывае кнігу прывітальнае слова міністра культуры Рэспублікі Беларусь Паўла Латушкі пад назвай “Наш абавязак — захоўваць запаветы продкаў”.

Храналогія твораў, прадстаўленых у кнізе, X — XVIII стагоддзе. Некаторыя з іх дагэтуль не чытала рускамоўная аўдыторыя. Тут можна пазнаёміцца з хронікамі і аповесцямі, мемуарамі, дыярыушамі, сатырай, павучэннямі, дыдактычнымі творамі, катэхізісамі, палемічнымі трактатамі, паэзіяй.

Патэнт на брэнд

У Беларускім дзяржаўным ансамблі “Песняры” — падзея не толькі творчай, але і юрыдычнай важнасці.

Летась “песняроўскі” брэнд атрымаў прававую ахову ў Беларусі. І вось — афіцыйнае пацвярджэнне аб такім жа прызнанні ў Расіі, дзе ўвесь час з’яўляюцца ўсё новыя калектывы з такой назвай, прэтэндуючы на званне нашчадкаў творчай спадчыны Уладзіміра Мулявіна. Федэральная служба па інтэлектуальнай уласнасці, патэнтах і гандлёвых знаках зацвердзіла, што менавіта гэты калектыў з’яўляецца ўладальнікам права на гандлёвы знак “Песняры” на тэрыторыі Расіі.

— Гэта сапраўды вялікі, сур’ёзны крок на шляху нацыяналізацыі аднаго з самых значных брэндаў нашай краіны, — пракаменціраваў падзею мастацкі кіраўнік Беларускага дзяржаўнага ансамбля “Песняры” Вячаслаў Шарапаў. — Даказаць гэта было цяжка. Цягам года мы чакалі рашэння, збіралі неабходныя дакументы.

Самае галоўнае, што дае нам гэты дакумент, — адказ на пытанне, што мы часцяком чулі ў Расіі: маўляў, ну якія вы “Песняры”? Так што прызнанне брэнда ў краіне-суседцы для нас — яшчэ і вялікі творчы стымул, магчымасць заняцца выключна творчасцю, а не судовымі разборамі.

Фундамент для музея

Брыгадзір Мікалай Фінскі, галоўны інжынер Васіль Сувораў і архітэктар праекта Віктар Крамарэнка.

Наша газета неаднойчы ўжо пісала пра ўзвядзенне знакавага для кожнага беларуса новага будынка Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Нагадаем, што, згодна з Даручэннем Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі, 1 красавіка бягучага года быў адкрыты спецыяльны дабрачынны рахунак, каб любы ахвотны мог зрабіць унёсак у будоўлю гэтай знакавай для нашай краіны установы.

— Гэта вельмі неабходная акцыя, — лічыць дырэктар Музея Сяргей Азаронак, — бо ў ментальнасці славян заўсёды існавалі паняцці ўзаемавыручкі і ўзаемадапамогі — тое, што ў беларусаў называецца “талака”. І гэты рахунак павінен засведчыць, — і ўжо робіць гэта, — што лепшыя традыцыі нашай культуры і менталітэту захаваліся, гэта — натуральны стан нашай душы. Было б вельмі добра, каб кожны супрацоўнік кожнай арганізацыі — як дзяржаўнай, так і недзяржаўнай формы ўласнасці — змог бы пералічыць пасільную суму на гэты рахунак. Тады музей сапраўды набыў бы статус усенароднай будоўлі...

Дарэчы, супрацоўнікі Музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ўжо пералічылі грошы на дабрачынны рахунак. Цяпер у планах дырэкцыі — правядзенне інфармацыйнай рэкламнай кампаніі па зборы сродкаў на будаўніцтва музея.

— Магчыма, мы будзем супрацоўнічаць у гэтым плане з Саветам ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, з газетамі, натуральна, і з “Культурай”, — распавёў Сяргей Азаронак. — Не выключаю, што зладзім “круглы стол”, прысвечаны тэме будаўніцтва музея. Таксама цяпер думаем над тым, каб нейкім чынам увекавечыць калектывы і прозвішчы тых людзей, хто пералічыў грошы на будаўніцтва музея.

Па словах Сяргея Іванавіча, ён даволі часта наведвае будоўлю і штотыднёва ўдзельнічае ў пасяджэнні штаба пад кіраўніцтвам галоўнага архітэктара горада Мінска Віктара Нікіціна.

— Калектыў музея таксама шчыра ўдзячны міністру культуры Рэспублікі Беларусь Паўлу Латушку, — кажа Сяргей Азаронак, — які пастаянна трымае сітуацыю з ходам будаўнічых работ на кантролі і дапамагае вырашаць праблемныя моманты. Так, напрыклад, калі ў нас узніклі некаторыя пытанні па структуры экспазіцыі, міністрам былі адразу ж дадзены неабходныя даручэнні, якія цяпер выконваюцца.

Карэспандэнт “К” таксама наведаў тое месца, дзе паўстане новы будынак Музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Разам з прарабам будаўнічага ўпраўлення ААТ “Будтрэст № 1” Валерыем Ігнаценкам мы прайшліся па будоўлі, каб убачыць тое, што ўжо зроблена.

— На сённяшні дзень выкапаны катлаван пад будынак, усталяваны адзін вежавы кран, хутка з’явіцца яшчэ адзін, — распавёў Валерый Аляксандравіч. — Зроблена прыкладна 40% фундаментнай пліты, плануем скончыць работы па ёй на пачатку верасня. Да канца года мяркуем усталяваць калоны і перакрыцці цокальнага паверха...

Дарэчы, для Валерыя Ігнаценкі гэта не першы значны ў маштабе краіны сталічны аб’ект. Працуючы спачатку майстрам, а пасля — прарабам БУ-5, Валерый Аляксандравіч паспеў ужо прыняць удзел у пабудове Мінскай ратушы.

— І я, і будаўнікі адчуваем гонар і вялікую адказнасць, што менавіта нам выпала магчымасць прыняць удзел ва ўзвядзенні будынка будучага музея, — кажа Валерый Ігнаценка, — бо для ўсіх нас гэты аб’ект — асаблівы і вельмі важны.

Галоўны архітэктар праекта новага будынка Музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, прафесар Міжнароднай акадэміі архітэктуры, двойчы лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Віктар Крамарэнка таксама ў гэты дзень наведваў месца будоўлі.

— Сапраўды, калі бачыш маштаб цяперашніх работ — гэта ўражвае, — распавёў карэспандэнту “К” Віктар Уладзіміравіч. — Як вядома, я з’яўляюся таксама і аўтарам праекта будынка Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. І тое, што кожны беларус паўдзельнічаў у фінансаванні гэтага знакавага аб’екта культуры, — вельмі сімвалічна. Цяпер бібліятэкай карыстаюцца многія жыхары нашай краіны — “Нацыяналка” аддае людзям усе свае скарбы ведаў.

Гэтак жа, упэўнены Віктар Крамарэнка, станецца і з музеем. Таму тое, што адкрыты дабрачынны рахунак для збору сродкаў, — вельмі важна для кожнага беларуса.

— Музей — гэта Памяць народа, звязаная з трагічнымі старонкамі нашай гісторыі, — кажа Віктар Уладзіміравіч. — І кожны ўнёсак — гэта не толькі ўклад у справу будаўніцтва музея, а таксама і ў справу міру на ўсёй Зямлі, каб будучыя пакаленні памяталі і ніколі не дапусцілі вяртання жахаў вайны.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

На здымках: работы на аб’екце ў самым разгары.
Фота Юрыя ІВАНОВА

Ад рэдакцыі. *Калектыў Рэдакцыйна-выдавецкай установы “Культура і Мастацтва” таксама вырашыў зрабіць свой унёсак — пералічыць на дабрачынны рахунак будоўлі музея сярэдні дзённы заробак кожнага са сваіх супрацоўнікаў. Заклікаем і вас, шаноўныя чытачы, падтрымаць святую справу ўзвядзення новага музея — музея вечнай Памяці герояў!*

Банкаўскія рахункі прыведзены на 1-й паласе гэтага нумара “К”.

III Міжнародная летняя школа мастацтваў прыняла дзяцей з Беларусі і Германіі ў віцебскім Доме-музеі Марка Шагала.

Лэнд-арт у садзе Шагала

Нінбург з’яўляецца горадам-пабрацімам Віцебска, і ўжо трэці раз таленавітая моладзь адтуль з задавальненнем прыязджае ў Беларусь. Удзельнічаюць у гэтым праекце юныя творцы з Цэнтра эстэтычнага выхавання “Маладзік”, Дзіцячай мастацкай школы № 1 Віцебска. Выкладчыкі апошняй установы — куратары Летняй школы.

Задача школы: распавесці пра развіццё лэнд-арту ў свеце, яго сутнасць і новыя падыходы да выяўлення. Пры дапамозе гэтага накірунку выкладчыкі мелі на мэце звярнуць увагу дзяцей да прыроды, паказаць ім прыгожае і незвычайнае ў ёй. Усе разам удзельнікі ездзілі на пленэр у Музей-сядзібу Іллі Рэпіна “Здраўнёва”. Пасля яны некалькі дзён працавалі ў садзе Дома-музея Марка Шагала, ствараючы свае арт-аб’екты. Канкурсанты адлюстроўвалі чатыры стыхіі: зямлю, ваду, агонь і паветра.

Тэма была абрана даволі нечаканая: удзельнікі вывучалі такі накірунак мастацтва, як лэнд-арт, ствараючы пра дапамозе натуральных і штучных матэрыялаў арт-аб’екты. Па словах дырэктара музея Людмілы Хмяльніцкай, 25 дзяцей з Віцебска, Полацка, Мінска, Гомеля і нямецкага Нінбурга працавалі ў школе.

Пасля заканчэння Летняй школы работы яе вучняў могуць пабачыць усе наведвальнікі музея вядомага мастака: многія з твораў будуць захоўвацца ў яго фондах.

Колькі будзе “25+5...”?

Выстаўка “25+5 лепшых эстонскіх кніг” адкрылася днямі ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.

Гэтыя выданні, якія былі створаны ў 2009 годзе, з’яўляюцца прызёрамі Нацыянальнага конкурсу дызайну кнігі. Вернісаж адкрыў дырэктар бібліятэкі Раман Матульскі, удзел у ім прынялі Часовы Паверанны ў справах Эстоніі ў Рэспубліцы Беларусь Хары Лахтэйн, члены Беларускага саюза дызайнераў і прадстаўнікі айчынных выдавецтваў.

Кнігі, якія можна пабачыць на выстаўцы, цягам мінулага года адбіраліся прафесійным журы ў Эстоніі. Усяго ў конкурсе ўдзельнічалі 174 выданні для дарослай аўдыторыі і 35 — для дзіцячай. Вызначальным для перамогі было добрае графічнае вырашэнне, эксперыменты з сучаснымі друкарскімі шрыфтамі. Выбіралі прызёраў не толькі эстонцы, але і прадстаўнікі іншай краіны, каб конкурс быў больш аб’ектыўны.

Выстаўка ў Мінску арганізавана ў межах існуючага Пагаднення аб супрацоўніцтве паміж нацыянальнымі бібліятэкамі Беларусі і Эстоніі, што было падпісана ў лютым 2007 года ў Таліне. Таксама на трэцім паверсе кальцавога калідора НББ можна азнаёміцца з беларускімі прызёрамі Нацыянальнага конкурсу “Мастацтва кнігі-2010”, якія прадстаўлены ў экспазіцыі “Лепшыя кнігі Беларусі”.

“...Асамблеі” ля палаца

З вялікім поспехам Гомельскі палаца-паркавы ансамбль Румянцавых і Паскевічаў прэзентаваў свой праект “Музычныя асамблеі”. Пад час яго гледачы пачулі каля сцен палаца класічную музыку ў выкананні калектываў Гомельскай абласной філармоніі.

На пандусе палаца Румянцавых і Паскевічаў спачатку выступіў Камерны аркестр пад кіраўніцтвам Уладзіміра Авадкі, які выканаў творы С.Манюшкі, П.Чайкоўскага, Й.Гайдна, Э.Грыга ды іншых аўтараў. Пасля адбылося выступленне Камернага хору, што прадставіў кампазіцыі М.Глінкі, М.Агінскага, А.Дворжака, І.Баха і Ш.Гуно, нумары духоўнай і народнай тэматыкі.

Як паведаміла “К” навуковы супрацоўнік мастацкага аддзела ўстановы Людміла Паніна, публіцы вельмі спадабалася класічная музыка. “І надалей мы плануем прапаноўваць людзям менавіта такое мастацтва, каб адпавядаць месцу, дзе праводзяцца канцэрты, гістарычным традыцыям. Цяпер ідуць перамовы з калектывамі Беларусі, краінамі бліжняга і далёкага замежжа наконт арганізацыі чарговых выступленняў”.

Хто на Анненскі кірмаш?

Сёння, 21 жніўня, у Зэльве ладзіцца Анненскі кірмаш.

У XVIII стагоддзі ён прываблівaў да пяці тысяч купцоў Еўропы, з’яўляючыся другім па велічыні кірмашом пасля Лейпцыгскага. Назву мерапрыемства атрымала ў гонар святой Анны і мела гандлёвы абарот да мільёна рублёў.

Фінансавую і кансультатыўную дапамогу ў адраджэнні кірмашу аказаў праект ЕС/ПРААН “Устойлівае развіццё на мясцовым узроўні”. Каардынатар па сувязях з грамадскасцю праекта Вячаслаў Смірноў паведаміў “К”, што згаданы кірмаш — справа доўгатэрміновая, яна будзе садзейнічаць не толькі росту эканамічнай заможнасці рэгіёна, але і ягонай сацыяльна-культурнай актыўнасці. Таму леташняя прапанова аддзела культуры Зэльвенскага райвыканкама па адраджэнні Анненскага кірмашу была аднадушна падтрымана экспертнай камісіяй праекта ЕС/ПРААН, які выдаткаваў на ажыццяўленне запланаванага 18 мільёнаў рублёў.

Прыкладна такая ж сума была сабрана, па словах начальніка аддзела культуры Галіны Раманчук, і жыхарамі Зэльвеншчыны пад час суботнікаў. Дапамаглі, натуральна, кіраўніцтва раёна і ўпраўленне культуры Гродзенскага аблвыканкама.

На сёлетнім кірмашы, ладзіць які мяркуецца раз на тры гады, паўсотні майстроў і мастакоў прапануюць не менш чым сямі тысячам гасцей свае адмысловыя творы. Каля 200 самадзейных артыстаў прымуць удзел у конкурсах, гульнях і канцэртах. Дарэчы, большасць сабраных грошай была выкарыстана на набыццё сцэнічных касцюмаў і матэрыялаў для дзейнасці рамеснікаў.

943-і дзень нараджэння

Сёлета Свята сталіцы, што будзе адзначацца 11 — 12 верасня, якасна адрозніваецца ад леташняга Дня горада. Начальнік аддзела па справах мастацтваў упраўлення культуры Мінгарвыканкама Уладзімір Анціповіч паведамляе “К”, што ў структуры святкавання 943-га дня нараджэння Мінска шмат новаўвядзенняў.

Адбудзецца, да прыкладу, прэзентацыя “сацыяльнага таксі” для людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Гэтая ініцыятыва Мінгарвыканкама, па словах Уладзіміра Анціповіча, аналагаў на постсавецкай прасторы не мае...

Святочныя мерапрыемствы распачнуцца традыцыйнай цырымоніяй уручэння ўзнагарод “Мінчанін года” і канцэртам у Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета. Але ў традыцыйным рэчышчы свята шмат і эксклюзіўных знаходак. Адна з іх — дзея “Мінскі дворык”, што адбудзецца ля Музея гісторыі горада Мінска. Тут мяркуецца прэзентаваць касцюміраванае тэатральнае прадстаўленне, выстаўкі народнага фотаклуба “Мінск” і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Дарэчы, дэвіз свята — “Мой родны Мінск — мой лёс, мая надзея!”. Менавіта так будзе называцца праграма Нацыянальнага канцэртнага аркестра Беларусі пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга, што прагучыць ля Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

А ля Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета 12 верасня адбудзецца канцэрт салістаў беларускай оперы “Гэта — класіка”.

Святочныя мерапрыемствы, натуральна, пройдуць 11 — 12 верасня ва ўсіх раёнах сталіцы.

Я.Р.

Беларускаму кіно неабходна Стаць

Кінагаліна — іміджавы складнік культуры краіны, што пастаянна падмацоўваецца эканамічнымі ўліваннямі. Таму і развіццё яго заўжды — пад пільнай увагай Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі. Неаднойчы Кіраўнік дзяржавы звяртаў увагу на развіццё кіно, узнімаў вострыя праблемы, наведваючы аб'екты кінаіндустрыі. Вынікам станавіліся даручэнні Прэзідэнта. Тэрмін выканання многіх з іх завяршаецца бліжэйшым часам, а выніковасць падлягае ўсебаковаму аналізу.

Яшчэ раз аб праблемах і магчымасцях нацыянальнага кінамастацтва

Кіно беларусы любяць і глядзяць шмат: ад "сіткамаў" па тэлебачанні да 3D-блокбастэраў у адпаведна прыстасаваных кінатэатрах. На жаль, доля айчынных стужак у гэтым аб'ёме — пакуль зусім нязначная. Нашы кінавытворцы, галоўным з якіх застаецца Нацыянальная кінастудыя "Беларусьфільм", пакуль не ў стане выпускаць вялікую колькасць экраннай прадукцыі. А з таго, што выходзіць на экраны… Часам мастацкі і тэхнічны ўзровень асобных айчынных стужак пакідае жадаць лепшага. Тое ж тычыцца і касавых збораў. Словам, тэма папулярнасці беларускага кіно і стаўлення публікі да прадукцыі з маркай "Беларусьфільм" застаецца актуальнай.

Праблем у нашага кіно — процьма: як арганізацыйных, так і выключна творчых. "Культура" неаднойчы закранала шэраг з іх у рознага роду публікацыях. І, разам з тым, паказальна, што ніводная з праблем нашага кіно не з'яўляецца арыгінальнай у сусветным кантэксце або невырашальнай: з падобнымі сутыкаюцца кінематаграфісты ў іншых краінах. Вопыт суседзяў, у тым ліку бліжэйшых, сведчыць: кіно можа быць цікавым і прыбытковым, бо людзі заўсёды з задавальненнем глядзяць сваё, зразумела, калі яно — добрай якасці. Пытанне ў наступным: якім чынам арганізаваць кінапрацэс, як з дапамогай наяўных рэсурсаў дасягнуць лепшых вынікаў? Карэспандэнты нашага выдання вырашылі паразважаць на тэму сучаснага стану нацыянальнага кінамастацтва, а таксама правесці апытанне тых, ад каго гэты стан залежыць, і тых, хто непасрэдна "спажывае" экранную прадукцыю, — гледачоў. У аналітычным матэрыяле, з якога пачынаецца тэматычная падборка, мы спецыяльна не закранералі спецыфічныя тэмы дакументальнага і анімацыйнага кіно. Збольшага, для гэтых відаў мастацтва характэрны тыя самыя праблемы, што тычацца кіно ігравога. Апошняе ж вымагае асаблівай увагі.

Працэс пайшоў?

Яшчэ некалькі гадоў таму знаходзіліся тыя, хто наважваўся ставіць крыж на айчынным кінамастацтве. Ігравых стужак на "Беларусьфільме" выпускалася так мала, што нават паўставала пытанне аб мэтазгоднасці існавання студыі, пабудаванай некалі ў разліку на зусім іншыя аб'ёмы. Сёння кожны наведвальнік будынка па праспекце Незалежнасці трапляе ў вірлівую атмасферу "ачуняўшай" кінафабрыкі: здымкі ідуць бесперапынна, усе тры павільёны заняты дэкарацыямі для сваіх, беларускіх стужак. Між тым, радавацца не выпадае.

Калі гаворка заходзіць пра беларускае кіно, дык часцяком даводзіцца чуць: "Кіно ў нас — ёсць, стужкі выпускаюць рэгулярна, а вось з кінапрацэсам як з цэласнай з'явай — вялікія пытанні. Не існуе добра наладжанай сістэмы, якая ўключае ў сябе ўсе складнікі кінематаграфічнага "ланцужка", таму якасныя, цікавыя гледачу фільмы з'яўляюцца час ад часу". Тыя, хто прытрымліваецца падобнага меркавання, маюць рацыю: часцяком тое добрае, што ўдаецца ствараць беларускім кінавытворцам, "губляецца" на шляху да гледача, патэнцыял, у першую чаргу — кадравы, не выкарыстоўваецца на поўную моц, а відавочныя пралікі не ўлічваюцца наступнікамі. Таму наракаць проста на асобныя праблемы не даводзіцца: патрэбен комплексны падыход.

Па прыклады далёка хадзіць не трэба: дастаткова згадаць мастацкія кінастужкі "Беларусьфільма", што выйшлі ў пракат апошнім часам, зробленыя студыяй самастойна, без удзелу іншых арганізацый: "Дняпроўскі рубеж", "Інсайт", "Дасціш фантасціш". Рэклама і ўвага да іх з боку прэсы былі адпаведныя сціпламу памеру рэкламнага бюджэту, кінапаказы арганізавалі ва ўсіх рэгіёнах краіны, на нацыянальных тэлеканалах, аднак ні прыбытку, ні пераважна станоўчых водгукаў з боку гледачоў студыя і аўтары не атрымалі. Мастацкі ўзровень гэтых карцін далёка не аднолькавы, аднак вынік адзін і той жа: глядач стужкі практычна "не заўважыў", а калі "заўважыў", дык вельмі хутка пра іх забыў. Між тым, фільмы здымалі, у іх былі задзейнічаны таленавітыя, не выпадковыя ў прафесіі людзі, а на вытворчасць затрацілі немалыя дзяржаўныя грошы.

Зразумела, акупіць стужку коштам у некалькі мільярдаў у нашых умовах практычна немагчыма: паўтары сотні кінатэатраў не ў стане прынесці значны прыбытак — нават пры ўмове адначасовага паказу карціны ў іх, — а грошы за дэманстрацыю на айчынных тэлеканалах кінастудыя атрымлівае невялікія (каля пятнаццаці тысяч рублёў за хвіліну, што амаль у тысячу разоў менш, чым на расійскіх тэлеканалах). У выніку рэнтабельнасць беларускіх кінастужак складае дзесятыя долі працэнта.

Павысіць эканамічную эфектыўнасць Нацыянальнай кінастудыі дапамагаюць сумесныя праекты, пераважна — з замежнымі кампаніямі. Шматсе-

Якія фільмы айчыннай вытворчасці глядзяць мінчане, стужкі якіх жанраў хацелася б ім бачыць на экранах кінатэатраў і як узняць прэстыж нашага кінематографа — з гэтымі пытаннямі выйшлі карэспандэнты "К" на вуліцы беларускай сталіцы.

Наша кіно: прэстыж — гэта...

Усяго намі было апытана пяцьдзесят чалавек ва ўзросце ад 20 да 70 гадоў. Прычым прадстаўнікі больш сталага пакалення прызнаваліся, што даўно, з розных прычын, не наведвалі кінатэатр, таму прыгадвалі, звычайна, "Белыя Росы" і "Прыгоды Бураціна" — карціны, створаныя яшчэ за савецкім часам. Некаторыя таксама ўспаміналі "Анастасію Слуцкую" і "У жніўні 44-га", ды і то таму, што змаглі пабачыць гэтыя стужкі па тэлебачанні.

Апытаныя маладзейшага веку аказаліся куды больш абазнанымі ў дасягненнях айчыннага кінематографа: акрамя ўжо згаданых карцін, былі названы таксама "Франц і Паліна", "Дняпроўскі рубеж", "Дасціш фантасціш", "Інсайт"... У лічбах на першым месцы па згадках — "У жніўні 44-га" (17 рэспандэнтаў). Вынік — заканамерны, калі ўлічыць, што фільм з ахвотай дэманструюць як айчынныя, так і расійскія каналы, асабліва — у святочныя дні, калі ўшаноўваем Подзвіг салдат Вялікай Айчыннай вайны. На другім месцы — "Белыя Росы" (14 апытаных), на трэцім — "Прыгоды Бураціна" (13 чалавек).

Аднак трэба адзначыць, што прыкладна 10 рэспандэнтаў не змаглі назваць ніводнага фільма айчыннай вытворчасці. Хаця тыя ж "Белыя Росы" або "У жніўні 44-га" глядзелі, падаецца, усе… Магчыма, людзі проста не ведалі, што гэтыя цудоўныя фільмы створаны айчыннымі рэжысёрамі…

Што да другога пытання (Якіх тэм, сюжэтаў, жанраў не стае беларускаму кінематографу?), дык, напрыклад, 70-гадовай Еўдакіі Фёдараўне хацелася б больш бачыць фільмаў пра ўзаемаадносіны паміж людзьмі, стужкі, якія арыентавалі б маладое пакаленне, як дзейнічаць у розных жыццёвых сітуацыях. З гэтай думкай былі згодны, дарэчы, і людзі сярэдняга ўзросту, і маладыя. Так, 39-гадовы Віталь рэзюмаваў: "Баевікоў і ўсякіх "стралялак" цяпер зашмат. Хацелася б пабачыць сучасны фільм, які прымусіць задумацца пасля прагляду".

Цікавы факт: пра засілле баевікоў казалі не толькі людзі старэйшага пакалення, але і моладзь. "Хацелася б больш маладзёжных і сучасных сюжэтаў, — кажа 21-гадовая Настасся, — маладзёжных серыялаў, кшталту расійскіх "Студэнтаў".

Даволі значная частка рэспандэнтаў шкадавала аб нястачы фільмаў на гістарычную тэматыку, асабліва — звязаную з Сярэднявеччам. Таму, падаецца, поспех "Анастасіі Слуцкай" — не выпадковы, а цалкам заканамерны: глядач марыць аб добрым гістарычным кіно. І тут з экранізацыяй раманаў таго ж Уладзіміра Караткевіча ды іншых пісьменнікаў, пра што таксама згадвалі некаторыя з апытаных, у будучых беларускіх рэжысёраў і сцэнарыстаў сапраўды, як бачна, добрыя перспектывы.

Не надта здзівіла і арыентацыя моладзі на расійскі кінематограф:: фільмы краіны-суседкі прадстаўлены як у беларускім кінапракаце, так і на тэлебачанні вельмі шырока. Таму маладыя людзі казалі пра ўзровень беларускага кінематографа, параўноўваючы яго з расійскім: "У Расіі навучыліся здымаць, — кажа 26-гадовы Ігар, — і цяпер у яе нават заходнія кінакампаніі нешта пераймаюць. Нам бы ў Беларусі дасягнуць падобнага ўзроўню — вось, як мне падаецца, рэальная задача айчыннага кіно на сёння".

І апошняе наша пытанне датычылася шляхоў працы на прэстыж беларускага кінематографа для шырокай аўдыторыі. Прапаноўваліся розныя варыянты: паказваць на тэлебачанні 75 працэнтаў беларускіх фільмаў, як і ў радыёэфіры, пераймаць ад іншых краін ужо "раскручаныя" ідэі і здымаць падобнае сваё, больш увагі надаваць гістарычнаму і прыгодніцкаму жанрам, наладзіць вытворчасць дзіцячага кіно, якога так не стае на экране, і займець такім чынам сваю нішу ў сусветным кінематографе...

Але большасць рэспандэнтаў сышлася на думцы, што неабходна даваць магчымасць эксперыментаваць маладым, бо толькі яны могуць выказаць арыгінальнае і адметнае бачанне навакольнага свету ў беларускім кінематографе.

"Трэба заахвочваць рэжысёраў, сцэнарыстаў, аператараў праз пошук паступова выяўляць сваё, асабістае, у здымачным працэсе, — кажа 27-гадовая Таццяна. — Толькі так, на маю думку, мы зможам прыўнесці штосьці адметнае ў сусветнае кінамастацтва, не капіруючы тое, што ўжо было створана ў Расіі і на Захадзе".

Юрый ЦВЯТКОЎ, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, кінарэжысёр:

"Знайсці свайго Гамлета"

— Думаю, маю права меркаваць пра тое, якім павінна быць наша нацыянальнае кіно. З'яўляюся лаўрэатам Дзяржпрэміі Беларусі, заслужаным дзеячам мастацтваў краіны. У ігравым кінематографе, у ліку іншых, зняў стужку "Пасля кірмашу" паводле іскрамётнай і геніяльнай купалаўскай "Паўлінкі", у дакументальным — блок фільмаў пра знакамітых беларусаў, што сваёй творчасцю і грамадзянскай пазіцыяй наўпрост паўплывалі на славу і гонар Бацькаўшчыны. Сярод іх — Багдановіч, Караткевіч, Лужанін… Днямі здаў дакументальную стужку пра Канстанціна Астрожскага і Сафію Слуцкую…

Мы цяпер пачалі гаварыць пра стварэнне беларускага нацыянальнага кіно. Не мной сказана, што апірышчам і непахіснасцю самасвядомасці, нацыянальнага самаспазнання з'яўляецца гісторыя. Яна і павінна стаць грунтам для стварэння сапраўдных узораў беларускага кіно. Мы павінны знайсці свайго Гамлета, свайго героя. Тым больш, што на выбітных асоб дэфіцыту ў нас не было. І не варта тут забывацца на тое, што імкненне да Подзвігу бывае не менш каштоўным за сам Подзвіг… І нават фільм, скажам, пра геніяльнага рускага Пушкіна нам трэба здымаць з беларускага пункта гледжання, бо ледзь не траціну жыцця паэт быў знітаваны з нашай зямлёй. Словам, мы не маем права займацца кінаінтэрпрэтацыяй чужой гісторыі і не нашай літаратурнай класікі. Беларускаму грамадству патрэбна яднанне, і кіно тут павінна стаць адным з памочнікаў.

Наталля СЦЯЖКО, галоўны рэдактар Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм":

"Як жа развіваецца кінематограф?"

— Праблемы беларускага нацыянальнага кіно? Не бачу ніякіх праблем. Хто так ставіць пытанне, той вельмі далёкі ад кіно. Безумоўна, недапрацовак хапае ў любой сферы дзейнасці: ад аховы здароўя да камунальных паслуг. Але калі казаць пра развіццё нашага кіно, дык, паўтаруся, праблем тут няма, адно толькі пазітыўныя рэчы. Беларускі кінематограф не стагніруе, а нармальна развіваецца.

Людміла ПЕРАГУДАВА, кінакрытык, дацэнт Інстытута журналістыкі БДУ:

"Аднавіць асяродак"

— Асноўная праблема беларускага кіно была агучана ў эфіры канала АНТ незалежнымі экспертамі — гледачамі. У выніку галасавання пад час ток-шоу "Выбар" аказалася: 29% гледачоў прадукцыя Нацыянальнай кінастудыі падабаецца, 71% — не. Годам раней расклад быў прыкладна такі ж: 68% гледачоў не цікавіліся беларускім кіно і прыкладна столькі ж лічылі, што прычына няўдач у індустрыі — адсутнасць свежых ідэй. Таму галоўная праблема — страчаны давер гледача. Беларускаму кіно неабходна вярнуць творчы аўтарытэт. Нездарма азначэнне "мастацкае кіно", што тычыцца прадукцыі нашай студыі, практычна страціла былы сэнс і ўсё часцей замяняецца няроўназначным сінонімам "ігравое кіно".

Экранная мода — зменлівая. Але ніколі не праходзіць мода на Мастацтва, на кіно прафесійнае, нацыянальнае па сваёй сутнасці. У перыяд рэканструкцыі сферы кіно на першы план выходзіць яго мастацкі ўзровень, тое, дзеля чаго і павінна працаваць кінаіндустрыя. Праблемай з'яўляецца і маленькая колькасць арыгінальных, высокамастацкіх сцэнарыяў, арыентаваных на поспех: глядацкі, фестывальны або камерцыйны. Патрэбны неангажыраваны механізм адбору жыццяздольнага, перспектыўнага матэрыялу. Не існуе дакладнай творчай канцэпцыі, магістральнай лініі і мастацкіх прыярытэтаў — сцэнарны партфель студыі запаўняецца стыхійна і, часцяком, суб'ектыўна.

Якаснага росту патрабуе ўзровень рэжысуры. Змена пакаленняў — працэс балючы. Трэба шукаць таленавітых людзей і даваць ім магчымасць рэалізоўваць іхнія планы. Неабходна з пітэтам ставіцца да творчай спадчыны Нацыянальнай студыі і ў поўнай меры карыстацца патэнцыялам і багатым вопытам кінематаграфістаў старэйшага пакалення. Яшчэ адна праблема — адсутнасць на студыі мастацкага кіраўніка. Нават дэбютанты здымаюць сваё першае кіно практычна наўдачу. Неапраўданая рызыка, надта затратная!

Аднаўленне страчанага культурнага кінематаграфічнага асяродка — справа не аднаго года. І пэўныя зрухі ўжо ёсць: маю на ўвазе вяртанне на студыю вучняў Віктара Турава — Аляксандра Колбышава і Андрэя Кудзіненкі. Відавочна, капрадукцыя з кінематаграфічна моцнымі краінамі і асобнымі майстрамі — вельмі дзейсная стратэгія развіцця. Выйсці на якасна новы ўзровень беларускаму кіно можа дапамагчы сучасны канцэптуальны падыход: стварэнне інстытута прадзюсерства — адзін з прадуктыўных шляхоў.

вярнуць творчы аўтарытэт канкурэнтаздольным

Нездарма яны шырока выкарыстоўваюць тэхнічныя і кадравыя магчымасці нашага кіно: за апошнія два з паловай гады толькі расійскімі кінакампаніямі на базе "Беларусьфільма" створана больш за 50 стужак, у тым ліку такія, як "Стомленыя сонцам-2", "Каменская-5", "Ярмолавы", "Знахар", "Вольф Месінг" ды шэраг іншых гучных праектаў, якія знаходзяць вялікі попыт, у тым ліку, у нашага гледача.

З уласна беларускага найбольшы аптымізм выклікаюць работы асобных дакументалістаў і аніматараў, але спецыфіка іх працы ў тым, што маштабы вытворчасці дакументальных і анімацыйных стужак у разы саступаюць адпаведным маштабам ігравога кіно. Таму для масавай публікі іх высілкі часцей за ўсё застаюцца незаўважанымі, нягледзячы на вялікую павагу ў свеце.

Такім чынам, атрымліваецца крыху дзіўная карціна: пад кіраўніцтвам замежных прадзюсераў беларусы працуюць вельмі добра, а калі задзейнічаны ў здымках "на сябе", як у выніку вышэйзгаданых прэм'ер Нацыянальнай студыі, дык адразу ж губляюць творчы імпэт. Зразумела, тое тычыцца далёка не ўсіх: аўтарскі падыход да працы Аляксандра Колбышава і Андрэя Кудзіненкі аказаўся збольшага апраўданы, але прэм'еры іхніх стужак яшчэ наперадзе, таму даводзіцца весці размову пра тое, што ёсць на дадзены момант.

Кінапрагматыка

Дык чаму ж беларускія стужкі пакуль неканкурэнтаздольныя нават на сваім рынку? Доўгі час гэта можна было растлумачыць нізкім узроўнем тэхнічнага забеспячэння. Сапраўды, маштабнае пераўзбраенне на "Беларусьфільме" пачалося некалькі гадоў таму. На дадзены момант на Нацыянальнай студыі можна выконваць усе віды неабходных работ, што патрабуюцца для паўнавартаснай кінавытворчасці. Узвядзенне новага будынка сапраўды прыпынілася, але дзеючыя павільёны дазваляюць здымаць якасна. Разлічаныя на працу са звыклай кінаплёнкай і новыя лічбавыя камеры, лабараторыі апрацоўкі, мантажныя, тон-студыя таксама не надта адрозніваюцца ад аналагічнага абсталявання на самых знакамітых кінакомплексах свету.

Дык, можа, справа — у спецыялістах, якія гэтае абсталяванне абслугоўваюць? Але, як мы ведаем, колькасць ахвотных скарыстацца паслугамі студыі не дазваляе наракаць на яе працу. Больш за тое: на "Беларусьфільме" ёсць прафесіяналы сусветнага ўзроўню. Яркі факт: замежны спецыяліст па аб'ёмным гуку, які нядаўна знаходзіўся на студыі, ацаніў работу аднаго з нашых гукарэжысёраў як адну з лепшых у сваёй галіне за апошні час. Зразумела, такіх прафесіяналаў няшмат: каб падрыхтаваць кожнага з іх, патрабуюцца гады. Спецыфіка кінематаграфічнай вытворчасці вымагае вузкіх спецыялістаў, навучыць якіх канвеерным метадам практычна немагчыма. Кіраўніцтва студыі бачыць выйсце ў запрашэнні замежных прафесіяналаў, побач з якімі нашы работнікі могуць значна павысіць узровень майстэрства. А ўтрымаць гэтых профі на студыі можна толькі цікавай працай і высокай заработнай платай. Апошняя цалкам залежыць ад эканамічных фактараў, у тым ліку ад эфектыўнага кіравання і ўзроўню інвестыцый.

У свой час "Беларусьфільм", дзякуючы Кіраўніку дзяржавы, не прыватызавалі, што, безумоўна, прывяло б студыю ў непрацоўны стан, як тое адбылося са шматлікімі аналагічнымі прадпрыемствамі ў сумежных з Беларуссю краінах. Аднак відавочна, што сама сістэма кіравання на студыі засталася амаль нязменнай з часоў планавай эканомікі. Новыя рынкавыя ўмовы дыктуюць іншыя падыходы: больш мабільная структура творчых падраздзяленняў, якія падпарадкоўваюцца агульнаму цэнтру, будзе куды больш эфектыўнай. Запатрабаванай можа стацца і праверараная з часоў Дзяржкіно сістэма. У адпаведнасці з ёй вытворчасць і пракат былі б аб'яднаны ў адзіную сістэму, бо дасюль беларускія вытворцы і пракатчыкі працуюць паасобку, а іх інтарэсы часцяком не супадаюць. Таму сітуацыя, калі рэжысёр не ведае, чым цікавіцца яго патэнцыйны глядач, у нашым кіно не рэдкасць.

Нарэшце, у беларускае кіно павінны прыходзіць прыватныя інвестыцыі — зразумела, пад пільным дзяржаўным кантролем. Але, каб бізнес быў зацікаўлены ва ўкладанні грошай у мастацтва, трэба стварыць адпаведныя ўмовы, у першую чаргу — юрыдычныя. Відавочна, што падатковыя льготы на кінавытворчасць маглі б дапамагаць "Беларусьфільму" лягчэй знаходзіць запатрабаваныя сродкі.

Юрыдычных цяжкасцей хапае і ў іншых кірунках: ад праблем з высакаякасным літаратурным матэрыялам для сцэнарыяў — з-за абмежавання памераў выплат аўтарскіх узнагароджанняў — да фарміравання коштаў на работы і паслугі. Для заказчыкаў — рэзідэнтаў Рэспублікі Беларусь яны ніжэйшыя, таму замежныя кампаніі маюць добрую магчымасць зарабіць "на паветры", працуючы з "Беларусьфільмам" праз айчынную кампанію. Спецыфіка кінавытворчасці не заўжды стасуецца з нормамі працоўнага заканадаўства (Гаворка — пра абмежаванні працоўнага часу: скажам, на прыватных праектах здымачная змена летам доўжыцца 12 — 14 гадзін, таму спецыялісты студыі і імкнуцца працаваць "на баку", зарабляючы такім чынам большыя грошы.).

Спецыялісты ўпэўнены: калі правільна размеркаваць высілкі і стварыць адпаведную прававую базу, можна не толькі здымаць стужкі пад "чужым кіраўніцтвам" і на патрэбу замежнага рынку, але і самім збіраць поўныя залы. Зразумела, цалкам выціснуць галівудскую прадукцыю з кінатэатраў і тэлеэкранаў сёння не пад сілу ніводнай краіне свету. Зрэшты, задача толькі абараніць свой рынак будзе недастатковай: у сучасных умовах трэба займаць сваё месца ў сусветнай кінаіндустрыі. Тады і ўзровень айчынных стужак узнімецца да сусветнага. Прыкладам можа стаць Румынія, якая спачатку здолела зацікавіць умовамі здымак найбуйнейшыя кінакампаніі свету, а потым стварыла сенсацыю стужкамі сваіх маладых рэжысёраў на самых прэстыжных кінафестывалях. Што да міжнароднай кааперацыі, то тут патэнцыял у выглядзе прафесійных кадраў і геаграфічнага становішча ў "Беларусьфільма" — вялікі. Нездарма прапаноў ад замежных прадзюсераў у нашых кінематаграфістаў з кожным годам становіцца ўсё болей.

Урок на будучыню

Кадры, якія, як вядома, вырашаюць у кіно амаль усё, — месца для нашай індустрыі пакуль вельмі балючае. Незалежная Беларусь паступова будуе сваю сістэму падрыхтоўкі кадраў для кінавідэасферы, сутыкаючыся пры гэтым з заканамернымі цяжкасцямі: недахопам педагагічных кадраў, абсталявання, а галоўнае — адпаведнага вопыту. У маі гэтага года ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў быў нарэшце адкрыты Факультэт экранных мастацтваў, у склад якога ўвайшлі чатыры профільныя кафедры. Цягам уступнай кампаніі на яго паступілі 85 чалавек (36 — на бюджэтную і 49 — на платную формы навучання). Разам з залічанымі, сёння тут — амаль тры з паловай сотні студэнтаў на дзённай і завочнай форме навучання будучых рэжысёраў, прадзюсераў, аператараў, кіназнаўцаў.

І попыт на атрыманне такіх прафесій — ёсць. Калі агульны конкурс па Акадэміі мастацтваў склаў 4,4 чалавека на месца, дык сярэдняя колькасць па ФЭМу — 3,9. На некаторыя ж спецыяльнасці (скажам, "Рэжысура кіно і тэлебачання" па спецыялізацыі "Мастацкі фільм") даходзіў да 4,8 чалавека на месца. І ўсё ж… Пакуль магчымасці новага падраздзялення Акадэміі выглядаюць вельмі сціплымі, улічваючы абавязковае насычэнне вучэбнага працэсу сучаснай матэрыяльна-тэхнічнай базай. Вядома, яе ўмацаванне патрабуе значных і мэтанакіраваных фінансавых укладанняў. І да гэтай тэмы "К" абавязкова вернецца ў бліжэйшы час.

Сёння беларусы могуць спасцігаць кінамастацкую прафесію дома, а не ехаць за мяжу, дзе многія з іх і застаюцца. Жаданне "вучыцца кіно", паўтаруся, у нашых землякоў ёсць: нашы грамадзяне з'яўляюцца студэнтамі самых прэстыжных кінашкол свету, у тым ліку парыжскай La Femis, пражскай FAMU, Кінашколы ў Лодзі. Толькі на розныя факультэта ВГИКа ў гэтым годзе паступіла 9 беларусаў. Прычым, як зазначылі ў прыёмнай камісіі апошняй ВНУ, гэта найбольшы паказчык сярод краін былога Савецкага Саюза.

Адкрыццё адмысловага факультэта дадае каліва пэўнага аптымізму, бо беларускай кінематаграфічнай культуры відавочна не стае сістэмнага характару, майстроў ва ўсіх накірунках кінамастацтва, якія будуць перадаваць свае веды наступнаму пакаленню. Праблема з-за "выпаўшага пакалення" дзевяностых, якое амаль цалкам сышло ў іншыя сферы дзейнасці, яшчэ доўга будзе аказваць негатыўны ўплыў на сферу кіно на Беларусі. Творчыя хібы, што навідавоку ў кожнай беларускай стужцы, выкліканы, у тым ліку, і гэтымі абставінамі. Таму беларуская кінадумка, сістэма мастацкіх і ідэалагічных каардынат у нашым кінамастацтве пакуль знаходзяцца на стадыі фарміравання. Відавочна, спасылкі на міфалогію класічнага савецкага кіно, што мы назіралі апошнім часам, сябе больш не спраўджваюць. Новаму пакаленню грамадзян незалежнай Беларусі патрэбна новае кіно. Магчымасці для яго стварэння ў нас ёсць, трэба толькі правільна імі карыстацца.

Антон СІДАРЭНКА

Аляксандр КАНАНОВІЧ, кінарэжысёр:

"Прабел? Але і шанц…"

— Схема вытворчасці мастацкага кіно ў Беларусі, на маю думку, усё ж мае шмат пераваг. Я так разумею, што зараз мы з вамі гаворым пра мадэль кінавытворчасці, якая існуе на "Беларусьфільме". Пад час працы над маёй апошняй карцінай "Дасціш фантасціш" мне даводзілася пераадольваць пэўныя перашкоды. Так, пытанні вытворчага характару ўзнікалі, ды ўсё ж гэта былі не тыя праблемы, якія немагчыма вырашыць. З іншага боку, я як рэжысёр адчуваў сябе вельмі камфортна ў творчым плане: фактычна ніхто не ўмешваўся ў маю працу. Нават мастацкі савет рабіў заўвагі ветліва і карэктна, таму ў мяне няма нараканняў і на гэтае, унікальнае для іншых студый, звяно кіналанцужка. Урэшце, мастацкі савет існуе якраз для таго, каб зрабіць кіно лепшым.

Вялікім плюсам кінастудыі я лічу адсутнасць прадзюсерскага дыктату, які існуе на іншых базах, напрыклад, у Расіі, Украіне і г.д. Гэты, здавалася б, прабел, дае шанц для з'яўлення беларускага аўтарскага кіно. Безумоўна, пэўныя жанры без вялікіх фінансавых уліванняў пакуль застануцца для нас недасягальнымі — той жа блокбастэр, — але ж фільмы камернага характару, інтэлектуальнае кіно не патрабуе вялікіх сродкаў. Таму, я лічу, пакуль на студыі змяняць нічога не трэба: работы маіх калег толькі пацвярджаюць думку, што яшчэ некалькі крокаў, некалькі намаганняў — і мы ўбачым сваё добрае аўтарскае кіно.

Аляксандр КОЛБЫШАЎ, кінарэжысёр:

"Куды ж без асобы?"

— Праблем у беларускім кінематографе нямала, і, што непакоіць, колькасць іх пакуль не змяншаецца. Для мяне ж галоўным сённяшнім недахопам застаецца адсутнасць асобы ў кіно. Так, не стае добрага сцэнарнага матэрыялу, так, не хапае матэрыяльных сродкаў, але сапраўдны рэжысёр заўжды знойдзе адэкватнае мастацкае рашэнне ўсіх гэтых пытанняў. А асобы з неба не падаюць. І для таго, каб іх адшукаць, адбіраць, вучыць, выхоўваць, трэба найперш любіць кіно і людзей, якія ў ім працуюць.

Віктар Тураў, Міхаіл Пташук, Ігар Дабралюбаў былі складанымі людзьмі. Але гэта былі Асобы, яны ўмелі паважаць сябе і сваю творчасць. Таму і кіно было нацыянальным, прымушала гледача задумацца над самаідэнтыфікацыяй.

Антаніна КАРПІЛАВА, кандыдат мастацтвазнаўства, загадчык аддзела экранных мастацтваў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі:

"Калі "прарастае" якасць?.."

— У першую чаргу не задавальняе мастацкі ўзровень сучасных фільмаў. Пад гэтым я разумею адсутнасць або няпэўнасць ідэі, канцэпцыі, якая залежыць ад аўтараў карціны. Далей, мастацкасць патрэбна і візуальнай, і гукавой, і акцёрскай часткам стужкі. Калі на экране — нецікавая, аднастайная гераіня апынаецца ў банальных сітуацыях або персанажы "выдаюць" пошлыя жарты на ўзроўні самадзейнага "капусніку", гэта проста безгустоўнасць. Між тым, мастацкія якасці кінафільмаў так ці інакш прывабяць і масавую, і прафесійную аўдыторыю.

Спосабы вырашэння праблем старыя, як свет. Патрэбны таленавітыя людзі, якія прапануюць цікавыя праекты, добрыя сцэнарыі, сваё бачанне рэчаіснасці. Да таго ж, неабходна валоданне прафесіяй, рамяством, чаго цяпер востра не стае нашаму экрану. Чаму мы, беларускія кіназнаўцы, так цёпла прынялі фільм Аляксандра Колбышава "Ваўкі"? Ды таму, што ён зроблены прафесійнай і неабыякавай рукой. Адзначу таксама і складанае пытанне сучаснага культурнага кантэксту: менавіта ў ім нараджаецца і "прарастае" творчая асоба. Вось гэты момант, на мой погляд, — найбольш важны.

Сяргей КАЦЬЕР, кінакрытык, журналіст:

"Найперш — пра сваё!"

— Самай відавочнай з'яўляецца праблема персанальнай адказнасці за вынікі працы. Прадзюсера, які нясе асабістую адказнасць за мастацкую якасць і эканамічную эфектыўнасць кінапраектаў, у нас дасюль няма. Другой па значнасці лічу праблему недахопу якасных сцэнарыяў. Аўтары не апісваюць рэальнае жыццё, і пакуль гэтае становішча не зменіцца, беларускі глядач будзе аддаваць перавагу галівудскім стужкам, у якіх заўсёды існуюць яркія персанажы і вострыя канфлікты.

Што да дэфіцыту творчых кадраў, то, на мой погляд, з патэнцыйнымі аўтарамі павінна весціся паўнавартасная "селекцыйная" праца. Разумець гледача можа чалавек толькі з вельмі развітай інтуіцыяй, якая, напрыклад, была ў Міхаіла Пташука. Вось менавіта такіх рэжысёраў і трэба "гадаваць" на студыі.

І апошняе, але, бадай, галоўнае. Нашым сродкам масавай інфармацыі, найперш — тэлебачанню, трэба як мага больш прапагандаваць айчыннае кіно, надаваць сваёй працы ў гэтым накірунку сістэмны характар, а не ствараць, фактычна, рэкламу замежным кінавытворцам, што мы можам назіраць у пэўных тэлепраграмах на тэму кіно.

За апошні год інтэнсіўнасць падзей у тым сегменце айчыннай культуры, які многія называюць contemporary art, пабіла ўсе рэкорды ў не вельмі доўгай гісторыі з'явы. Беларусь заявіла пра ўдзел у Венецыянскай біенале, у Мінску прайшлі некалькі буйных фестываляў (прычым — на вельмі паважных пляцоўках), нарэшце адкрылася спецыялізаваная галерэя... Яшчэ адна падзея засталася пакуль незаўважанай у шырокіх колах: беларускім сучасным мастацтвам зацікавіўся куратар міжнароднага калібру.

Вердыкт куратара,

або Як пазбыцца комплексу "непрызнанага генія"?

Дырэктар Цэнтра сучаснага мастацтва ў Вільнюсе Кейстутас Куізінас прыехаў у Мінск зусім не дзеля турыстычнай цікаўнасці. З дапамогай беларускай калегі, дырэктара галерэі Леаніда Шчамялёва Таццяны Бембель, ён рыхтуе выстаўку пад назвай "Дзверы адчыняюцца", якая адкрыецца ў Вільнюсе 19 лістапада.

— Погляд паважнага замежнага куратара на наш айчынны арт-працэс для нас вельмі важны, — адзначыла Таццяна Бембель. — Ён дазволіць убачыць тыя нюансы, якія можа ўгледзець толькі чалавек незаангажыраваны.

Гэтая "ацэнка збоку" цікавая для суайчыннікаў яшчэ і таму, што стаўленне да contemporary art у беларускім культурным асяродку дагэтуль цалкам не сфарміравалася, і сам феномен спараджае не ўзважаны аналіз, а палярныя эмацыйныя выказванні: ад натхнёнага пляскання ў ладкі да злоснага фыркання. Яшчэ адна прыкрая з'ява грамадскай свядомасці — "комплекс непаўнавартаснасці": маўляў, усё беларускае — другаснае ды "непрафесійнае".

— Мы мелі такія самыя праблемы, — кажа Кейстутас Куізінас, — і таму спецыяльна запрашалі замежных куратараў, каб тыя маглі прадэманстраваць свой погляд на літоўскае мастацтва, рыхтавалі яго рэпрэзентатыўныя выстаўкі. Краіна ў нас маленькая, усе ўсіх ведаюць, і погляд звонку вельмі патрэбны.

Зрэшты, ад агульнага і вычарпальнага "дыягназу" беларускага арт-працэсу куратар катэгарычна адмовіўся, адзначыўшы толькі, што ён вельмі зацікавіўся нашым мастацтвам і будзе рады прадставіць яго на сваіх экспазіцыйных плошчах, дзе лічаць за гонар выстаўляцца сапраўдныя карыфеі contemporary art з усяго свету.

У той самы час, апошняя "панарамная" выстаўка беларускага мастацтва ў найбліжэйшай ад нас замежнай сталіцы адбылася болей за дваццаць гадоў таму...

— На жаль, мы вельмі мала ведаем нават пра паўсядзённае, побытавае жыццё нашых бліжэйшых суседзяў, — кажа Кейстутас Куізінас. — Тым болей, пра жыццё мастацкае. Час хаця б трохі прачыніць гэтыя "дзверы" даўно прыспеў.

Чалавечыя зносіны як мастацкі фактар

На думку літоўскага куратара, многія беларускія мастакі пакуль занадта "сціплыя": яны не ўмеюць маляўніча і абгрунтавана прадстаўляць свае арт-практыкі і той ментальны кантэкст, які іх атачае. Прычым гэта адбываецца зусім не таму, што нашым аўтарам няма чаго сказаць.

— У вас яшчэ пануе гэткае рамантычнае ўяўленне пра творцаў, многія з іх лічаць сябе свайго кшталту "непрызнанымі геніямі", якіх хтосьці павінен знайсці і "раскруціць", — кажа ён. — Хтосьці — але толькі не яны самі! Калі на пачатку 90-х мы адчулі цікавасць да літоўскага мастацтва з боку замежнікаў, я вадзіў куратараў па майстэрнях нашых аўтараў і прасіў тых распавесці пра сваю творчасць. Тады ім было складана нават пару слоў звязаць. Але сёння мастакі ўжо навучыліся распавядаць пра сябе — толькі дай ім такую магчымасць... Звыклая справа — персанальны сайт на розных мовах. Бо ад гэтага ў значнай ступені залежыць поспех. Таму, думаю, праблема "сціпласці" вашых творцаў вырашыцца сама сабою...

У рамках выстаўкі "Дзверы адчыняюцца" запланаваны не толькі традыцыйны вернісаж, але таксама "круглыя сталы" і імпрэза, пад час якой кожны з удзельнікаў праекта (плануецца, што агулам іх будзе каля дваццаці) здолее прэзентаваць сваю творчасць.

Нярэдка прэрагатыву вербальнага тлумачэння мастак свядома перадае куратарам. Але, як сведчаць некаторыя нядаўнія выставачныя праекты, гэтая папулярная сёння на Беларусі арт-функцыя па-ранейшаму не набрыняла адэкватным зместам.

— На маю думку, трэба падзяляць куратараў і Куратараў, — кажа Таццяна Бембель. — Першыя ідуць услед за мастаком і выконваюць выключна арганізацыйныя функцыі, гэта абслугоўваючае звяно. Другія — нібы дырыжоры, якія самі не граюць, але адбіраюць і склад аркестра, і партытуры. Яны прымаюць непрарэдны ўдзел у стварэнні новых работ, а не толькі выстаўляюць тое, што ўжо нарадзілася і без іх.

Паняцце "куратарскі дыктат" на Беларусі пакуль не актуальнае. Зрэшты, па словах Кейстутаса Куізінаса, такі падыход да працы страчвае папулярнасць і за мяжой:

— Новая тэндэнцыя куратарскай працы — не дыктаваць аўтару сваю волю, а шукаць магчымасці для плённага супрацоўніцтва. Я ніколі не кажу мастаку: "Ты мусіш!", — але проста выказваю сваё меркаванне. Паміж намі сама сабою распачынаецца дыскусія, і ў яе выніку часта нараджаюцца новыя цікавыя ідэі. Дарэчы, менавіта гэтак адбываецца і мая праца над беларускай выстаўкай, якой я займаюся тут, у Мінску. Простыя чалавечыя зносіны мастака і куратара — важны рухавік нашай агульнай справы.

Уласна, менавіта куратары ў значнай меры фарміруюць "трэнды" сучаснага мастацтва. Крытэрыі ў гэтай сферы заўсёды будуць справай спрэчнай. Бо часам яны падаюцца настолькі ірацыянальнымі і "валюнтарысцкімі", як, скажам, у сферы моды.

— Ніколі не задумваўся над такім параўнаннем, але лічу, што яно не пазбаўлена рацыі, — прызнаўся Кейстутас Куізінас. — Зрэшты, свой уплыў на фарміраванне крытэрыяў робяць мноства фактараў: прэса, мастацтвазнаўцы, інстытуцыі, дылеры, галерэі... Так, спрэчкі на гэты конт будуць узнікаць заўсёды, бо густы розняцца. Але... За многія гады сваёй працы заўважыў такую акалічнасць: калі збіраецца кола кваліфікаваных экспертаў, але таксама "круглыя сталы" і імпрэза, пад час якой кожны з удзельнікаў праекта (плануецца, што агулам іх будзе каля дваццаці) здолее прэзентаваць сваю творчасць.

Нярэдка прэрагатыву вербальнага тлумачэння мастак свядома перадае куратарам. Але, як сведчаць некаторыя нядаўнія выставачныя праекты, гэтая папулярная сёння на Беларусі арт-функцыя па-ранейшаму не набрыняла адэкватным зместам.

— На маю думку, трэба падзяляць куратараў і Куратараў, — кажа Таццяна Бембель. — Першыя ідуць услед за мастаком і выконваюць выключна арганізацыйныя функцыі, гэта абслугоўваючае звяно. Другія — нібы дырыжоры, якія самі не граюць, але адбіраюць і склад аркестра, і партытуры. Яны прымаюць непасрэдны ўдзел у стварэнні новых работ, а не толькі выстаўляюць тое, што ўжо нарадзілася і без іх.

Паняцце "куратарскі дыктат" на Беларусі пакуль не актуальнае. Зрэшты, па словах Кейстутаса Куізінаса, такі падыход да працы страчвае папулярнасць і за мяжой:

— Новая тэндэнцыя куратарскай працы — не дыктаваць аўтару сваю волю, а шукаць магчымасці для плённага супрацоўніцтва. Я ніколі не кажу мастаку: "Ты мусіш!", — але проста выказваю сваё меркаванне. Паміж намі сама сабою распачынаецца дыскусія, і ў яе выніку часта нараджаюцца новыя цікавыя ідэі. Дарэчы, менавіта гэтак адбываецца і мая праца над беларускай выстаўкай, якой я займаюся тут, у Мінску. Простыя чалавечыя зносіны мастака і куратара — важны рухавік нашай агульнай справы.

Уласна, менавіта куратары ў значнай меры фарміруюць "трэнды" сучаснага мастацтва. Крытэрыі ў гэтай сферы заўсёды будуць справай спрэчнай. Бо часам яны падаюцца настолькі ірацыянальнымі і "валюнтарысцкімі", як, скажам, у сферы моды.

— Ніколі не задумваўся над такім параўнаннем, але лічу, што яно не пазбаўлена рацыі, — прызнаўся Кейстутас Куізінас. — Зрэшты, свой уплыў на фарміраванне крытэрыяў робяць мноства фактараў: прэса, мастацтвазнаўцы, інстытуцыі, дылеры, галерэі... Так, спрэчкі на гэты конт будуць узнікаць заўсёды, бо густы розняцца. Але... За многія гады сваёй працы заўважыў такую акалічнасць: калі збіраецца кола кваліфікаваных экспертаў, якім трэба ацаніць тыя або іншыя мастацкія праекты, у 90% выпадкаў іхнія "вердыкты" супадаюць.

— Што мяне больш за ўсё ўразіла ў дзейнасці Цэнтра, якім кіруе Кейстутас, — дык гэта самі прынцыпы яго функцыянавання, — кажа Таццяна Бембель. — Палітыку ўстановы, яе стратэгію вызначае куратарскі савет, які складаецца з шасці персон, а фінансавыя, арганізацыйныя і гаспадарчыя пытанні — гэта ўжо другаснае. У нас жа слова "куратар" нават у штатных раскладах адсутнічае.

Сертыфікат на графітавую пляму

Сцвярджэнне адносна таго, што фінансавым апірышчам для сучаснага мастацтва можа быць рынак, пакуль застаецца амаль бяздоказным у беларускай рэчаіснасці. Зрэшты, абышоўшы тузін-другі галерэй любога еўрапейскага горада, можна лёгка прыйсці да высновы, што амаль усе яны спецыялізуюцца менавіта на традыцыйных відах мастацтва: жывапісе і скульптуры. Яно і зразумела: інсталяцыю на сценку спальні не павесіш.

— Справа ў тым, што калекцыянеры бываюць дзвюх катэгорый, — пярэчыць Кейстутас Куізінас. — Першыя купляюць тое, што ім дасадобы, каб потым размясціць гэтыя работы ў свой інтэр'ер або, скажам, у палісаднік катэджа. А другія ставяцца да справы куды больш прафесійна і кіруюцца не толькі крытэрыем "падабаецца/не падабаецца". Нярэдка яны маюць сваіх дарадцаў з мастацтвазнаўчай адукацыяй, якія адказваюць за фарміраванне іх калекцый.

У такім выпадку інсталяцыі, аб'екты або эксклюзіўныя дыскі з фільмамі чакаюць свайго часу дзесь у прыватных "запасніках", каб потым, пры нагодзе, трапіць у экспазіцыю той або іншай выстаўкі. Побач з імем мастака на шыльдачцы будзе красавацца і імя ўласніка твора. Адным словам — някепскі піар.

— Але для гэтага трэба, каб у людзей бізнесу трохі змянілася свядомасць, каб іхнія культурныя патрэбы эвалюцыянавалі, — працягвае куратар. — У Літве, на шчасце, гэта ўжо адбываецца, хай і не вельмі хуткімі тэмпамі. Прыехаўшы неяк у Люксембург на Міжнародную біенале "Маніфеста", я сустрэў там знаёмага бізнесмена з Літвы. Са здзіўленнем запытаўся: "Слухай, а ты што тут робіш?" І пачуў адказ: "А мне проста цікава!"

У сферы contemporary art калекцыянер плаціць перадусім за саму ідэю, а не за яе матэрыяльнае ўвасабленне, якое можа быць вельмі сціплым або нават наогул адсутнічаць. І, натуральна, — за імя аўтара. Класічны прыклад — "выстаўка пустэчы" Іва Кляйна: "экспанаты" яе разышліся за вельмі прыстойныя грошы, бо кожнаму з няісных твораў спадарожнічаў афіцыйны сертыфікат з аўтографам мэтра. Зрэшты, як выявілася пад час нашай гутаркі, той энцыклапедычны выпадак меў нямала працягаў у сучаснай практыцы.

— У нашым Цэнтры была выстаўка вядомага нямецкага мастака Ульрыха Рукрэма, — распавядае Кейстутас Куізінас. — Ён вымераў сцены экспазіцыйнай залы і зрабіў іх паменшаныя рэплікі ў выглядзе графітавых плям (вядома, па сканчэнні выстаўкі мы мусілі іх зафарбаваць). І калі трапляеш у экспазіцыю, адчуваеш папраўдзе фізіялагічнае ўздзеянне такіх мінімалістычных работ: праз памер, тэкстуру, спалучэнне з прасторай. Гэты праект мяне надзвычай уразіў. Акурат тады ў маім офісе адбываўся рамонт, там былі белыя сцены, і мастак спытаў: "Якую з іх абярэш? Я хачу падарыць табе сваю работу". І вось, сёння ў мяне ёсць падпісаны ім сертыфікат, і я магу прадаць гэты твор за прыстойную суму.

Каб была нагода для дыскусій

Акурат напярэдадні прыезду ў Мінск Кейстутас Куізінас атрымаў прыемную навіну: яго куратарскі праект выйграў тэндэр на права прадставіць краіну на чарговай Венецыянскай біенале. Куратарам нацыянальнага павільёна Літвы ён будзе ўжо не ўпершыню, і таму задаць яму асцярожнае пытанне адносна стратэгіі поспеху ўдзелу ў біенале было цалкам дарэчы.

Зрэшты, на яго думку, агульных рэцэптаў тут быць не можа. Хіба што адзіны прынцып: звяртацца да міжнароднай аўдыторыі на зразумелай для яе мове.

— Спробы выставіць на біенале сучаснага мастацтва этнаграфічна-рэтраспекцыйны матэрыял, які ўжо рабілі некаторыя краіны, выклікалі хіба ўсеагульнае неўразуменне, — кажа куратар. — І аргумент аб "нацыянальнай самабытнасці" тут не спрацоўвае. Беларускае мастацтва ў кожным выпадку будзе адрозніваца, скажам, ад ісландскага, яно прасякнута ментальнасцю гэтага народа, але, у той самы час, і адлюстроўвае пэўныя універсальныя тэндэнцыі. Напэўна, менавіта гэта важна прадэманстраваць для ўсяго свету. Увогуле, калі я сустракаюся з калегамі, якія кіруюць цэнтрамі сучаснага мастацтва ў іншых гарадах, і распавядаю ім пра праект беларускай выстаўкі, зазвычай чую ў адказ: "Беларусь! Вельмі цікава! Мы пра яе ўвогуле нічога не ведаем". І таму спадзяюся, што сфарміраваная намі выстаўка атрымае "гастрольны" працяг. Буду прыкладаць для гэтага намаганні.

...У суседніх краінах, дзе contemporary art стала моднай забаўкай "істэблішменту", казаць пра яго кепска — маветон. "Прыстойныя манеры" прадугледжваюць зацікаўленае ківанне галавой пры праглядзе нават тых твораў мастацтва, сам факт прысутнасці якіх у экспазіцыйнай прасторы (а не на бліжэйшым сметніку) выклікае ў цябе здзіўленне.

— Сучаснае мастацтва — гэта значны фактар іміджа краіны, — кажа Кейстутас Куізінас. — Менавіта таму еўрапейскія дзяржавы навыперадкі будуюць вялізныя арт-цэнтры, увасабляючы самыя амбіцыйныя архітэктурныя праекты. Многія людзі могуць увогуле не разбірацца ў сучасным мастацтве, але пры гэтым ствараць уражанне яго ўтрапёных аматараў. Наўрад ці ў сучасным свеце хтосьці будзе выказваць сумневы ў тым, што такое мастацтва патрэбна.

...Зрэшты, пэўную прастору для сумневаў, усё ж, напэўна, варта пакінуць. Бо гэта — акурат тая ментальная фактура, з якой, у значнай меры, і складаецца contemporary art. Многія яго ўзоры цікавыя перадусім як нагода для дыскусій.

Ілля СВІРЫН

На здымку: Кейстутас Куізінас і Таццяна Бембель.
Фота аўтара

Да 30 жніўня ў Нацыянальным мастацкім музеі будзе працаваць выстаўка жывапісу выдатнага беларускага творцы, заслужанага дзеяча мастацтваў Барыса Казакова (1937 — 2008 гг.). Яе назва — "Паэзія ў паўсядзённасці".

Зерне стэрэажывапісу

Выхаванец Горкаўскага мастацкага вучылішча і аддзялення сцэнаграфіі Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута, Барыс Іванавіч уварваўся ў вялікае мастацтва хутка і імпэтна. Ягоныя стыль, манера, арыгінальныя назіранні і развагі спалучыліся надзіва лёгка і натуральна, хаця ў 60-я гады ён паспеў як мастак-пастаноўшчык аздобіць паўтара дзесятка спектакляў у тэатрах Мінска, Гомеля і Магілёва.

Аднак менавіта ў станковым жывапісе Б.Казакоў бліскуча праявіў сябе як майстар жанравай фігуратыўнай карціны і карціны-алегорыі. Маляваў таксама партрэты і "чыстыя" пейзажы. Яго палотны — гэта як бы мастакоўскія ўяўленні аб жыцці, якія адлюстраваны ў пэўным і заўсёды інтэнсіўна выказаным стане святла і атмасферы, прытым кампазіцыйна закончаныя, канструктыўна і рытмічна арганізаваныя, накшталт класічных карцін, пакрытых "музейнай пацінай" часу.

Б.Казакоў. "Жнівень. Вяртанне дамоў".

Ілюзіянізм і мікракосм яго прастораў абумоўлены тым, што мастак жадаў "проста падарожнічаць", пагружаючыся ў гэтыя прасторы, каб адчуць навобмацак кожную дэталь з усяго, ім жа створанага. Такое спалучэнне дакументальнай верагоднасці, выразнай магічнай нагляднасці рэчыўных рэалій і глыбакадумнасці патаемных падтэкстаў з'яўляецца характэрнай рысай карцін "Яблыня", "Калгас "Рассвет". 1944 год", "Малако сорак другога года" (сярэбраны медаль ВДНГ СССР, 1981 г.), "Пра першага трактарыста", "Чорны грузд", "Атака", "Лазневы дзень", "У майстэрні", "Уборка ўраджаю", "Вяртанне дадому", "Карміцелька", "Прысвячэнне маці", "Іван Сцяпанавіч", "Бяда. Падлетак", "Крыўда. Падлетак", "Цар-віно, цар-рыба", "Нарачанскі хлеб", "Пчаліная калода", "Напрыканцы стагоддзя", "Восень у садах вёскі, якая знікла", трыпціха "Дарогі, па якіх ніхто не ідзе", цыкла "Поры года"…

Пачынаючы з 1962 года, Барыс Іванавіч прымаў удзел амаль што ва ўсіх рэспубліканскіх мастацкіх выстаўках, у шматлікіх — замежных. Правёў чатыры персанальныя экспазіцыі ў Мінску, а дзве ягоныя работы набыла Трацякоўка.

У архіве ўдавы Барыса Іванавіча — Галіі Казаковай — знаходзіцца рукапіс мастака, куды ён цягам доўгіх гадоў уносіў свае роздумы і развагі "пра час і пра сябе". Прывяду толькі некаторыя: "Мастак, які малюе ўсё тое, дзе ён жыве, — нацыянальны мастак"; "Мой стэрэажывапіс. Назіраючы за прадметамі ў прыродзе, я ўбачыў: у паўтонах заўсёды выяўляецца фактура (зерне) матэрыялу, якая мае самастойнае жыццё на вялікім прадмеце. У іх ёсць сваё святло, паўцень, цень і падаючы цень. Я стаў выкарыстоўваць фактуру на творах у патрэбных месцах, і гэта дадало моцы карціне, а мне — магчымасці стаць жывапісцам, не падобным ні на кога. А жывапіс свой я назваў "Стэрэажывапіс"; "Прырода, тое, што створана Богам, мае ўсё неабходнае для стварэння карціны. Мастаку застаецца толькі адабраць патрэбнае яго розуму і сэрцу"; "Для мяне жывапіс — гэта здольнасць пры дапамозе колеру зрабіць так, каб апошні не было відаць, каб адчувалася сама матэрыя свету, а не фарбы"; "Гуманізм і патрыятызм — вялікія фактары культуры"; "Самая лепшая пахвала для мяне была, калі адна глядачка сказала пра маю работу: "Гэта як быццам і не намалявана…"

Б.К.

Знакі габелена чырванню і льном

Першая персанальная выстаўка габелена віцябчанкі Наталлі Лісоўскай у Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва называецца "Знакі роднай зямлі".

Наталля Сяргееўна родам з Віцебшчыны. Яна атрымала адукацыю ў Мінскім мастацкім вучылішчы імя А.К. Глебава і ў Віцебскім тэхналагічным інстытуце лёгкай прамысловасці. Пасля заканчэння апошняга працавала мастаком друкаванага малюнка на Магілёўскім камбінаце шаўковых тканін. Потым — ізноў у родным горадзе, дзе выкладае на кафедры дызайну, а з 1993-га яна — дацэнт Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага універсітэта. Працуе ў галіне габелена, у тэхніцы ручнога ткацтва і ў тэкстыльным дызайне. Ведаюць Наталлю Сяргееўну і як навукоўцу-практыка па распрацоўцы і ўкараненні вялікай колькасці структур тканін і малюнкаў на шэрагу беларускіх прадпрыемстваў.

Наталля Лісоўская шмат выстаўляецца на рэспубліканскіх і замежных выстаўках. Што ж яе прываблівае ў мастацтве? "Мой любімы колер — чырвоны. Ён сімвалізуе каханне. Любімы пісьменнік і паэт — Іван Бунін; з беларусаў — Максім Багдановіч. З габеленшчыкаў Беларусі мне даспадобы работы Валянціны Бартлавай, Галіны Крываблоцкай, Ларысы Густавай, Тамары Лісіца. Інтарэс да габелена выяўляюць і зусім маладыя мастакі. Тое значыць, што мастацтва габелена будзе жыць доўга. Захапляюся і жывапісам, але габелену ніколі не здраджваю, бо ў ім — мая душа і сэрца, мой настрой…"

Што галоўнае ў работах Наталлі Лісоўскай? Прыгажосць і захапленне беларускай прыродай ва ўсе поры года, таленавіта ўвасобленай аўтарам з дапамогай поўсці, сізалю, льна, шкла ("Начное возера", "Квітнеючыя лугі", "Свет вярбы", "Гарадскія рытмы", "Раніца", "Чырвонае лета", "Зімовыя вокны", "У зімовым садзе")…

Іван АРХІПАЎ

Н.Лісоўская. "Чырвонае лета".

"Арт-Жыжаль": музей у… крэпасці?

А.Ткачоў. "Купалле".

Завяршыў сваю працу VIII Міжнародны пленэр па кераміцы "Арт-Жыжаль" у Бабруйску. Як заўсёды, ён быў арганізаваны аддзелам культуры гарвыканкама і гарадской арганізацыяй Беларускага саюза мастакоў.

Пленэр працаваў 24 дні на базе адпачынку "Дом рыбака" СПК "Світанак" імя К.П. Арлоўскага, у сасновым лесе, на маляўнічым беразе Чыгірынскага вадасховішча. У ім узялі ўдзел 23 прафесійныя мастакі-кераміты з Беларусі, Венесуэлы, Германіі, Літвы, Малдовы, Расіі, Украіны. Дэвіз пленэру — нязменны: "Вопыт майстэрства — традыцыі і сучаснасць".

Канешне ж, асноўны творчы тон задавалі шматлікія ўдзельнікі пленэраў Анатоль Концуб і Алег Ткачоў (Бабруйск), Максім Калтыгін (Мінск), Яўген Адзіночанка (Гродна), Вольга Равінская (Масква), Алег Дабравольскі (Кішынёў), Юргіта Ясінскайтэ (Вільнюс)…

Паказальна, што адным з дасягненняў пленэру стала засваенне тэхнік "абвару" і "раку" ў спалучэнні з ангобным пакрыццём, што дало абсалютна новы дэкаратыўны эфект на вырабах.

У адзін з апошніх дзён працы пленэр наведалі міністр культуры Рэспублікі Беларусь Павел Латушка, а таксама намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый Малашка, прадстаўнікі гарадскіх улад. Для іх удзельнікамі пленэру былі прадэманстраваны працэсы па фармоўцы, дэкарыраванні, абпале работ, тэхналагічныя асаблівасці вырабу "абварной" керамікі і "раку".

Тэма пленэру — "Кераміка ў прасторы інтэр'ера" — абумовіла калектыўнае выкананне шэрагу работ па мастацкім афармленні канкрэтнага аб'екта — інтэр'ера кафэ Палаца мастацтва г. Бабруйска. Канцэпцыю афармлення і модуль падрыхтоўкі дэкаратыўных вырабаў з керамікі распрацаваў Валерый Калтыгін. Гэта насценныя вазы, пласты, свяцільнікі. Усе вырабы для кафэ прадстаўлены на выстаўцы.

Экспазіцыю складаюць больш за 70 кампазіцый, большасць з якіх — шматпрадметныя. Сёлета на пленэры выканана шмат дэкаратыўных насценных пластоў, і характэрнай асаблівасцю выстаўкі з'яўляецца тое, што керамічныя вырабы актыўна ўключылі ў экспазіцыйную прастору залы і сцэны. Гэта дэкаратыўныя пласты Ірыны Шчаснай (Мінск), "Партрэцікі" Юрыя Білея (Львоў). Нямала таксама буйнафарматных вырабаў: мастакі з поспехам "абыходзяць" абмежаванні памераў вырабаў або частак, з якіх яны складзены, — не болей за 35 см па вялікім боку. Гэта "Хлябы" Леаніда Рыжкоўскага (Мінск), "Адлюстраванне" Валянціны Іваньковай (Мінск).

Г.Амбросава. "Чаша".

Новыя ўдзельнікі пленэру Настасся Чарына з Санкт-Пецярбурга і Юрый Білей унеслі сваімі работамі свежы струмень у экспазіцыю. Кампазіцыі Генадзя Мерца (Венесуэла) вылучаюцца яркай нацыянальнай адметнасцю. Індывідуальнасць і рэгіянальныя тэндэнцыі нацыянальнай школы адлюстроўваюцца ў кампазіцыі "Трыполіка" Валерыя Вынагэ (Кішынёў). Своеасаблівасцю вылучаюцца творы літоўскага кераміста Андрыуса Янулайціса: "Сон", "У пастцы".

Н.Карчомкіна. "Пікнік".

З года ў год работы прадстаўляюць пастаянныя ўдзельнікі пленэраў, чыё аўтарства лёгка пазнаць: прасочваецца адна і тая ж тэндэнцыя ў фармаўтварэнні. Паколькі асноўнай тэхнікай пленэру з'яўляецца "дымленне", яна накладвае свой адбітак на агульную колеравую гаму твораў. Кіраўнік пленэру В.Калтыгін заклапочаны гэтым фактарам і разважае над тым, як у далейшым зрабіць каляровую палітру больш разнастайнай, распрацаваць новыя тэхналагічныя рашэнні, надаць форуму новы імпульс.

Чарговы, IX пленэр па кераміцы павінен адбыцца ў Бабруйску летам 2011 года. Правядзенне такіх форумаў стварыла спрыяльную глебу для магчымасцей заснавання Музея керамікі ў адным з будынкаў Бабруйскай крэпасці.

Па заканчэнні работы ў Бабруйску выстаўка "Кола агню" выправіцца ў Магілёўскі абласны мастацкі музей імя П.В. Масленікава, а затым у Мінск.

Ала МАЛЬЦАВА, метадыст Бабруйскага мастацкага музея імя Г.Г. Паплаўскага

Арыфметыка аркестра

24-ы сезон як пралог юбілею

Днямі Нацыянальны канцэртны аркестр Беларусі на чале з народным артыстам краіны, прафесарам Міхаілам ФІНБЕРГАМ пачаў свой 24-ы сезон. Гэтым тыднем ішлі рэпетыцыі, а 4-га верасня калектыў рушыць у Мазыр, дзе, паводле традыцыі, дасць першы канцэрт сезона.

— Цяперашні сезон, — распавёў Міхаіл Якаўлевіч, — будзе пралогам юбілейнага, 25-га, да якога мы рыхтуемся ўжо сёння. Усе "сакрэты" юбілею раскрываць не буду — даведаецеся праз год. Асаблівасцю ж 24-га сезона стане яго прысвячэнне беларускаму мастацтву.

— Але ж вы і ваш калектыў заўсёды надаяце нацыянальным творам вялікае значэнне: яны чырвонай ніткай праходзяць літаральна праз усе вашы праграмы. Дастаткова сказаць, што толькі ў малых гарадах Беларусі вы правялі 117 фестывальных канцэртаў, прысвечаных нашай спадчыне, выдалі больш за дзесятак кніг з найноўшымі даследаваннямі нашых навукоўцаў, сканцэнтраваных вакол нацыянальнай культуры...

— Так, але сёлета мы акцэнтуем усё гэта яшчэ больш. Тым больш, што на гэты сезон прыпадае некалькі значных юбілеяў нашых класікаў. Так, сёлета наш аркестр адзначыць 100-годдзе з дня нараджэння двух вядомых кампазітараў — Рыгора Пукста і Дзмітрыя Лукаса. Яшчэ адзін канцэрт будзе прысвечаны творчасці Аляксея Туранкова. Падкрэслю: гэтыя тры творцы былі сярод тых, хто стаяў ля вытокаў стварэння беларускай прафесійнай кампазітарскай школы XX стагоддзя. Адзначым мы і 70-годдзе з дня нараджэння Уладзіміра Мулявіна.

Навінкай сезона стануць таксама два новыя фестывалі, якія рыхтуюцца нашым калектывам. Адзін з іх прысвечаны ўвядзенню Магдэбургскага права на беларускіх землях. Бо ў 2010-м спаўняецца 620 гадоў, як Магдэбургскае права, заснаванае ў XIII стагоддзі, прыйшло і ў наш край: у 1390 годзе яно было нададзена Брэсту, у 1391-м — Гродна. Вядома, гэты статус адбіваўся і на культуры, што мы і акрэслім у нашай праграме. Ну, а другім шырокамаштабным святам стане Фестываль беларускай песні і паэзіі, які пройдзе не ў Маладзечне, а ў Мінску. Ён будзе складацца з трох канцэртаў. У першы з іх увойдзе музыка беларускага замежжа — творы нашых кампазітараў, якія воляй лёсу апынуліся за межамі роднай краіны, але захавалі сваю нацыянальную культуру. А вось другі будзе ўтрымліваць песні і рамансы Эдуарда Зарыцкага паводле беларускай класічнай паэзіі. Гэты кампазітар даўно і мэтанакіравана працуе ў такім напрамку, фарміруючы багаты вакальны рэпертуар, заснаваны на перлінах нашай паэтычнай думкі. Здаралася, не ўсе нашы паэты "надзяляліся" ўвагай кампазітараў, творчасць некаторых здавалася настолькі самадастатковай, што далучэнне музыкі ўяўлялася ці то непатрэбным, ці то ўвогуле немагчымым. Эдуард Зарыцкі "парушае" гэтае сцвярджэнне і ўзбагачае не толькі музыку, але і ўласна літаратуру, прапаноўваючы "музычныя" прачытанні вершаў нашых класікаў. Трэці ж канцэрт прымяркуем да 80-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Караткевіча.

— Пэўна, новыя фестывалі не заменяць старыя, а далучацца да іх?

— Так, ужо ў верасні прадоўжацца традыцыйныя святы камернай музыкі ў Тураве і, напрыканцы месяца, у Мсціславе. Пройдуць такія фестывалі і ў Заслаўі, Нясвіжы, Міры, Пінску, Іванаве, Чачэрску. У лютым адбудзецца 22-і па ліку "Мінскі джаз". У сакавіку — IV форум "Шлягер на ўсе часы". Ён будзе складацца з чатырох канцэртаў: першы прымеркаваны да 75-годдзя Райманда Паулса, другі — да 70-годдзя Давіда Тухманава, трэці — "Лепшыя песні кіно" — уключыць музыку Арно Бабаджаняна, Аляксандра Зацэпіна, Ігара Талькова, Аскара Фельцмана. Чацвёртым жа канцэртам упершыню стане "Шансон у Мінску".

— А самыя бліжэйшыя планы, акрамя традыцыйнай "справаздачы" ў Мазыры?

— Канешне ж, удзел у святкаванні Дня горада ў Мінску.

Фота Юрыя ІВАНОВА



На наступным тыдні ў выдавецтве "Мастацкая літаратура" выходзіць першая кніга серыі "Беларусь музычная". Адпаведна назве, серыя будзе прысвечана выбітным кампазітарам і музыкантам нашай краіны. Першая кніга — "Лёсу срэбраныя струны", што мае тыраж у тысячу асобнікаў, — стварае партрэт народнага артыста СССР, знакамітага кампазітара Яўгена Глебава.

Эпоха Глебава

— У планах выдавецтва, — распавёў галоўны рэдактар "Мастацкай літаратуры", паэт Віктар ШНІП, — серыя "Беларусь музычная" была даўно. Але з чыёй творчай постаці яе пачаць? Мы разумелі, што гэта павінен быць не проста таленавіты кампазітар, а менавіта той, у творчасці якога адлюстравалася эпоха з жыцця нашай краіны, той, чые творы вядомыя не толькі ў нас, але і ў далёкім замежжы. І калі ўдава кампазітара, Ларыса Васільеўна Глебава, звярнулася да нас з прапановай падрыхтаваць і выдаць кнігу пра Яўгена Аляксандравіча, мы з радасцю адгукнуліся: яна цалкам упісвалася ў запланаваную серыю. Далей — усё проста: узялі рукапіс і пачалі працаваць.

Сапраўды, аўтарам канцэпцыі, маштабнага ўступнага артыкула і складальнікам зборніка выступіла Ларыса Глебава. Яна акрэсліла кола дзеячаў культуры, якія занатавалі для гэтай кнігі свае ўспаміны пра майстра. Таму размовы пра гэтае выданне пачаліся ў музычных кулуарах ужо даўно. Многія думалі, што кніга выйдзе да 80-годдзя з дня нараджэння класіка. Атрымалася ж — да 81-й гадавіны, што будзе адзначацца 10-га верасня…

— Калі робіш справу, вынік якой разлічаны не на год і не на два, "круглая" дата не заўсёды павінна быць арыенцірам, — мяркуе Віктар Шніп. — У кнігавыданні вельмі шмат залежыць не ад самога выдавецтва, а непасрэдна ад аўтараў. У гэтай жа кнігі — іх некалькі дзесяткаў. І калі хаця б адзін з іх затрымлівае свой матэрыял або ў кагосьці ўзнікае жаданне яго дапісаць, удасканаліць, дык працэс расцягваецца. Можна, вядома, у любы момант паставіць кропку і сказаць: што ёсць — тое і ёсць. Але ў дадзеным выпадку мы пайшлі насустрач аўтарам, бо разумелі, што ад гэтага выданне толькі выйграе. Апошнія карэктывы ўносіла само жыццё: увесну раптоўна памёр сын Глебава Радзівон, таксама кампазітар. І ў гэтай кнізе павінны былі з'явіцца радкі і пра яго. А галоўнае — да друкаванага асобніка будзе дадавацца кампакт-дыск з музыкай Яўгена Глебава.

— Ці ўвайшлі ў выданне артыкулы Яўгена Аляксандравіча? Бо ён у свой час узнімаў многія набалелыя тэмы, выступаючы не толькі на разнастайных пасяджэннях, "круглых сталах", з'ездах і пленумах Беларускага саюза кампазітараў, але і непасрэдна ў друку.

— Літаратурныя выказванні кампазітара складаюць трэці раздзел кнігі. Чацвёрты — гэта спіс твораў Глебава, які і завяршае зборнік. А сярод тых, хто падзяліўся сваімі думкамі і памяццю пра Яўгена Глебава і яго творчасць, — дырыжоры Аляксандр Анісімаў, Міхаіл Фінберг, музыказнаўца Іна Зубрыч, харэографы-пастаноўшчыкі яго балетаў Атар Дадзішкіліяні, Валянцін Елізар'еў, драматург Аляксей Дударэў, балетныя крытыкі Юлія Чурко, Таццяна Мушынская, многія знаныя музыканты. Дарэчы, кампазітарскае асяроддзе Глебава прадстаўлена ў гэтай кнізе не толькі яго калегамі старэйшага пакалення (гэта, да прыкладу, Андрэй Мдзівані, Рыгор Сурус), але і шматлікім вучнямі, сярод якіх — Васіль Раінчык, Вячаслаў Кузняцоў, Уладзімір Кандрусевіч, Ядвіга Паплаўская, Дзмітрый Даўгалёў, Аляксандр Рашчынскі ды іншыя. Увогуле ж, "даследаванне асобы" атрымалася вельмі разнастайным, грунтоўным — больш як на 350 старонак, багата ілюстраваным, бо ў кнізе — каля 300 фотаздымкаў, афішы, праграмы канцэртаў.

— Ці вызначана ўжо, якія кнігі серыі "Беларусь музычная" будуць наступнымі?

— Кожны кампазітар варты таго, каб пра яго напісалі кнігу. Але павінен з'явіцца той, хто яе напіша! Таму — справа за аўтарамі.

Самулноры — у фаворы

Жнівеньскую афішу Палаца прафсаюзаў упрыгожылі "Гукі Карэі". Уваход на канцэрт быў вольны, інфармацыі пра яго было дастаткова, у тым ліку на бліжэйшых аўтобусных прыпынках, так што паўнюткі партэр цягам выступленняў "прырастаў" паступовым запаўненнем балконных ярусаў.

Шмат было моладзі, прыходзілі цэлымі сем'ямі з дзецьмі розных узростаў. Сама была сведкай, як стомленая гучнымі барабанамі бабуля ўсё ўгаворвала сысці сваю васьмігадовую ўнучку, — дарэмна! Хтосьці, вядома, спакусіўся на паказальныя выступленні таэквандыстаў, мудра пастаўленыя акурат у сярэдзіну канцэрта, ды пры гэтым не толькі праслухаў першую палову канцэрта, але і з задавальненнем застаўся на другую. Дый пасля ўсёй дзвюхгадзіннай насычанай дзеі ніхто не спяшаўся сыходзіць, тым больш, што арганізатары — Пасольства Рэспублікі Карэя ў Рэспубліцы Беларусь, Міністэрства культуры, спорту і турызму Карэі, а таксама Асацыяцыя беларускіх карэйцаў — прапанавалі прысутным запоўніць падрабязную анкету: што спадабалася больш, што хацелася б убачыць надалей.

Гэта была ўжо далёка не першая сустрэча мінчан з карэйскім мастацтвам. Не так даўно ў зале сталічнай філармоніі дэманстраваліся жанры традыцыйнай карэйскай культуры, занесеныя UNESCO ў Спіс нематэрыяльных культурных каштоўнасцей. І калі той канцэрт можна было ў поўнай меры назваць "навуковым даследаваннем", дык цяперашні стаўся "навукова-папулярным", максімальна дэмакратычным, уключаў у сябе элементы інтэрактыву.

Артыстамі выступалі пяцёра маладых валанцёраў з самой Карэі, да іх далучаліся як этнічныя карэйцы, што жывуць у нас, так і беларускія хлопцы і дзяўчаты. Апошнія пад кіраўніцтвам валанцёраў навучыліся новаму для іх мастацтву. А "настаўнікі" працавалі ў нас ужо з мая, паспеўшы выступіць не толькі ў Мінску, але і ў Дзяржынску, і ў Гродне.

Можа, па выканальніцкім узроўні гэта быў не той вышэйшы пілатаж, не тая недасягальная вытанчанасць, якія дэманстравалі на філарманічнай сцэне прызнаныя майстры, але відавочнай станавілася пераемнасць традыцый — ад непасрэдных носьбітаў традыцыйнай карэйскай культуры да моладзі, у тым ліку ў якасці хобі. Асабліва ўразіла спалучэнне традыцыйнага карэйскага самулноры (ігра чатырох інструментаў — двух розных гонгаў і двух барабанаў, кожны з якіх сімвалізуе пэўную прыродную стыхію і вымярэнне гадавога цыкла ў днях, месяцах, порах года) з хіп-хопам, r'n'b. Бо гэта — не механічнае спалучэнне розных кірункаў, а "ўваходжанне" традыцыйнай карэйскай культуры ў сучасную маладзёжную, пошук агульных эстэтычных платформ такіх, здавалася б, аддаленых адна ад другой з'яў.

Дакументальны фільм, паказаны ў якасці пралога, пазнаёміў з побытам, прыродай, вытворчасцю, самім духам краіны і яе народа. Фрагмент з тэлепраграмы навін пра ўдзел карэйскай дыяспары ў Рэспубліканскім фестывалі нацыянальных культур у Гродне і фотарэпартаж пра дзейнасць "валанцёраў культуры" папярэджвалі апошні нумар надзвычай разнастайнай праграмы: ад традыцыйных жанраў, народных песень і танцаў да баявых прыёмаў і нават эстрады. І тройчы ў канцэрце, бы лейтматывам, — самулноры.

Аўтар і вядучая рубрыкі —
Тацяна КОМАНАВА

Сцэнічны сезон праз спробу аналізу

Ставілі тэатры... "багаж"

Акідваючы вокам плён мінулага тэатральнага сезона, прыгадала біблейскую прытчу пра фараона, якому прыснілася аднойчы, нібыта выйшлі з ракі сем тлустых кароў, а за імі — сем худых, што з'елі тлустых кароў, але самі большымі не сталі. Сцэнічны прадукт апошняга года нагадвае акурат гэтых худых кароў: немагчыма аспрэчыць факт іх з'яўлення і наяўнасці, аднак "тлустасці" ніводная з іх так і не прынесла ні сабе, ні агульнаму творчаму жыццю краіны. У чым жа прычына такой пасіўнасці? І ці ёсць перспектывы для актывізацыі тэатральнага працэсу ў сталіцы і рэгіёнах? Паспрабуем прааналізаваць сітуацыю, засяродзіўшыся не столькі на гучных прэм'ерах, колькі на "ўнутраных", але ад таго не менш важных, фактах жыцця айчыннай сцэны.

Сцэна са спектакля "Тэатраманія".

У віхуры фестываляў

Адметнасцю сезона сталася тое, што пераважная большасць тэатральных уражанняў ад яго аказалася звязаная з фестывалямі. "Белая вежа" ў Брэсце, "М.@rt-кантакт" у Магілёве, а таксама сталічныя "Панарама" і Міжнародны фестываль тэатраў лялек — пра кожны з гэтых буйных і прадстаўнічых форумаў мы падрабязна пісалі на старонках "К". Яны — тыя знакавыя "вешкі", якія сёння, як, бадай, ніколі, своеасаблівым чынам вызначаюць сістэмы каардынат нашага ўспрыняцця ўласных тэатральных пошукаў і дасягненняў. У першую чаргу, дзякуючы таму, што ў аснове кожнага з фестываляў — сур'ёзная мастацка-творчая канцэпцыя. Яна і мацуе фундамент чарговай яго "прыступачкі".

Ды ўсё ж не перастае быць актуальнай "катрынкавая" тэма надзвычай малой прысутнасці на гэтых форумах нашых калектываў. Так, іх колькасць год ад года павялічваецца ў афішах (а Міжнародны фестываль тэатраў лялек змог сабраць у Мінску ўсе айчынныя лялечныя трупы), аднак нават гэты прагрэс не дае магчымасці асэнсоўваць сучасныя творчыя працэсы, што разгортваюцца на беларускай сцэне, з дастатковай доляй заглыблення ў матэрыял.

Крок управа, крок улева...

Жыццё айчынных тэатраў, так бы мовіць, унутры ўласнай сферы ў мінулым сезоне пакінула адчуванне... "падводнасці": здавалася, што калектывы, бы касякі рыб, заглыбіліся на дно сваіх акварыумаў, і ўласнае творчае існаванне для іх абмежавалася гэтай прасторай, агароджанай з усіх бакоў шклом. З аднаго боку, наўрад ці варта папракаць іх у такой закрытасці і патрабаваць шырыні мастацкага існавання, бо пры ўсіх, нават самых пазітыўных, закліках крытыкі галоўная задача калектываў на месцах — забяспечваць тэатральнае жыццё сваёй спажывецкай групы.

Ды ўсё ж, як вызначэнне курсу карабля не можа вырашацца калегіяльна, а мусіць быць прэрагатывай капітана каманды, так і тэатральныя варункі патрабуюць наяўнасці моцнага і крэатыўнага лідэра, які будзе клапаціцца не толькі пра запаўняльнасць глядзельнай залы, што забяспечыць яму выкананне плана платных паслуг, але і пра творчы рост калектыву, яго прысутнасць "на плаву" ў сцэнічным асяродку. У мінулыя сезоны ператварэнне лідэраў-рэжысёраў у буйных флагманаў айчынных нацыянальных тэатраў прыцягнула да сябе жывы, непадробны інтарэс. Цяпер жа рэжысёрскія "ракіроўкі" аказаліся нібыта па-за ўвагай тэатральных аналітыкаў. І гэта тычыцца не толькі замены Наталлі Башавай у Рэспубліканскім тэатры юнага гледача Уладзімірам Савіцкім. Думаецца, падставы для пільнай увагі дасць і Віктар Чэпелеў, што ў бягучым сезоне заняў пасаду дырэктара-мастацкага кіраўніка Гомельскага абласнога драматычнага тэатра. У Гомельскім маладзёжным тэатры яго змяніў Юрый Вута, які, у сваю чаргу, "вызваліў" месца для Венедыкта Расстрыжэнкава ў Мінскім абласным драматычным тэатры ў Маладзечне...

Не сакрэт, што падобныя перастаноўкі ў рэгіянальных тэатрах даюць падставу для ажыўлення рэпертуарных і мастацкіх пошукаў. Іншая справа — на практыцы далёка не ўсе з шэрагаў рэжысёраў-"гастралёраў" гатовы займацца складанай справай творчай рэанімацыі, а аддаюць перавагу малазатратнаму механічнаму пераносу свайго пастановачнага "багажу" на новую сцэну, што, безумоўна, не стварае істотных нагод для размоў пра творчыя пошукі. Магчыма, менавіта таму ў сёлетнім сезоне асноўнае поле інтарэсу закумулявалася вакол двух сталічных тэатраў са статусам "нацыянальны" — Купалаўскага і Горкаўскага: пафас змены кіраўніцтва натуральным чынам змяніўся творчымі буднямі, якія і даюць магчымасць найлепшым чынам убачыць, што ж цікава сёння "жывому" беларускаму тэатру і яго галоўным "спажыўцам" — гледачам.

А спажывецкая патрабавальнасць — дзіўная акалічнасць, якая ў тэатры выяўляецца даволі спецыфічным чынам. Глядач прыходзіць на той або іншы спектакль з трывалым перакананнем: ён ведае, што і як мусіць быць на сцэне. Калі ж "карцінка", якая адкрываецца яму, аказваецца іншай, узнікае хваля расчаравання і абурэння, — класічная гісторыя "падманутых чаканняў". У гэтым сэнсе мінулы сезон падарыў нам на сталічнай сцэне ажно тры спектаклі, якія выклікалі акурат гэткую рэакцыю (гаворка пра "Translations" і "Не мой" у Купалаўскім і "Пане Каханку" ў Горкаўскім тэатрах. Кожны з іх — непадобны да іншых і вырашае свае задачы, аднак усе яны аказаліся надзвычай... аднатыпнымі ў плане праяў глядацкай "патрабавальнасці".

Той жа Мікалай Пінігін у "Translations" не пайшоў па шляху жанглівання жанравымі прыёмамі. Ён паспрабаваў заглыбіцца ў аўтарскі тэкст, не забіваючы яго залішнімі сцэнічнымі ўпрыгажэннямі кшталту яркіх музычна-танцавальных нумароў і візуальных спецэфектаў (хоць і яны, безумоўна, былі), у выніку чаго і атрымаў папрокі ў "сумнасці" і расплыўчатасці сцэнічнай гісторыі: глядач у асноўнай масе сваёй быў не гатовы бачыць і ўспрымаць гэткага "чужога" яму Пінігіна...

Наступнай тэатральнай сенсацыяй мелася стаць прымеркаваная да Міжнароднага дня тэатра прэм'ера "Пане Каханку" на сцэне Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Максіма Горкага. Здавалася б, разлікі, зробленыя пастановачнай групай, проста не пакідалі будучаму спектаклю шанцаў для іншага лёсу... Аднак на справе дыскусіі вакол пастаноўкі разгарнуліся зусім не на падмурку тэатральнага пошуку: шматлікіх рэцэнзентаў хвалявала ў большай ступені тое, якія факты з біяграфіі Пане Каханку былі выцягнуты на свет і наколькі праваменна сёння надзяляць гэтую постаць рысамі мысліцеля і барацьбіта за нацыянальную самасвядомасць беларусаў. А ў выніку сам спектакль як з'ява калектыўнай працы вялікай творчай групы адышоў у цень.

На падмогу — антрэпрызу?

Тэма творчай актывізацыі маладых тэатральных дзеячаў застаецца ў шэрагу першачарговых пытанняў. На фоне размоў пра стварэнне сістэмы стымулявання і падтрымкі творчай рэалізацыі пачаткоўцаў Купалаўскі тэатр і Мікалай Пінігін прапанавалі самы відавочны ход: даць магчымасць паказаць уласную прафесійную сілу. Зрэшты, ідэя гэтая сама па сабе не новая: цягам не аднаго дзесяцігоддзя з зайздроснай перыядычнасцю заходзіла гаворка пра неабходнасць "выпрабавання сцэнай", але з гэткай жа перыядычнасцю маладых рэжысёраў далей Малой сцэны Купалаўскага так і не "пушчалі".

Адной з "паддоследных" сярод маладых творцаў у мінулым сезоне стала рэжысёр Кацярына Агароднікава, вядомая альтэрнатыўнымі праектамі, ажыццёўленымі на сцэне Сучаснага мастацкага тэатра. У якасці спробы выхаду на рэпертуарны калектыў яна прадставіла гледачам "Тэатраманію" Пітэра Шэфера. Акрамя пошуку пастановачнага рашэння, перад ёй стаяла і іншая задача: стварыць будучы спектакль, зыходзячы з таго, што ў бліжэйшыя пару сезонаў Купалаўскаму давядзецца "жыць на чамаданах". І рэжысёр паклікала на дапамогу ўсе тыя прыёмы, якія яна з пэўным поспехам эксплуатавала ў сваёй "Дванаццатай ночы" ды іншых пастаноўках у антрэпрызе: на сцэну бадзёрым крокам выйшлі хлопцы з "дудкамі" і іншымі музычнымі інструментамі, што сваім піянерскім запалам намагаліся стварыць атмасферу нязмушанай гульні...

Сцэна са спектакля "Пане Каханку".

Галоўным урокам гэтага сцэнічнага "доследу" пад назвай "Тэатраманія" сталася наглядная дэманстрацыя немагчымасці простага нажыўлення ў рэпертуарным тэатры антрэпрызных прыёмаў і штампаў без адпаведнага іх "акультурвання". Усё тое, што калісьці выглядала міла і забаўна, у Купалаўскім падавалася зусім не смешным, а прэтэнзія на "гульню ў акцёрскую ігру" вельмі часта замінала такім яркім, любімым гледачамі актрысам, як Алена Сідарава і Зоя Белахвосцік, цалкам аддацца сваім персанажам. Хаця, здавалася, пазбаў рэжысёр спектакль усёй гэтай "рэжысуры" — сама пастаноўка ад гэтага толькі выйграла б, пераліваючыся чысцінёй крыштальных граняў тонкага акцёрскага існавання.

А маладыя і крэатыўныя?

Ды ўсё ж было б несправядліва акрэсліць тэатральнае жыццё адно толькі межамі сталіцы. Яшчэ ярчэй, чым у мінулыя гады, прыцягнуў да сябе ўвагу Магілёў, які сёння стварыў умовы для цікавага мастацкага самавыяўлення маладых рэжысёраў, не баючыся гэтай іх "маладосці".

Прыкладам, летась Магілёўскі абласны тэатр драмы і камедыі імя В.І. Дуніна-Марцінкевіча зрабіў даволі беспрэцэдэнтны крок: даслаў заяўку ў Беларускую дзяржаўную акадэмію мастацтваў на размеркаванне ў трупу маладога спецыяліста на пасаду... галоўнага рэжысёра, у выніку чаго ў Бабруйск прыехаў Максім Сохар. Але калі ён яшчэ не паспеў праявіць сябе ў гэтым статусе, галоўны рэжысёр Магілёўскага абласнога тэатра лялек Ігар Казакоў стаўся сапраўдным "маладым" адкрыццём мінулага тэатральнага сезона.



Сцэна са спектакля "Poison".

Нягледзячы на тое, што ў Магілёўскі абласны тэатр лялек Ігар Казакоў прыехаў працаваць адразу па заканчэнні Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, пэўны час яго асоба знаходзілася нібыта "ў ценю". Аднак удзел у Міжнародным фестывалі тэатраў лялек, дзе магіляўчане прадставілі яго спектакль "Poison", выклікаў сапраўдны фурор, скарыўшы фестывальную публіку чысцінёй, метафарычнасцю і яркасцю сцэнічнай формы. Што і казаць: жаданне і ўменне размаўляць з дзецьмі — і не толькі на сучаснай тэатральнай мове — сёння, як і заўсёды, з'яўляецца важным навыкам, здольным адкрыць маладому рэжысёру шырокую дарогу ў мастацтве. І мы, безумоўна, чакаем новых пастановак Ігара Казакова, тым больш, што сам рэжысёр кажа: "Мне цікава працаваць з самымі рознымі тыпамі лялек і тэатральнымі жанрамі".

Ну, а галоўнай інтрыгай для горада над Дняпром стане запрашэнне ў верасні яшчэ аднаго маладога рэжысёра — Кацярыны Аверкавай на пасаду галоўнага рэжысёра Магілёўскага абласнога драматычнага тэатра. Што і казаць, пастаноўшчык, якая за мінулы сезон ажыццявіла тры гучныя прэм'еры на сталічных сцэнах — "Вяртанне Галадара" Сяргея Кавалёва ў Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі, а таксама "Зіму" Яўгена Грышкаўца і "Офіс" Інгрыд Лаузунд у Купалаўскім тэатры,— заявіла аб сабе як творца з самастойным мысленнем, цікавым і нелінейным. І той факт, што яна з задавальненнем прыняла прапанову ад "несталічнага" тэатра, сведчыць: паняцце правінцыйнасці не заўсёды носіць геаграфічны характар. А ў дачыненні да мастацтва і ўвогуле — выключна ментальны.

Што ж, наступны сезон ужо сёння "закідвае" перад намі свой "нерат" будучых тэатральных інтрыг, абяцаючы пэўныя нагоды для творчых разважанняў.

І з дня сённяшняга хочацца працягнуць туды ніты тэндэнцый, фарміраванне якіх, мусіць, і стала найважнейшай падзеяй у сезоне 2009 — 2010. Гаворка — і пра актывізацыю маладзёжнай рэжысуры на прафесійнай сцэне, і пра вынікі кадравых "ракіровак" у тэатральных калектывах, і пра надзейны падмурак фестывальнага руху.

Упэўнена, зрушыць з месца сітуацыю зможа адна з галоўных тэатральных ініцыятыў мінулага сезона (і, мяркую, — адна з галоўных падзей сезона будучага!): заснаванне Нацыянальнай тэатральнай прэміі, ідэю якой на пачатку жніўня адобрыў Прэзідэнт нашай краіны Аляксандр Лукашэнка ў час справаздачы Кіраўніку дзяржавы міністра культуры Рэспублікі Беларусь Паўла Латушкі. Да рэалізацыі ідэі спрычынілася і газета "Культура", уключыўшыся ў справу на этапе распрацоўкі Канцэпцыі і актыўна асвятляючы такое важнае для айчыннага тэатральнага жыцця пачынанне.

Галоўнае ж, каб прэмія не проста стала трэндам будучага сезона (на яе відавочна будуць раўняцца тэатры па ўсёй краіне), а выкрышталізавала дадатковы стымул. Калі на "жывой" сцэне паўстане жывая ж рэжысура, дык і "каровы" тады, можа, стануць таўсцейшыя за сёлетніх...

Т.К.

Турпраект "К": спадчына сядзіб у коле інтарэсаў

Працуючы з картай над падрыхтоўкай маршруту, прыходзіш да дзіўнай высновы: па волі лёсу і людзей, ацалелыя гісторыка-культурныя цікавосткі размешчаны на Беларусі досыць кампактна, утвараючы своеасаблівыя турыстычныя зоны, якія ўжо самі сабою натхняюць на ідэі маршрутаў і паслуг.

Ды, на жаль, пакуль гэта — толькі ідэі. Брычку, што вязе экскурсантаў з адной шляхецкай сядзібы ў суседнюю, на беларускіх дарогах не сустрэнеш. Адпаведна, наяўнасць помнікаў спадчыны не надта ўплывае на жыццё і дабрабыт тых мясцін, дзе яны знаходзяцца. Хаця ў перспектыве ўплыў можа (і павінен) быць вызначальным. Уласна, гэта адна з прычын, па якой беларуская дзяржава надае такую ўвагу развіццю турызму.

Агледзеўшы ў першыя дні велатура толькі некаторыя з адметнасцей аднаго такога "анклаву", размешчанага на захад ад Камянца, рушылі да іншага — Пружанскага. Але перад гэтым, натуральна, не абмінулі ўвагай і знакаміты "Камянецкі слуп".

"Сіндром турцэнтра"

Паставіць Сапегаўскі палац на "два крылы"

Камянецкая вежа.

(Працяг. Пачатак у № 33 за 2010 г.)

Сімвал свайго краю

Жыхары Камянца старэйшага пакалення яшчэ памятаюць тыя часы, калі знакамітая вежа ўнутры выглядала не нашмат лепей, чым убачаныя намі закінутыя сядзібы. Сёння яна цалкам адпавядае свайму статусу сімвала Камянеччыны. А ўнутры яе размешчана невялікая, але папраўдзе цікавая і густоўная экспазіцыя.

У чэрвені ў Камянцы адбыўся чарговы рыцарскі фэст — ужо другі па ліку. Пад час яго было вынайдзена арыгінальнае (і, між іншым, недарагое) аздабленчае рашэнне для шэрага паркана, які побач з вежай выглядаў не надта гарманічна. Цяпер ён упрыгожаны графіці — прычым, як ні дзіўна, на рыцарскую тэматыку.

Ці знойдзе гэты фэст працяг у стварэнні анімацыйных праграм, сказаць пакуль цяжка. Сёння філіял Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея прапануе наведвальнікам толькі стандартную экскурсію, а пашырэння прэйскуранту за кошт увядзення новых, арыгінальных, платных паслуг няма нават у планах.

Зрэшты, пакуль на нястачу турыстаў вежы скардзіцца не выпадае. Як адзначылі ва ўстанове, за мінулы год аб'ект наведала 22 тысячы турыстаў, прычым сюды завітваюць вандроўнікі з розных краін — у тым ліку і вельмі ад нас далёкіх.

Сёння вежа ператварылася ў сапраўдны брэнд Камянца, сімвал свайго краю. Такая роля можа быць пад сілу і многім іншым помнікам беларускага дойлідства…

Аквапарк маёнтку не канкурэнт

Адзін старшыня райвыканкама, з гонарам распавядаючы аб захадах па добраўпарадкаванні, тут жа, аднак, дадаў: "Ну, вядома, пакуль у нас не так, як у Пружанах…" І сапраўды: гэты гарадок ужо не першы год лічыцца эталонам дагледжанасці. Аднак стан двух помнікаў спадчыны, што месцяцца ў яго ваколіцах, узорным пакуль не назавеш.

Зрэшты, прамых канкурэнтаў у ваколіцах "шляхецкі" тураб'ект не мае, і ў бліжэйшай будучыні яны не прадбачацца. Аквапарк, у сваю чаргу, маёнтку не канкурэнт. Наадварот, гэтыя патэнцыйныя складнікі маршруту могуць "працаваць у комплексе".

Але асаблівая спешка ў справе рэстаўрацыі сядзібы "Лінова", мабыць, і не патрэбна: тэхнічны стан палаца Трымбіцкіх дазваляе яму чакаць не адзін год. І, зважаючы на дынаміку развіцця як Пружаншчыны, так і краіны ў цэлым, час на яго баку.

Аднак толькі пры адной умове — элементарных, але няспынных захадаў па захаванні гэтага помніка спадчыны. Некаторыя мясцовыя жыхары не лічаць за грэх браць тое, што здаецца ім "нічыйным", і таму палац ні ў якім выпадку не павінен ствараць падобнае ўражанне. Гэтаму, дарэчы, спрыяе нават проста наяўнасць ахоўнай дошкі. А прадугледжаныя заканадаўствам затраты на захоўванне помніка потым шматкроць акупяцца — пры складанні каштарысу на рэстаўрацыю.

Сумны прыклад таго, чым не павінен стаць гэты гмах, можна сустрэць літаральна тут жа: правае крыло палаца, якое, відавочна, было закінута далёка не сёлета і ўжо пазбаўлена даху, планамерна ператвараецца ў руіну…

Уласнік знайшоўся, а гаспадар?..

Праз паўгадзіны руху паўз жывапісныя палі мы аглядалі яшчэ адзін прыклад шматгадовай безгаспадарчасці. Асноўная частка класіцыстычнага палаца Дзяконскіх у вёсцы Каштанаўка даўно нагадвае антычныя руіны: яе дах абрынуўся долу некалькі дзесяцігоддзяў таму, і ў колішніх пакоях буяе хмызняк. Але праваму крылу пашчасціла больш: яно захавала свой пазнавальны выгляд, хаця цяпер таксама закінутае ды занядбанае.

Нейкі жартаўнік накрэмзаў на пашарпаным муры слова "Рэстаран". Жарты жартамі, але ў "панскай" піўніцы, якая добра захавалася і па сёння, такая ўстанова выглядала б цалкам да месца. З задавальненнем уратаваліся б там ад сквару і мы. Але спусціцца долу па слізкіх прыступках усё ж не наважыліся, хаця дзверы ў сутарэнні былі гасцінна адкрыты — нібы спецыяльна для аматараў прыгод і рызыкі. Пра іх магчымыя наступствы мала хто думае...

У графе "Уласнік" пераліку "маёнткаў на продаж", створанага Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь, насупраць каштанаўскай сядзібы напісана: "Безгаспадарная". Якім чынам помнік спадчыны займеў гэты "пачэсны" статус, застаецца толькі здагадвацца. Ды, на шчасце, ужо сёння можна ўнесці ў гэтую графу карэктывы.

— Пытанне ўжо вырашана, і сядзіба перададзена на баланс муніцыпальных улад, — адзначыў Канстанцін Панімаш. — Што да новага гаспадара, здатнага ўкласці туды грошы... Тут таксама ёсць пэўныя зрухі.

Да сядзібы ў Каштанаўцы прыглядаецца такое магутнае прадпрыемства, як РУП "Брэстэнерга". Але перш чым яна зменіць уласніка, належыць вырашыць звыклую для падобных аб'ектаў праблему: адсутнасць дакументацыі, неабходнай для заключэння любога пагаднення.

— Зразумела, што калі сядзіба не мела гаспадара, укладаць прыстойныя грошы ў стварэнне дакументацыі папросту не было каму, — кажа намеснік старшыні райвыканкама, які выявіў добрую абазнанасць у справе аховы спадчыны. — І сёння мы ўжо вырашаем гэтую праблему…

Між іншым, цікавасць да сядзіб краю выяўляюць не толькі энергетыкі. Не так даўно на адрас Пружанскага райвыканкама прыйшоў незвычайны факс: арганізацыя, якая называе сябе "тэатр-студыя" і мае прыгожае антычнае імя, выказала інтарэс у адраджэнні старадаўніх сядзіб краю. У кабінетах мясцовай улады ініцыятыва была ўспрынята самым лепшым чынам, але...

— Дарэчы, а ці ведаеце вы што пра гэтую тэатр-студыю? — асцярожна запытаў нас Мікалай Кудравец.

Мы пра яе чулі ўпершыню. Спробы навесці даведкі вынікаў не далі: сайт арганізацыі сёння не працуе, рэцэнзіі на спектаклі "тэатра-студыі" адшукаць не ўдалося. Затое інфармацыйны рэзананс, выкліканы іншым напрамкам дзейнасці рупліўцаў, атрымаўся даволі гучны. Ахвотнікі стаць тэлевядучымі або аператарамі арганізавалі ў Інтэрнеце своеасаблівую кампанію, каб вярнуць свае грошы за курсы, якіх, паводле іх слоў, не было.

Адсюль заканамерна ўзнікаюць адразу два пытанні. Ці выпадае чакаць ад "тэатра" з такой рэпутацыяй добрай "ігры" на новай для яго "сцэне" — у нялёгкай справе адраджэння спадчыны? І ці можна распрацаваць механізмы, здатныя адрозніць рэальныя бізнес-праекты ад авантурных пражэктаў? Апошняе асабліва актуальна для тых сядзіб, якія будуць перадавацца прыватнікам, лічы, задарма — зважаючы адно на іх добрыя намеры.

...Несумненны фактар турыстычнага патэнцыялу маёнткаў у Інтэрнацыянальным і Каштанаўцы — іх выгоднае геаграфічнае становішча. І да Пружанаў, і да чыгуначнай станцыі адтуль — лічаныя кіламетры. Але пры гэтым, шпацыруючы ў засені ацалелых лістоўніц, там можна адчуць няспешны рытм вясковага жыцця, які натхніў на шэдэўры многіх класікаў.

Ды ўсё ж адраджэнне гэтых сядзіб перадусім патрэбна нават не схільным да рамантыкі турыстам, а самім жыхарам абедзвюх вёсак. Нават беглага позірку дастаткова, каб канстатаваць, што пры цяперашніх варунках перспектывы яны маюць невясёлыя. І з'яўленне там аб'ектаў турінфраструктуры — ці не адзіная сіла, здатная даць ім "другое дыханне", адкрыць новую старонку ў іх гісторыі. Дарэчы, першая пісьмовая згадка пра тую ж Каштанаўку датуецца ажно 1563 годам!

Пленэры пад вокнамі школы

У Пружанах мелі трохі вольнага часу на адпачынак. Пытанне, дзе яго правесці, нават не паўстала: дагледжанай вуліцай рушылі да былой сядзібы Швыкоўскіх — Пружанскага палацыка. Звышарыгінальны будынак, бы канструктар, складзены архітэктарам Ланці з рознавялікіх аб'ёмаў, па-ранейшаму атачае прыгожы парк. А ў флігелі размясцілася мастацкае аддзяленне Дзіцячай школы мастацтваў — каб юным жывапісцам не даводзілася нікуды выбірацца на пленэры.

— У былыя часы чаго толькі ў палацы ні было: і нейкая бухгалтэрыя, і зубапратэзныя кабінеты... — згадвае Канстанцін Панімаш. — Але пасля таго, як сядзіба стала музеем, яна ператварылася ў сапраўдны цэнтр культурнага жыцця Пружанаў. Сёння ніводная дэлегацыя не абмінае яго ўвагай…

Сёлета ў музеі была завершана пастаянная экспазіцыя. У дадатак да яе, тут ладзяцца не толькі зменныя выстаўкі, але і сустрэчы з пісьменнікамі, паказы моды, камерныя канцэрты на тэрасе... Зрэшты, падрабязна апісваць дзейнасць музея няма сэнсу: інфармацыя пра новыя падзеі рэгулярна трапляе на электронную пошту "К", а адтуль — і на старонкі выдання. Да таго ж, гэтая раённая ўстанова мае адзін з лепшых у "сваёй намінацыі" сайтаў.

Чаго бракуе ў старым парку — дык гэта заціснай кавяранькі. Але, па словах Канстанціна Панімаша, канцэпцыя далейшага развіцця музейнай установы прадугледжвае яе стварэнне. На тэрыторыі сядзібы плануецца разгарнуць цэлы комплекс, куды ўвойдуць карчма, гатэльчык, месца для продажу сувеніраў... А таксама адбудаваная аранжарэя — даніна павагі ўладальніку палаца Валенцію Швыкоўскаму, які быў апантаным батанікам і вырошчваў там нават пальмы ды апельсінавыя дрэўцы.

Сёння парк ужо не настолькі багаты экзотамі, як у часы Швыкоўскага. Але няма ніякага сумневу ў тым, што даробак гэтага шляхціча спазнаў найлепшы лёс з усіх магчымых. Ды, на жаль, у кожнай сядзібе ўстановы культуры не створыш...

Палац Дзяконскіх у Каштанаўцы. Перспектыва для гэтых муроў знойдзена.

"Лінова" ў спіс "сядзіб на продаж" трапіць не паспела...

нібы не праяўляецца, але...

"Ажыўленне" муроў

Шлях да Ружанаў варты асобнай згадкі ў "дзённіку" велавандроўкі. Вёскі ды жытнія палі паабапал дарогі саступаюць месца лясным гушчарам — добрыя 20 кіламетраў шаша праразае Ружанскую пушчу. Нас няспынна абганялі самазвалы, бетонамяшалкі ды іншыя спецыфічныя віды транспарту. Гэта — прыкметы той вялікай будоўлі, якая папярэднічае наданню былой рэзідэнцыі Сапегаў статуса аграгарадка.

Сам палацавы комплекс здатны сур'ёзна ўразіць кожнага, хто не быў тут які год-два. Яго "візітоўка" — уязная брама — не выглядала гэтак шыкоўна ўжо гадоў мо дзвесце, а на правым флігелі яшчэ а дзевятай вечара працягваліся аздабленчыя работы (яны маюць завяршыцца ўжо да канца месяца). Паралельна з імі, распрацоўваецца і канцэпцыя музейнай экспазіцыі.

Уязная брама ў палац Сапегаў у Ружанах выглядае шыкоўна: на яе рэстаўрацыю было выдаткавана больш за два мільярды рублёў.

Убачанае здзівіла нас яшчэ і таму, што пра ўключэнне гэтага аб'екта ў Рэспубліканскую інвестыцыйную праграму нам чуць не даводзілася. Пачатак рэстаўрацыі адной з найбольшых турыстычных адметнасцей Беларусі — ініцыятыва, праяўленая "на месцы".

— На сёння там асвоена ўжо больш за два мільярды рублёў, і толькі нязначная частка тых сродкаў была атрымана з абласнога бюджэту, — распавядае Мікалай Кудравец. — Мы шукаем розныя крыніцы фінансавання: гэта і райбюджэт, і ахвяраванні прадпрыемстваў, і крэдыты, і нават сродкі ад правядзення суботнікаў...

Заходні флігель пакуль што кантрастуе са сваім шыкоўным сабратам: ён па-ранейшаму ў руінах. Але, як адзначыў намеснік старшыні райвыканкама, праектная дакументацыя ўжо падрыхтавана і праходзіць экспертызу.

— Тое, што вы бачылі ў Ружанах — гэта толькі пачатак рэстаўрацыі, — пракаменціраваў галоўны спецыяліст упраўлення культуры Брэсцкага аблвыканкама Леанід Несцярчук. — У планах таксама — аднаўленне знакамітага сапегаўскага тэатра, аркады... Агульны каштарыс складае прыблізна 17,5 млрд. рублёў…

Сам палац Сапегаў пакуль што плануецца толькі закансерваваць: яго рэстаўрацыя патрабуе велізарных сродкаў. Але... Як адзначыў Леанід Несцярчук, у залежнасці ад варункаў, планы могуць і змяніцца. Заяўка аб уключэнні аб'екта ў Рэспубліканскую інвестыцыйную праграму ўжо пададзена. Ды і палац Пуслоўскіх, які "суседнічае" з Ружанамі ў большасці турмаршрутаў, сёння паспяхова аднаўляецца за кошт рэспубліканскага і абласнога бюджэтаў.

— Знаходзіць грошы ў межах раёна нам вельмі цяжка, і я баюся, што ажыццявіць задуманае ўласнымі рэсурсамі мы не здолеем, — кажа Мікалай Кудравец. — Тым больш, рэстаўрацыйныя расцэнкі вельмі высокія, і, на жаль, яны не заўсёды адпавядаюць якасці выкананых работ падрадчыка, які ў нас працуе…

Першая музейная экспазіцыя адкрыецца ў палацы задоўга да завяршэння работ. Адпаведна, помнік спадчыны пачне прыносіць і першыя платныя паслугі. Сёння плату за ўваход на яго тэрыторыю браць няма каму.

Зрэшты, хочацца верыць, што банальнымі "білецікамі" справа не абмяжуецца. Дырэктар Ружанскага дома культуры, дэпутат гарсавета і проста патрыёт свайго мястэчка Аляксандр Барысевіч марыць пра той час, калі палац стане сапраўдным культурным цэнтрам Ружанаў. І — выношвае ідэі па "ажыўленні" старых муроў:

— Я даўно перакананы ў тым, што тут павінен праходзіць свой фестываль, з арыгінальнай канцэпцыяй, — кажа ён. — Планавалі ўжо сёлета распачаць гэтую традыцыю, але... пакуль не далі рады. Калі ў Доме культуры ідзе рамонт, я жыву паводле графіка будаўнічых работ…

Фестываль мае грунтоўную культуралагічную ідэю: адкрыць для сучаснай моладзі багацце праваслаўнай культуры песняспеваў. Балазе яшчэ адзін ініцыятар імпрэзы — настаяцель Петрапаўлаўскай царквы айцец Аляксандр ужо здолеў добра паразумецца з новым пакаленнем ружанцаў і заваяваць сярод яго аўтарытэт.

...Зразумела, што рэстаўрацыя такога аб'екта, як рэзідэнцыя Сапегаў, можа выклікаць нямала навукова-метадалагічных цяжкасцей. Але Леанід Несцярчук упэўнены, што ўсе яны — вырашальныя. Бо галоўны фактар поспеху ў дадзеным выпадку — навідавоку.

— Душа і сэрца любога такога пачыну — рупнасць мясцовых улад, — безапеляцыйна сцвярджае ён. — На жаль, ёсць кіраўнікі, якія не ведаюць і не ўсведамляюць каштоўнасці сваёй спадчыны. Яны не толькі не праяўляюць уласную ініцыятыву, але нярэдка і паралізуюць тыя захады, што мы робім на абласным узроўні. Таму высакародная пазіцыя старшыні Пружанскага райвыканкама Аляксандра Юркевіча, які не спалохаўся аніякіх цяжкасцей і распачаў вялікую справу, вартая шчырага захаплення і паўсюднага пераймання. І, вядома, нельга не адзначыць тую ўвагу, якую надае ружанскай рэзідэнцыі — ды і раёну ў цэлым — старшыня Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь Пётр Пракаповіч.

Даход ад турызму — хіба "на марожанае"...

Непадалёк ад брамы з гербам Сапегаў пабачылі двух хлапчукоў, якія правялі для нас якепскую "экскурсію" і заслужана атрымалі "на марожанае". На жаль, гэта была адзіная праява турінфраструктуры, сустрэтая намі ў Ружанах…

Сябры прасілі нас "разведаць" месцы начлегу ў гэтым мястэчку, маючы цвёрды намер яго наведаць. Але... Як выявілася, адзіны гатэльчык не так даўно быў набыты прыватнікам і цяпер рамантуецца. Ды нават яго з'яўленне наўрад ці кардынальна вырашыць праблему: нават стандартная тургрупа там не змесціцца.

Запытваючы мясцовых жыхароў, ці адчуваюць яны хаця б трохі "сіндром турцэнтра", паўсюдна атрымлівалі адмоўны адказ. Госці аглядаюць палац — і далей едуць сваім шляхам, бо затрымацца ў мястэчку ім пакуль няма дзе — хай сабе проста дзеля добрага абеду. Хаця жаданне, напэўна, узнікла б у многіх. Бо, апрача ўласна палаца, у Ружанах захавалася і мноства іншых адметнасцей, што, у комплексе, і ствараюць тую атмасферу даўніны, у пошуках якой айчынныя турысты зазвычай выпраўляюцца за мяжу.

Як і ў часы Сапегаў, архітэктурнымі дамінантамі ружанскай плошчы з'яўляюцца вежы двух храмаў. Чатырох'ярусная званіца Траецкага касцёла надае абрысам мястэчка стромкую выразнасць. Святыня, якая размяняла ўжо пятае стагоддзе гісторыі, не мае на сваіх мурах яе кідкіх "адмецін" — яна цешыць вока яркай свежай тынкоўкай. Ды і на фасадзе баракальнай Петрапаўлаўскай царквы, што была збудавана ў XVIII стагоддзі, акурат ідуць "касметычныя" работы.

На жаль, яшчэ адзін тыповы для беларускіх мястэчак культавы будынак вока пакуль не радуе. Велічная некалі сінагога ўжо доўгі час стаіць закінутая, з прагнілым дахам, які восьвось, падаецца, абрынецца. Скрозь вялізны прагал у муры відаць рэшткі аздаблення інтэр'ера, адкрытыя для ўсіх стыхій...

Канстанцін Панімаш у нашай гутарцы сам закрануў тэму гэтага помніка спадчыны, адзначыўшы, што знайсці для яго новага ўласніка пакуль не ўдалося, — хаця пэўныя намаганні мясцовыя ўлады ўжо рабілі. Зрэшты, падобная сітуацыя характэрная для многіх узораў гэтага "звышпраблемнага" тыпу культурных каштоўнасцей.

Але ж гэта не нівеліруе значнасць такіх помнікаў для нас, сучаснікаў, — хутчэй, наадварот. Закінутая сінагога — ці не апошні матэрыяльны напамін пра цэлы пласт гісторыі Ружанаў. Калі той напамін знікне, без яго гісторыя мястэчка будзе няпоўнай.

Тым болей, гэты будынак важны і для гісторыі яўрэйскага народа. Калісьці яго наведваў юны Іцка Езярніцкі — будучы ўтрапёны змагар за незалежнасць Ізраіля, а потым і яго Прэм'ер-міністр Іцхак Шамір. Дарэчы, ягоным папярэднікам на гэтай пасадзе быў Менахім Бегін з Брэста, а наступнікам — Шымон Перэс з Вішнева.

Уласна, гэта мы да таго, што ружанская сінагога ў перспектыве можа стаць ключавым аб'ектам паказу спецыфічнага турмаршруту. На айчынным рынку ён пакуль толькі ў планах, а ў нашых суседзяў — даўно працуе. Але перш-наперш гэты помнік спадчыны патрабуе кансервацыі.

Стан капліцы Святога Казіміра, збудаванай адначасова з замкам архітэктарам Янам Бекерам, таксама далёкі ад ідэальнага, але вецер там не гуляе. Каталіцкая парафія не мае рэсурсаў для рэстаўрацыі храма — як не мае і патрэб у ім для правядзення набажэнстваў, аднак парадак там падтрымліваецца.

Кляштар місіянераў у Лыскаве сёння занядбаны...

Мабыць, менавіта ў гэтым зацішным кутку, на старых могілках, куды амаль ніхто з турыстаў не дабіраецца, лепш за ўсё можна адчуць дух і філасофію старадаўняга мястэчка, углядаючыся з высокага схілу на яго краявід. Але ўрэшце наспявае час спусціцца долу. Ружанскія вуліцы не надта радуюць увечары сваёй утульнасцю: там цёмна, ды і яміны трапляюцца. Праблемы ў сферы добраўпарадкавання мястэчка назапашваліся дзесяцігоддзямі. Затое цяпер яны маюць вырашыцца за лічаныя гады.

Пра выгоды, якія можа прынесці ў іх край развіццё турызму, ружанцам распавядаць ужо не трэба. Пасля таго, як непадалёк ад мястэчка адкрыўся ці не самы сучасны на Беларусі дзіцячы санаторый, актуальная для малых гарадоў праблема з працаўладкаваннем была практычна вырашана.

Фрэскі на аблупленай тынкоўцы

Ад Ружанаў да наступнага пункта нашай вандроўкі — сядзібы ў Падароску — усяго якая гадзіна язды па добрай шашы. Мы, аднак, трацім утрая болей часу, каб патрапіць у Лыскава, бо тамтэйшая адметнасць — колішні кляштар місіянераў — вартая спальвання дадатковых калорый.

Праўда, відовішча гэта даволі сумнае. Велічны баракальны касцёл сёння ператвараецца ў велічныя руіны. Унутры яго ўжо паспеў вырасці цэлы гай, і нават на самым версе красуюцца бярозкі ды рабіны. Храм стаіць без даху не першае дзесяцігоддзе, але старыя муры ўпарта змагаюцца са згубным уздзеяннем навакольнага асяроддзя. Нейкім дзіўным чынам яны нават захавалі частку фрэсак і шыкоўнай некалі ляпніны. Дый ці доўга яшчэ пратрывае тое хараство?

— Што рабіць з гэтым цудоўным помнікам архітэктуры мы, па шчырасці, не ведаем, — са скрухай канстатаваў Мікалай Кудравец. — Райбюджэт яго рэстаўрацыю не пацягне, а разлічваць на мясцовых каталікоў, на жаль, не выпадае: у вёсцы іх добра калі дзесяць сем'яў. Таму ў бліжэйшай перспектыве плануем хіба закрыць вокны і дзверы: знаходжанне ў такім будынку можа быць небяспечным. Што да перспектывы далёкай... Хочацца верыць, што некалі ў гэтым намоленым месцы адродзіцца кляштар…

Побач з вялікай адметнасцю — яшчэ і малая: магіла знанага паэта-сентыменталіста Францішка Карпінскага. Яе дагледжанасць красамоўна сведчыць за тое, што пасільную працу па ахове спадчыны мясцовыя ўлады робяць не на словах.

Ад Ружанаў да Лыскава — якіх 20 кіламетраў, але сёння тураўтобусы туды не збочваюць: разбітую гравійку іх кіроўцы не любяць. Але ўжо неўзабаве праблема вырашыцца: літаральна ля муроў касцёла будзе праходзіць аб'язная шаша вакол Белавежскай пушчы. І магчыма, што менавіта ўвага турыстаў стане "рухавіком" аднаўлення храма — як тое ўжо было з іншымі помнікамі спадчыны...

(Заканчэнне будзе.)

Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Ілля СВІРЫН, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ, нашы спецыяльныя карэспандэнты

Сон пра касачы

"Рай" паводле Паўла Марціновіча

У Любанскім музеі традыцыйных народных промыслаў і рамёстваў — філіяле раённага Музея Народнай славы — адбылася прэзентацыя выстаўкі работ мясцовага самадзейнага мастака Паўла Марціновіча. Падзея сабрала родных і блізкіх Паўла Яўхімавіча, а таксама тых, хто добра ведаў гэтага таленавітага чалавека.

І па сёння інтэр'еры некаторых хат вёсак Засмужжа, Рачэнь, Обчын, Закальное, Шыпілавічы ды іншых упрыгожваюць дзівосныя маляваныя дываны. Яны літаральна выпраменьваюць яркія фарбы, радуюць вока выявамі юнакоў і дзяўчат. Маладзейшыя, тыя, каму такое багацце перайшло ў спадчыну ад бабуль і дзядуль, мабыць, і не ведаюць, што гэтыя работы належаць пэндзлю іх земляка.

Павел Марціновіч пачаў маляваць дываны ў 1930-я. Пачатковыя навыкі валодання пэндзлем і фарбамі ён атрымаў на школьных уроках. Пасля дзейнічаў, як кажуць, па сваім разуменні: спецыяльная літаратура ў вясковай бібліятэцы адсутнічала, не было побач і таго, хто мог бы нешта падказаць. Магчыма, таму мастак не да канца спасціг законы перспектывы. З гэтай прычыны жывапіснасць у ягоных работах нярэдка саступала размалёўцы.

Але мастацкая мова Марціновіча вызначалася метафарычнасцю. Ён меў прастадушнасць мыслення, далікатнае ўменне глядзець на жыццё вачамі дзіцяці, кранальную даверлівасць стылю. Гэта і кампенсавала недахоп прафесіяналізму, зачароўвала, вабіла, прыцягвала…

Асаблівы росквіт творчасці Паўла Марціновіча прыпаў на 1950-я гады. Попыт на маляваныя дываны быў вялікі. Заказчыкі, найчасцей — жанчыны ды дзяўчаты, прыязджалі да мастака з самых аддаленых вёсак раёна. Родныя і сябры везлі тыя "райскія" карцінкі ў Мінск, Барнаул, Калінінград, на Урал.

Які ж ён, рай, па версіі Паўла Марціновіча? Гэта маляўнічае возера ў зацішку, на дальнім беразе яго патанаюць у аблоках вяршыні гор, асветленыя промнямі заходзячага сонца. Ля самай вады, на выспе, стаіць у пышным кветніку белы палац: ад высокага ганка са стромкімі калонамі ўніз збягаюць прыступкі. Вакол растуць танюткія бярозкі, а паміж імі — ружы, рамонкі, астры, лубін, касачы ды іншыя дзівосныя кветкі. Гэты рай заселены каханнем.

Вядомы пяць сюжэтаў, да якіх часцей за ўсё звяртаўся Павел Яўхімавіч, малюючы дываны. І ўсе яны так ці інакш звязаны з воднай стыхіяй. Надта любіў маляваць Марціновіч і нацюрморты з кветак, або, як іх называе мясцовы люд, макаткі…

…У 1980-м Паўла Яўхімавіча не стала. Хто ведае, можа яго душа якраз і трапіла ў рай, у той фантастычны свет, які ён сам і прыдумаў, у "Маляваныя сны Паўла Марціновіча" (так называецца выстаўка работ засмужца)?.. Але імя мастака пачало паступова забывацца. Вярнуць яго з нябыту ўдалося дзякуючы, найперш, намаганням вядомага мясцовага фалькларыста, супрацоўніка раённага Цэнтра культуры Сяргея Выскваркі. Матэрыял для экспазіцыі збіралі па крупінках. Некалькі маляванак пазычылі (бо і цяпер дужа даражаць імі) для выстаўкі жыхары вёсак раёна.

Шмат цікавых штрыхоў да партрэта мастака дадалі на прэзентацыі Уладзімір Ціхаеўскі, што добра ведаў Марціновіча (у маладосці Уладзімір Аляксандравіч загадваў клубам, дзе часцяком рэпеціраваў і спяваў Павел Яўхімавіч), аднавяскоўка Соф'я Статкевіч, унук мастака Юрый Кукраш. Дарэчы, апошні падарыў музею адну з работ свайго дзеда.

Сяргей КВІТКЕВІЧ
На здымках: унук мастака Юрый Кукраш (справа) перадае музею твор дзеда; маляванка засмужскага майстра.

Галоўны мастак Мышкавічаў

Некалькі дзесяткаў гадоў таму трапіў у Мышкавічы Аляксандр Гацко — мастак, дызайнер, педагог.

Аляксандр Сямёнавіч скончыў Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут, з гатоўнасцю змяніў сталічнае жыццё на шчаслівы вір мышкавіцкага творчага клопату і ніколі пра гэта не шкадаваў. Займаўся ландшафтным дызайнам, стварыў лагатып "Рассвета" і праект помніка для Мемарыяльнага комплексу ў Борках, нястомна маляваў і вучыў гэтаму мясцовую дзятву.

Цяпер Аляксандр Гацко — загадчык мастацкага аддзялення Мышкавіцкай ДШМ. Ягоныя выхаванцы — дыпламанты жывапісных конкурсаў у Венесуэле, Індыі, Чэхіі, Славакіі… Многія выпускнікі аддзялення звязалі свой лёс з мастацтвам. А Аляксандр Гацко застаецца нязменным "галоўным мастаком" Мышкавічаў, знаўцам дзіцячай душы і захавальнікам прыгожага.

Андрэй СТАРЖЫНСКІ
На здымку: Аляксандр Гацко.

Гісторыя адной "Мелодыі"

Ансамблю народных інструментаў "Мелодыя" Баранавіцкай музычнай школы № 1 — дзесяць гадоў. З гэтай нагоды ва ўстанове адбыўся канцэрт.

Музыканты чарговы раз прадэманстравалі дакладнасць ансамблевай ігры, філіграннасць яе адценняў. Гучалі арыгінальныя творы і апрацоўкі П.Піцыгоні, Я.Глебава, А.Цыганкова, С.Сіроціна, М.Маліноўскага.

Удзельнікі "Мелодыі" — настаўнікі музычнай школы. Мастацкі кіраўнік калектыву — выкладчык установы Леанід Равуцкі. Нарадзіўся ён у Баранавічах. У 1967 годзе скончыў тут музычную школу, потым — Мінскае музычнае вучылішча. На працу быў накіраваны ў Талачын, адсюль яго прызвалі ў войска. Пасля навучаўся ў сталічнай Кансерваторыі (клас Роберта Назаранкі). Вучыў дзяцей граць на баяне ў Салігорску. Шасцёра выхаванцаў Равуцкага сталі ў розныя гады лаўрэатамі конкурсу імя І.Жыновіча. А вучань Максім Ракач на Міжнародным конкурсе выканаўцаў на акардэоне і баяне ў Германіі атрымаў Першую прэмію. За сваю працу выкладчык-баяніст Леанід Равуцкі быў узнагароджаны ордэнам "Знак Пашаны".

У 1999-м Равуцкі вярнуўся ў Баранавічы. Пачалася гісторыя "Мелодыі"…

Валерый ПАЛІКАРПАЎ
Баранавічы
На здымках: ансамбль "Мелодыя" Баранавіцкай ДМШ № 1.

Каб дрэва зелянела…

Для выхаванцаў летніка "Папараць-кветка" была праведзена акцыя "Наш хлеб духоўны — дабрыня".

Дабрыня — галоўная рыса чалавечнасці. Ісціна гэтая падмацоўвалася вершамі і прыпавесцямі, легендамі і нявыдуманымі гісторыямі, якія вобразна-эмацыянальна прадставіў Тэатр аднаго акцёра "Жывое слова" Бярэзінскай ЦБ. Адзін з заклікаў агіт-марафона: "Не шкадуйце добрых слоў для мамы!".

Завяршыла агіт-марафон легенда пра тое, што з нараджэннем чалавека Усявышні дасылае яму з неба душу, а каб яна даляцела да зямлі, прымацоўвае да душы маленькае зярнятка. Дзе чалавек нарадзіўся, там яно і прарастае, і з часам ператвараецца ў вялікае дрэва. Каб яно расло, чалавеку трэба рабіць добрыя справы, радаваць людзей.

Тамара КРУТАЛЕВІЧ,
загадчык аддзела маркетынгу Бярэзінскай ЦБ

"Мабільныя" напевы

На пасадзе загадчыка аўтаклуба працую з лістапада. Мне падабаецца гэтая справа: мабільнасць установы дазваляе штотыднёва сустракацца з новымі, але нязменна ўдзячнымі вясковымі жыхарамі Петрыкаўшчыны.

Так, з канцэртнымі праграмамі выязджаем на раён, згодна з графікам, кожны тыдзень. Каб выступленні нашы былі больш якаснымі, стварылі пастаянную арт-брыгаду "Народныя напевы". Увайшлі ў яе самадзейныя артысты Валянціна Бабіч, Ганна Несцярчук, Клаўдзія Міхалевіч, Вольга Шуляк, акампаніятар-акардэаніст Мікалай Язерскі. У рэпертуары "Народных напеваў" — не толькі беларускія і рускія вакальныя творы, але і жартоўныя вершы, байкі, тэатралізаваныя сцэнкі.

Аўтаклуб укамплектаваны неблагой гукаўзмацняльнай апаратурай з мікрафонамі. На набыццё гэтага "начыння" наш аддзел культуры выдаткаваў больш за мільён рублёў. Таму маем магчымасць выступаць не толькі ў маленькіх клубах, але і на мехдварах і жывёлагадоўчых фермах. Нярэдка разам з "Народнымі напевамі" едуць да вяскоўцаў ідэолагі, урачы, аптэкары, страхавыя інспектары…

Пасля нашых "гастролей" у вёсцы Івашкавічы загадчык мясцовай бібліятэкі-клуба Надзея Коржык зазначыла, што артысты зачаравалі сяльчан звонкімі і чыстымі галасамі. А ў той дзень нас яшчэ чакалі вяскоўцы ў Першай Слабодцы…

Днямі "Народныя напевы" пабывалі ў Брынёве, дзе ладзілася Свята вёскі. І, як заўжды, было шмат кветак і апладысментаў.

Таццяна ПІНЧУК, загадчык аўтаклуба аддзела культуры Петрыкаўскага райвыканкама
На здымку: выступаюць "Народныя напевы".

"Світанак" па-над Шаркаўшчынай

З 1993 года пры Шаркаўшчынскім раённым доме культуры дзейнічае народнае літаратурна-музычнае аб'яднанне "Світанак", куды ўваходзяць пятнаццаць чалавек розных узростаў і прафесій. Нязменным кіраўніком калектыву з'яўляецца Кацярына Сосна — член Саюза журналістаў Беларусі, член Саюза пісьменнікаў Беларусі, аўтар шэрагу кніг.

"Світанкаўцы" — актыўныя ўдзельнікі ўсіх мерапрыемстваў, што праводзяцца ў раёне і за яго межамі, а таксама — традыцыйныя госці святкаванняў з нагоды Дня беларускага пісьменства. Добра ведаюць іх і ў вобласці. Так, летась удзельнікі аб'яднання былі ўзнагароджаны дыпломам Віцебскага абласнога навукова-метадычнага цэнтра народнай творчасці і культасветработы за актыўны ўдзел у абласным аглядзе-конкурсе "Які цудоўны гэты свет!", а таксама дыпломам Першай ступені абласнога фестывалю "Смяяцца — не грэх".

За час існавання "Світанку" яго ўдзельнікі выпусцілі калектыўны зборнік "Шаркаўшчынскаму краю", а член аб'яднання Міледзі Кукуць напісаў для раённага народнага хору "Спадчына" твор "Шаркаўшчынскі край". Шмат удзельнікаў паспелі выдаць за гэты час свае зборнікі прозы і паэзіі: ёсць яны ў Віктара Лагуна, Таццяны Еўдаковай, Ірыны Тарбецкай.

У 2002 годзе літаратурна-музычнаму аб'яднанню было прысвоена званне "Народны самадзейны калектыў". У далейшых планах "світанкаўцаў" — выдаць яшчэ адзін калектыўны зборнік паэзіі.

Юрась ГАРЧАК

Праекты “ноў-хаў” і трукі без “копій”

Чатыры зменныя арэны: падлога для эстрадных шоу, класічны манеж, танцавальны паркет, лядовы пляц… Купал вышынёй 18 метраў, мабільны басейн, асобны манеж для рэпетыцый… Гаворка — пра абноўлены будынак Беларускага дзяржаўнага цырка, які неўзабаве адкрые свае дзверы для гледачоў. “Літаральна 1 верасня распачынаецца першы этап перасялення калектыву ў новы будынак, — адзначае галоўны рэжысёр установы Сяргей (а ў творчых колах — Серж) БАНДАРЧУК, — і мы не можам дачакацца, калі, нарэшце, скончацца нашы “вялікія пярэбары”.
Што ж прапануе айчынны цырк у адноўленым антуражы? Ці дыктуюць змены высокія тэхналогіі? Што, увогуле, сёння ўяўляе з сябе цырк як культурная індустрыя і бізнес-прадпрыемства? “К” вырашыла пагутарыць з галоўным рэжысёрам установы Сяргеем Бандарчуком аб тым, якім яму бачыцца шлях Белдзяржцырка.

Цырк, узняць ветразі!

— Серж, ды ўсё ж якім паўстане перад намі стары цырк?

— Старым яго ўжо не назавеш: ён сучасны, высокатэхналагічны, яркі… Першапачаткова гаворка ішла толькі пра абнаўленне будынка. Але цяпер можам сказаць: ён зведаў глабальную рэканструкцыю, і ад старога там засталіся, бадай, толькі апорныя канструкцыі.

Праекціроўшчыкам і архітэктарам давялося нялёгка: перад імі была пастаўлена задача стварыць адзін з лепшых цыркаў у свеце. Гэта, насамрэч, надзвычай складанае заданне, з вялікай доляй рызыкі, бо існавалі пытанні, якія ўвогуле было невядома як вырашаць. Колькі сёння ў свеце існуе стацыянарных цыркаў? Пералічыць можна па пальцах адной рукі. Далучыце да гэтага ўвядзенне новых тэхналогій — зусім іншыя патрабаванні, адрозны ад ранейшага комплекс задач. Як усё спалучыць так, каб было прыгожа і функцыянальна?

Наш новы цырк будзе мець шмат “ноў-хаў”: па тэхналогіях і па апрацоўцы. Па-першае, што да інтэр’ераў, дэкор старога будынка захаваецца ў колішнім ампіры, але самі матэрыялы, іх якасць, вядома, цяпер будуць на зусім іншым узроўні: гэта граніт, мармур, сусальнае золата, аксаміт… Напрыклад, для гледачоў зроблены крэслы з натуральнага дрэва, абабітыя аксамітам. Крэслы, удакладню, — з падлакотнікамі, што вялікая рэдкасць. Нават перадавы расійскі цырк — імя Юрыя Нікуліна — не мае падобнай “раскошы”.

Акрамя знешніх змен, нас забяспечаць сучасным тэхнічным абсталяваннем: гэта чатыры зменныя манежы, мабільны басейн, што будзе падымацца і апускацца, новыя святло, гук… Ды яшчэ — адрамантаваны гараж, стайня, ветэрынарная клініка, кухня для жывёл, абноўлены касцюмерны цэх…

Больш за тое: акрамя новага аздаблення і тэхнічных інавацый, наша ўстанова пабагацела, бадай, на самае галоўнае — рэпетыцыйную базу: гэта другі будынак за старым гмахам. У ім ёсць усё для працы артыста: утульныя грымёркі з душавымі, манеж для рэпетыцый… Нарэшце выканаўцам не давядзецца “біцца” за месца для трэніровак. Побач размешчана гасцініца. Усё гэта вельмі важна для стварэння нацыянальнай школы, базы і, адпаведна, — павышэння ўзроўню беларускага цырка.

— Вядома, што новая форма дыктуе і новы змест. Якія змены чакаюць наш цырк з пераездам у “новыя старыя” памяшканні?

— Паўтаруся, для нас цяпер самая надзённая задача — стварыць моцную цыркавую базу. Патлумачу: колькі б прамоўтэры ні ўкладвалі ў тэхнічны антураж нумароў, галоўным усё роўна застаецца артыст. Святло, гук, пастаноўка — усё гэта, безумоўна, важна, але гэта толькі неабходны “дадатак” да таленавітага выканаўцы.

А каб “выгадаваць”, выхаваць талент, патрэбны адпаведныя ўмовы і магчымасці. У артыста трэба ўкласці вельмі шмат сіл — справа нават не ў фінансах. Гэта вельмі карпатлівая і цяжкая праца. Усё мусіць быць сканцэнтравана ў адным месцы, — і цяпер мы такое месца займеем.

Ці ёсць у Беларусі цыркавая школа? Па сутнасці, няма. Мы ведаем пра адпаведныя ў Маскве і ў Кіеве, якія выпускаюць спецыялістаў да гэтай пары — і на 90 % забяспечваюць... заходнія цыркі новымі талентамі. Мы хочам падцягнуцца ў гэтым накірунку: заснаваць сваю школу, што прапануе не толькі належную адукацыю, але і перспектывы працаўладкавання, каб выканаўцы ведалі, што тут, на радзіме, іх забяспечаць добрай зарплатай, зручнымі ўмовамі пражывання, цікавай працай. Патрэба шукаць “іншы бераг” адпадзе сама сабой.

Што да цыркавых зорак, педагогаў з замежжа… Цыркавыя артысты, — людзі сямейныя, якія перадаюць сваю справу з пакалення ў пакаленне. І часам завабіць іх працаваць у сваю ўстанову можна нават не грашыма, а — добрымі ўмовамі пражывання. Выканаўцы могуць зарабляць, скажам, у Еўропе, выступаючы ў пэўным шапіто і кватаруючы ў прыстасаваных трэйлерах, але часам хочацца адпачыць ад “палявых умоў” і пажыць некалькі месяцаў “з усімі выгодамі”. І гэты “козыр” часта спрацоўвае, калі запрашаеш кагосьці. Але, падкрэслю, новы цырк для нас, у першую чаргу, — месца для згуртавання і выхавання беларускіх цыркавых артыстаў.

— Ваша пазіцыя, Серж, зразумелая. Але які накірунак у канцэптуальным плане абярэ новы беларускі цырк: цырк відовішчаў або трукаў?..

— Безумоўна, галоўным у свеце цырка заўжды быў і застаецца — трук, якасць яго выканання. І хоць шоу — таксама неабходны складнік, без адоранага артыста, паўтаруся, цырка не існуе.

Я разумею, што маеце на ўвазе і феномен канадскага цырка “Дзю Салей”, папулярнага ва ўсім свеце. Ці будзем мы рабіць штосьці падобнае? Разумееце, калі мы створым “копію” гэтага цырка — гэта зусім не значыць, што з намі пачнуць заключаць дамовы замежныя прамоўтэры. Толькі ў адной Канадзе акрамя ўласна “Дзю Салей” працуюць чатыры падобныя прафесійныя калектывы вельмі высокага выканальніцкага ўзроўню. Копіяй сёння нікога не здзівіш. Скараць публіку патрэбна унікальным нумарам, які ніхто яшчэ да гэтай пары не бачыў. А значыць — мы зноў вяртаемся да сваёй школы. На базе яе і можа быць створана унікальная праграма. Галоўнае — кадры.

Так, будынак нашага цырка — гэта вельмі прыгожая пабудова. Ён манументальны, прэзентабельны. Такому цырку неабходна адпаведнае начынне. Таму на адкрыццё мы плануем прадставіць яскравую праграму, нават у нечым пафасную, з бляскам, каб здзівіць гледача і “падтрымаць” багемны антураж. У далейшым жа — абавязкова прывязём у Мінск еўрапейскі цырк, каб айчынны глядач атрымаў магчымасць убачыць замежных калег.

— А ці мяркуе наш цырк адмовіцца ад дрэсіроўкі жывёл?

— Наконт дрэсіроўкі жывёл — гэта асобнае пытанне. На сённяшні дзень засталося толькі некалькі краін, дзе ў цырку працуюць з жывёламі. Еўропа практычна адмовілася ад падобных атракцыёнаў, не за гарамі і закрыццё падобных нумароў у ЗША.

Мы, у сваю чаргу, будзем працаваць у гэтым накірунку, пакуль нам дазваляе грамадства. Так, мы робім стаўку на выканаўцаў, жанглёраў, паветраных акрабатаў, гімнастаў, але цырк без артыстаў-жывёл, на маю думку, гэта не цырк. Ведаеце, я неаднойчы быў на прадстаўленнях “Дзю Салей” — і не бачыў у зале дзяцей… Гэта выглядае вельмі дзіўна. І мне здаецца, што нумары з жывёламі — гэта тое, што робіць цырк жывым. Сам манеж з’явіўся ў цырку для язды на конях.

Іншая справа — знайсці людзей, якія любяць працаваць з жывёламі, могуць гэта рабіць. Апошняе ж — не так і лёгка. Я магу сёння прыдумаць такія нумары з нацыянальным каларытам, як, да прыкладу, выступленні з бусламі, з вожыкамі, з ваўкамі, але перш за ўсё мне трэба знайсці таленавітых дрэсіроўшчыкаў, якія здолелі б ажыццявіць гэтыя задумы. У артыста мусяць быць жаданне і талент, — а ўсё астатняе дадасца.

— Серж, Вы выдатна вызначылі задачы цырка як культурнай індустрыі, але ўстанова працуе яшчэ і як бізнес-прадпрыемства…

— Так, вы маеце рацыю. Калі б мы не былі бізнесменамі, дзяржава не аказала б нам такі давер. У перспектыве, безумоўна, плануем выйсці на самаакупнасць, стаць прыбытковым прадпрыемствам. Задум, як дасягнуць гэтага, у нас мноства: па-першае, — стварэнне сваёй праграмы ў стацыянарным будынку, падругое — запрашэнне еўрапейскіх зорак цырка з выступленнямі ў Мінск, па-трэцяе — запуск праекта перасоўнага цырка, які будзе даваць прадстаўленні спачатку на Беларусі, а потым у Еўропе, так бы мовіць, мабільны цырк-шапіто з эмблемай “Беларускі цырк”.

Сярод іншага, разглядаем магчымасць арганізацыі Міжнароднага цыркавога фестывалю, каб акунуцца ў цыркавое мастацтва свету здолелі ўсе.

— Да ўсяго, я ведаю і аб вашай прамоўтэрскай дзейнасці: арганізацыя канцэртаў замежных зорак не абыходзіцца без вашага ўдзелу…

— Што да прамоўтэрскай дзейнасці, тут мы выступаем даволі сціплымі партнёрамі кампаніі, якая бярэ на сябе асноўную частку працы. Але гэтая магчымасць заробку нам таксама не падаецца залішняй. З аднаго боку, прызнаюся, нельга сказаць, што, да прыкладу, канцэрт Элтана Джона быў прыбытковым, але гэта не значыць, што спрабаваць зрабіць гэты накірунак бізнесу рэнтабельным немагчыма. Так, мы прымаем удзел у запрашэнні вядучых зорак сусветнай сцэны ў Беларусь, ды ўсё ж не гэта галоўная задача. Памкненні нашы сягаюць значна далей: у стварэнне адметнага цыркавога мастацтва.

Гутарыла Дар’я АМЯЛЬКОВІЧ
Фота Юрыя ІВАНОВА

Прэзентацыя он-лайн

Першы беларускамоўны сайт, прысвечаны Міжнароднаму дзіцячаму конкурсу песні “Еўрабачанне”, з’явіўся дзякуючы супрацоўніцтву Белтэлерадыёкампаніі і Еўрапейскага вяшчальнага саюза.

Пра гэта паведаміла прэс-менеджэр конкурсу Вольга Саламаха. Матэрыялы аб ходзе конкурсу і яго ўдзельніках тут можна прачытаць таксама на рускай і англійскай мовах. Праект прэзентуе Беларусь, дае інфармацыю пра сталіцу краіны і месца правядзення конкурсу — “Мінск-Арэну”.

“Сайт — інтэрактыўны, — адзначае Вольга Саламаха. — Кожны наведвальнік можа пакінуць свой каментарый, напісаць ліст супрацоўнікам Белтэлерадыёкампаніі з водгукам або прапановай. Афіцыйную інфармацыю прадстаўляе нам ЕВС. Таксама гэты інтэрнет-праект прадугледжвае сувязь з папулярнымі сацыяльнымі сеткамі, што паспрыяе павелічэнню аўдыторыі”.

Ля самага Чорнага мора

Фестываль Саюзнай дзяржавы “Творчасць юных” праходзіць гэтымі днямі ў Анапе. Выканаўцы і калектывы з Беларусі і Расіі паказваюць сваё майстэрства дзецям, якія знаходзяцца ў шматлікіх летніках гэтага горада, што на Чорным моры.

Беларусь на фестывалі прадстаўляюць выканаўцы Кірыл Башарымаў, Настасся Купрыянава, Ганна Трубяцкая, Яніна Гінь, а таксама Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь тэатр танца “Прэм’ер-Спонайд” з Полацка, узорная студыя цыркавога мастацтва “Арэна” з Мазыра, узорны ансамбль танца “Весялушка” з Мінска, пінская ўзорная эстрадна-вакальная група “Фантастыка”, народная студыя саломкапляцення “Натхненне” з Мінскай вобласці — усяго больш за 70 дзяцей і падлеткаў.

Ёсць удзельнікі (такія, як студыя “Арэна”), што трапляюць на “Творчасць юных” другі раз. Па словах кіраўніка цыркавой студыі Марыі Кузняцовай, упраўленне культуры Гомельскага аблвыканкама вырашыла рэкамендаваць юных артыстаў да ўдзелу ў фестывалі пасля іх гастролей па Гомельшчыне пад час акцыі “Беларусь — гэта мы!”.

Заснавальнікі фестывалю “Творчасць юных” — Пастаянны камітэт Саюзнай дзяржавы, Парламенцкі сход Саюза Беларусі і Расіі, міністэрствы культуры Беларусі і Расіі, адміністрацыя горада-курорта Анапы.

“Новая хваля” перамог

Заўтра мы даведаемся, хто стаў пераможцам Міжнароднага конкурсу маладых выканаўцаў папулярнай музыкі “Дзіцячая Новая хваля-2010”.

Да заключных мерапрыемстваў гэтага спаборніцтва дайшлі толькі 14 дзяцей з еўрапейскіх краін, а паспрабаваць свае сілы на ім хацелі больш за пяць тысяч юных спевакоў. 22 жніўня ў Міжнародным дзіцячым цэнтры “Артэк” адбудзецца спаборніцтва самых моцных юных выканаўцаў.

14-гадовая магіляўчанка Каця з творчым псеўданімам Іюньская ўдзельнічае ў конкурсе ў старэйшай узроставай групе.

Яшчэ з 10 жніўня ўдзельнікі рэпеціравалі, працавалі над сцэнічнымі вобразамі. Конкурс распачаўся 19 жніўня карнавальным шэсцем, дзеці сталі ўдзельнікамі свята на марскую тэматыку. А па заканчэнні “Дзіцячай Новай хвалі” адбудзецца вялікі гала-канцэрт з удзелам папулярных артыстаў эстрады.

Ва Усходняй Еўропе сферычныя формы ўжываліся пры будаўніцтве курганоў. Балцкія і славянскія плямёны, што прыйшлі на тэрыторыю сучаснай Беларусі ў VII ст. да н.э. — VII ст. н.э., пакінулі пасля сябе мноства курганных збудаванняў. Многія з іх захаваліся да цяперашняга часу. Кароткі агляд традыцыйных відаў купалаў у розных кутках Беларусі прапануем у гэтым нумары.

Сынкавіцкая царква ілюструе адпаведнікі купалаў у готыцы.

Сфера купала

Каскады і шатры пластыкі

Так выглядаў Троіцкі сабор Віцебска.

Сферы Полацкага княства

Доктар архітэктуры, прафесар, дырэктар Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Аляксандр Лакотка, характарызуючы канструктыўныя асаблівасці курганоў на нашых землях, адзначае, што тыя з'яўляліся складанымі збудаваннямі: гэта была не проста купка насыпанага пяску, але пэўнага кшталту маўзалей.

У эпоху росквіту Візантыі купальныя канструкцыі набылі далейшае развіццё. Тады наспела неабходнасць у стварэнні вялікай падкупальнай літургічнай прасторы. Гэтага можна было дасягнуць дзякуючы сферычнай канструктыўнай аснове, наяўнасці апорных слупоў: на іх абапіралася ўся купальная сістэма.

Вынаходніцтва новых канструкцый спрыяла фарміраванню таго вобраза візантыйскага хрысціянскага храма, які быў успрыняты ва Усходняй Еўропе, у тым ліку Полацкім княствам. У Кіеве, Полацку, Ноўгарадзе з'явіліся Сафійскія храмы. Затым узніклі мураваныя крыжова-купальныя саборы рэгіянальнага значэння ў Смаленску, Чарнігаве, а таксама ў Віцебску, Магілёве, Тураве, Гродне. Гэта ўсё карэнным чынам уплывала на асяродак славянскіх гарадоў. Белакаменныя, ружовакаменныя або стракатыя, з прымяненнем валуноў, як у Каложскай царкве ў Гродне, зведаўшыя ўплыў раманскай і гатычнай традыцый, сакральныя збудаванні маляўніча ўпісваліся ў ландшафт. Яны надавалі гораду зусім іншы каларыт, іншыя суадносіны складваліся з навакольным пейзажам.

Увогуле, як лічыць Аляксандр Лакотка, у праваслаўнай архітэктуры традыцыя купалаў — вельмі ўстойлівая: з ёй асацыіруюцца ўяўленні пра нябесны звод. Такія канструкцыі аздоблены шматлікімі вокнамі і з'яўляюцца сімвалам крыніцы святла Нябёсаў — носьбіту Божай ісціны.

Новая сакральнасць

У часы Вялікага княства Літоўскага своеасаблівай інтэграцыяй у заходнюю культуру з'яўляецца гатычная традыцыя працяглага нефу ў архітэктуры сакральных будынкаў, што адлюстроўвала ўжо зусім іншую арганізацыю храма. Як такіх

Фігурныя глаўкі купалаў Свята-Міхайлаўскай царквы ў Слуцку.

купалаў у гатычных храмах не было. Прыкладам таму — царква ў Сынкавічах. Простыя гатычныя чатырохгранныя, васьмігранныя шатры, аскетычныя і даволі суровыя формы не заўсёды адпавядалі ўяўленням аб прыгажосці, аб тым, што спрадвеку было характэрна для ўсходніх славян. З надыходам эпохі Рэнесанса, а пазней — барока, такая ж тэндэнцыя пачала назірацца і ў Заходняй Еўропе: суровыя вежы рабіліся больш пластычнымі, фігурнымі.

У выніку гістарычнага развіцця ў праваслаўных храмах Беларусі шырокае распаўсюджанне атрымалі купалы, а ў каталіцкіх цэрквах — галоўкі над вежамі.

Буйны аб'ём у дрэве

Асаблівае месца ў архітэктуры Беларусі займае народнае драўлянае дойлідства. Купалы драўляных цэркваў мелі свае — рэгіянальныя, мясцовыя — адрозненні. Да таго, як з'явіліся каменныя Сафійскія храмы ва Усходняй Еўропе, цягам многіх стагоддзяў у Беларусі пераважала драўлянае манументальнае дойлідства. Узвялі цудоўныя Ільінскі, Троіцкі саборы ў Маркавым манастыры Віцебска, драўляныя цэрквы ў Оршы.

У цэлым, для Усходняй Еўропы былі характэрны дзве тэндэнцыі. Адна з іх звязана з паўночна-ўсходняй часткай, да якой тэрытарыяльна адносіцца і беларускае Паазер'е — Віцебск ды навакольныя землі. Для рэгіёна характэрны драўляныя цэрквы цэнтрычнай кампазіцыі, з цэнтрычнымі ж купаламі, іх каскадамі. Драўлянай архітэктуры Беларусі па гістарычных прычынах і згодна з традыцыямі не былі ўласцівы буйнааб'ёмныя купальныя будынкі.

Іншая, таксама глабальная, тэндэнцыя ахоплівае паўднёвы ўсход еўрапейскага арэала. Яе сутнасць заключаецца ў наступным: на падставе крыжападобных планаў, роўнаканцовых, выцягнутых, узводзілі шматузроўневыя зрубныя аб'ёмы. Кожны з гэтых ярусаў заканчваўся фігурнай глаўкай. Найбольш яркі прыклад — Міхайлаўская царква ў Слуцку XVIII ст.: яна ўвасабляе традыцыі і рысы, уласцівыя драўлянай архітэктуры, купалам паўднёва-ўсходняга рэгіёна Еўропы. Такіх будынкаў вельмі шмат на беларускім Палессі.

Ёсць і іншая традыцыя цэркваў — так званая валынская: царква ў Давыд-Гарадку сярэдзіны XVIII ст., храмы ў вёсках Сінкевічы Лунінецкага, Велевічы Столінскага, Хаціслаў Маларыцкага раёнаў і многія іншыя. Храмы Заходняга Палесся маюць у сваёй архітэктуры рысы, што ахопліваюць арэал, які трапіў пад уплыў валынскай архітэктуры. Шатры цэркваў вянчаюцца невялікім купалам з маляўнічым, даволі выразным, пластычным абрысам. І ў гэтым — мясцовая традыцыя, уласны каларыт.

— Дзеля гістарычнай справядлівасці трэба сказаць, што ў XIX стагоддзі для нашых гарадоў і мястэчкаў распрацоўваліся ўзорныя тыпавыя праекты, — рэзюмуе Аляксандр Лакотка. — Так ці інакш, чынноўнікі, якія кіравалі на землях Беларусі таго часу, улічвалі спецыфіку краю, ёсць добрыя прыклады такіх пабудоў: цэрквы ў вёсцы Вешня Капыльскага, у вёсцы Чырвоны партызан Добрушскага раёнаў…

Наталля КІРПІЧЭНКАВА

Вяртанне люстэрак з... Залюстэрачча

Давайце пафантазіруем. У іх глядзеліся Караль Станіслаў Радзівіл. Або Дамінік Геронім? А можа, Антоній Альбрэхт Радзівіл? Хто ведае, якія тайны захоўваюць радзівілаўскія люстэркі і, калі паверыць у яго існаванне, іх Залюстэрачча...

Як бы там ні было, але адны з нешматлікіх сведкаў эпохі вялікага магнацкага роду — люстэркі XIX стагоддзя з інтэр'ераў Нясвіжскага палаца вярнуліся дадому: на мінулым тыдні Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Я.Купалы перадаў унікальныя прадметы ў Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік "Нясвіж". Нарэшце фонды установы пабагацелі на доўгачаканы арыгінальны "скарб".

Не памылюся, калі скажу, што пад час гасцявання ў тэатральных сценах люстэркам Радзівілаў "сумаваць" не даводзілася. Яны сустракалі гледачоў у фае тэатра, фіксуючы абліччы не ад-

Люстэркі Радзівілаў: у інтэр'ерах палаца і ў фае Купалаўскага тэатра.

наго пакалення тэатралаў. Колькі наведвальнікаў кідалі на іх свае позіркі, часцяком нават не ведаючы таго, што за каштоўнасць перад імі... Сёння ж, перш чым прадметы княжацкага палацавага інтэр'ера вернуцца на свае былыя месцы, іх чакае ацэнка экспертызы.

— На дадзены момант нам дакладна вядома толькі, што яны паходзяць з Заходняй Еўропы XIX стагоддзя, — распавядае намеснік дырэктара па навуковай працы музейнай установы Галіна Кандрацьева. — Трэба адзначыць, што ў сваім першапачатковым выглядзе люстэркі мелі кансолі, але нават у сённяшнім варыянце яны для нас — вельмі жаданыя аб'екты...

У музеі нават захоўваюцца фотаздымкі інтэр'ераў палаца з выявай люстэркаў, пазначаныя другой паловай XIX стагоддзя. Але як жа тыя шыкоўныя прадметы дэкору апынуліся ў Купалаўскім тэатры?

"Вялікае перасяленне" палацавых люстэркаў адбылося ў 1941-м. Згодна з рашэннем ЦК КП(б) Б-42/17-ОП ад 4 студзеня 1941 г., частка прадметаў дэкаратыўна-прыкладнага мастацтва, у тым ліку касцюмы, зброя, мэбля, былі перададзены ў валоданне Беларускага дзяржаўнага тэатра. З той пары радзівілаўскія прадметы атрымалі тэатральную і, адпаведна свайму азначэнню, функцыянальную "прапіску".

І тым не менш…

— Перамовы аб перадачы люстэркаў доўжыліся некалькі гадоў, — працягвае Галіна Кандрацьева. — І хоць прадметы палацавага інтэр'ера за гэты значны тэрмін атрымалі сваё прымяненне ў тэатры, яго кіраўніцтва пайшло нам насустрач.

Першымі з палацавых рэчаў, якія вярнуліся з тэатра ў музей, сталі кітайскія вазы канца XIX — пачатку XX стст. А ўжо сёлета, дзякуючы канчатковаму рашэнню дырэктара Паўла Палякова, прадметы гасцінна гарнітура і іншыя фрагменты абстаноўкі нарэшце — у Нясвіжы.

Аднак некаторыя рэчы Радзівілаў яшчэ працягваюць свае "тэатральнае жыццё". Гаворка — пра палацавыя крэслы XIX стст., што задзейнічаны ў рэпертуарных спектаклях. Ды нават і гэтая праблема мае вырашыцца ў бліжэйшы год. Сёння, дзякуючы спонсарскай дапамозе, музей плануе ажыццявіць рэканструкцыю шэрагу аб'ектаў Нясвіжскага палаца — з той мэтай, каб абмяняць іх на арыгіналы. Кіраўніцтва тэатра ўжо дало згоду на такі абмен, і напрыканцы года, як мяркуецца, вяртанне ажыццявіцца.

На жаль, шматлікія з тых не пералічаных "арыгіналаў" былі страчаны з цягам часу:

— Гэта калекцыя зброі, касцюмы, — удакладняе Галіна Кандрацьева і дадае: — Але мы рады таму, што ўжо маем. Як складана сёння па крупінках збіраць тое, што было страчана, згублена... І я ведаю, як прымаюцца падобныя рашэнні аб вяртанні таго, да чаго прыкіпела душа. Але тэатр зрабіў нам такі падарунак — і мы гэтаму вельмі рады.

Хто ведае, што ў будучыні пакажуць нам адлюстраванні ў радзівілаўскіх люстэрках?..

Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ

Лета музейных праектаў

Менавіта такім чынам можна акрэсліць адразу некалькі ідэй, якія пачалі ўвасабляць у жніўні ў дзяржаўных літаратурных музеях Беларусі — Купалаўскім і Коласавым.

У прыватнасці, з 26 жніўня па 26 верасня ў Маскве, у Дзяржаўным музеі А.С. Пушкіна, будзе ладзіцца выстаўка, прысвечаная жыццю і творчасці народнага паэта Беларусі Янкі Купалы.

Як распавяла "К" загадчык аддзела навукова-экспазіцыйнай работы Купалаўскага музея Глафіра Кушаль, будзе прадстаўлена прыкладна 200 экспанатаў: рукапісы Песняра, творы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, унікальныя фотаздымкі, перапіска класіка з рускімі літаратарамі і многае іншае. Асобны раздзел прысвецяць апошнім дням жыцця Янкі Купалы ў Маскве.

Як адзначыла Глафіра Кушаль, гэта не першы сумесны праект музейшчыкаў дзвюх краін: традыцыі супрацоўніцтва былі закладзены яшчэ ў мінулым стагоддзі, калі ў Міхайлаўскім прайшла выстаўка "Пушкін у Беларусі".

А ў Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа з верасня пачне працаваць выставачная зала.

— Мемарыяльная зала "Кабінет Якуба Коласа перыяду 1947 — 1952 гг." візуальна дапаўняла асноўную экспазіцыю, аднак інфармацыйна дубліравала рабочы пакой паэта ў апошнія гады яго жыцця, — распавяла "К" намеснік дырэктара музея па навуковай рабоце Ала Зайцава. — Таму мы вырашылі ўсю абстаноўку кабінета Якуба Коласа — мэблю пісьменніка 1947 — 1952 гадоў — перавезці ў наш філіял "Мікалаеўшчына" на мемарыяльную сядзібу ў Смольні: наш музей адчувае неабходнасць у выставачнай плошчы, каб дэманстраваць свае багатыя фондавыя калекцыі.

Першая экспазіцыя адкрыецца ў новай выставачнай зале ў верасні і будзе прысвечана 85-годдзю з дня выхаду паэмы "Сымон-музыка". А ў кастрычніку наведвальнікі займеюць магчымасць азнаёміцца з некаторымі фондавымі калекцыямі Віцебскага мастацкага музея — філіяла Віцебскага абласнога краязнаўчага музея.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ



А.Колесаў. "Партрэт С.К. Заранкі".

Зорка Венера Сяргея Заранкі



С.Заранка. "Унутраны выгляд Нікольскага сабора".

"Ажыццяўленне натуры" ў пластычнай рэчаіснасці

Ураджэнец мястэчка Ляды Бабінавіцкага павета Магілёўскай губерні (сёння — Дубровенскі раён Віцебшчыны), які зрабіў славу жанру партрэта ў XIX стагоддзі... Гаворка — пра мастака Сяргея Заранку. Калі ў мінулы раз распавёў пра станаўленне творцы, легенду аб паходжанні прозвішча майстра пэндзля, дык сёння засяроджуся на сталым перыядзе жыцця нашага земляка.

(Заканчэнне. Пачатак у № 33 за 2010 г.)

...А вось яшчэ адзін выдатны партрэт: 22-гадовай князёўны Лізаветы Абамелек-Лазаравай. Калісьці яна жыла ў доме ў маскоўскім Армянскім завулку, 7 (памерла ў 1904 г.). Ейны сын Сямён Сямёнавіч пайшоў з жыцця напярэдадні Лютаўскай рэвалюцыі, і з яго смерцю старажытны род Абамелекаў знік. Затое ў Італіі, у цэнтры Рыма, побач з Ватыканам, захавалася "віла Абамелекаў". Цяпер тут знаходзіцца рэзідэнцыя расійскага пасла ў Італіі. Вось такая нітачка цягнецца ад гэтай жанчыны, якую ў 1854 г. увасобіў пэндзаль Сяргея Заранкі.

І, канешне ж, найлепшым творам мастака як эталона партрэтнага жывапісу XIX стагоддзя з'яўляецца "Партрэт мастака Фёдара Пятровіча Талстога, віцэ-прэзідэнта Акадэміі мастацтваў". Існуюць некалькі аўтарскіх версій гэтага партрэта: дзве — у Рускім музеі ў Пецярбургу, адна — у нашым Нацыянальным мастацкім. Усе яны мала чым адрозніваюцца (толькі ў колеравых адценнях), але аўтар, відаць, уклаў у гэты вобраз шмат сіл і натхнення. А вось рэцэнзент таго часу так адгукнуўся аб гэтай рабоце ў аглядзе выстаўкі 1850 г.: "Гэта не жывапіс, а — натура, ажыўленыя і адушаўлёныя адлюстраванні… У вачах — жывая вільгаць, выпукласць: гэтыя вочы глядзяць… Рука нібыта аддзялілася ад палатна… Адданасць натуры даведзена да такой ступені, што вы мімаволі забываеце карціну — бачыце перад сабою жывога чалавека…"

Так, у жанры партрэта Заранка дасягнуў такой вядомасці, якую адчуў, мабыць, толькі яго сучаснік Карл Брулоў. Атрымліваючы шматлікія заказы, Заранка стварыў вялікую партрэтную галерэю эліты расійскага грамадства перыяду пачатку кардынальных рэформ. Мяркуйце самі: на яго віртуозна зробленых партрэтах прадстаўлены палітычныя дзеячы і чыноўнікі, міністры і генералы, арыстакраты і адукаваныя купцы, вялікасвецкія дамы і багатыя купчыхі, дзеячы мастацтва і мецэнаты, вучоныя і вандроўнікі, інжынеры і прамыслоўцы 1850-х — 1860-х гг. Я ўжо не кажу пра незлічоныя партрэты вялікіх князёў імператарскай сям'і і самога цара Аляксандра II, што былі створаны для Раманаўскай партрэтнай галерэі Эрмітажа ды пакояў шматлікіх сваякоў імператара.

Як бачна з пераліку персанажаў работ, Заранка да адлюстравання простых людзей "не апускаўся". Відаць, цяжкае дзяцінства сына прыгоннага селяніна, памяць аб пастаянных матэрыяльных нястачах на ўсё жыццё адахвоцілі мастака маляваць тых жа "простолюдинов", з асяроддзя якіх ён выйшаў сам. Такое бывала ў біяграфіях мастакоў…

У апошні перыяд жыцця Заранка часта рабіў партрэты і па фатаграфічных картачках, не звяртаючыся да натуры, і часам, пад цяжарам неймавернай колькасці заказаў, стаў паўтараць свае ж, раней знойдзеныя, творчыя прыёмы і загладжваць да глянцу жывапісную паверхню палатна. І ўчарашнія захопленыя водгукі крытыкі змяніліся або поўным маўчаннем, або рэзкім незадавальненнем жывапісам мастака. Раптам загаварылі, маўляў, "…перспектыўны жывапісец застаўся ў партрэце, і, мабыць, менавіта гэтаму свайму боку, гэтаму перспектыўнаму адлюстраванню галоў, гэтаму мікраскапічнаму вычэрчванню твараў, гэтай мундзірнасці і бестыпічнасці іх зарабіў Заранка ў 1850-я гады сваю вядомасць". У гэтым тагачасная крытыка ў нейкай ступені мела рацыю. Але…

Заранка напісаў больш за сотню партрэтаў, і галоўны недахоп некаторых з іх заключаецца ў тым, што тут больш падабенства вонкавага ў вобразе мадэлі, чым унутранага, псіхалагічнага, душэўна-эмацыянальнага, у адрозненне, скажам, ад партрэтаў больш позняга часу: пэндзля І.Крамскога, І.Рэпіна, В.Пярова. Чаму так? Магчыма, гэта тлумачыцца акалічнасцямі жыцця Сяргея Канстанцінавіча, яго вечнай незабяспечанасцю, ягоным страхам аднойчы аказацца ў галечы. Пры такіх умовах чалавек не можа аддавацца тонкасцям псіхалагічнага аналізу, корпанню ў глыбіні чалавечай душы. Але затое моц пластычнай "лепкі", дзіўнае падабенства, дбайная, руплівая распрацоўка найдрабнейшых дэталей, цудоўная перадача асвятлення ўражваюць у партрэтах пэндзля Заранкі і сёння.

Аднак, з'яўляючыся выдатным майстрам, прызнаным главой новага канкрэтна-натурнага кірунку ў партрэтным жывапісе, Заранка так і не займеў права выкладаць у Акадэміі мастацтваў. Таму ў студзені 1856 г. ён быў вымушаны пагадзіцца прыняць пасаду інспектара і старшага прафесара ў Маскоўскім вучылішчы жывапісу, скульптуры і архітэктуры. На гэтай пасадзе ён прапрацаваў да канца жыцця, чым і змог прынесці вялікую карысць рускаму выяўленчаму мастацтву. Сярод яго вучняў — такія бліскучыя творцы, як В.Пяроў, Л.Саламаткін, У.Макоўскі, І.Пранішнікаў, В.Шэрвуд, В.Пукіраў, М.Неўраў, нашы землякі М.Андрыёлі, Ф.Хадаровіч, В.Сляндзінскі…

Як педагог ён сапраўды пакінуў пра сябе добрыя ўспаміны, бо заўсёды быў заняты клопатам пра творчую моладзь, якая з'язджалася ў Маскву з розных куткоў імперыі і не мела за душой ні капейчыны. Заранка хадайнічаў аб прысуджэнні стыпендый, аб вызваленні студэнтаў ад воінскай павіннасці, аб дазволе вучыцца бясплатна…

С.Заранка. "Партрэт Ф.П. Талстога".

Вось што ён пісаў 26 жніўня 1857 г. у сваёй запісцы "Пра метад выкладання мастацтва", якая была накіравана ў Савет Маскоўскага мастацкага таварыства: "Маладыя людзі, што паступаюць у наша вучылішча, практычна ўсе, без выключэння, — самыя бедныя, і яны не толькі не забяспечваюцца Вучылішчам ва ўтрыманні, але яшчэ абавязаны ўносіць пэўную суму за права навучання… Увядзенне ў вучылішчы курса навук забароніць доступ асобам бяднейшага саслоўя, бо, абавязаныя ахвяраваць навучэнню навукам тым часам, які цяпер выкарыстоўваюць на набыццё сродкаў да існавання, яны відавочна будуць вымушаны адмовіцца нават ад мастацтва…" Прафесар Заранка лічыць, што ўвядзенне курса навук павінна суправаджацца яшчэ і забеспячэннем студэнтаў утрыманнем.

А вось фрагмент з прашэння ўдавы Сяргея Канстанцінавіча: "Каб прыкаваць да сябе цэлае пакаленне мастакоў, недастаткова аднаго таленту, — трэба было разумець асаблівасці здольнасцей кожнага жадаючага вучыцца і вельмі часта дзяліцца апошнім кавалкам хлеба з таленавітым вучнем, каб толькі ён не падаў духам. Такіх вучняў у Сяргея Заранкі жыло заўсёды некалькі чалавек на поўным яго забеспячэнні: выключна для таго, каб прыродныя іхнія здольнасці не прапалі дарма..."

Усе вышэйзгаданыя цытаты калісьці былі ўзяты з Цэнтральнага дзяржаўнага літаратурнага архіва (ф. Маскоўскага вучылішча жывапісу і скульптуры. Вопіс 1, справа № 148,173).

У сваіх успамінах вучань Заранкі Васіль Пяроў з дзіўнай падрабязнасцю і некаторай іранічнасцю пераказвае гутаркі настаўніка са сваімі выхаванцамі. Я думаю, яны будуць цікавыя з пункта гледжання лепшага разумення "эстэтыкі творчасці" Сяргея Канстанцінавіча, чые меркаванні накіроўваліся да адной мэты: упэўніць, што жывапіс — цяжкая справа, што няма "твораў па ўражанні і творчасці па натхненні", што ў мастацтве неабходны "станоўчыя веды". Заранка прапаведуе "практыцызм": спатрэбяцца перспектыва і анатомія, а не бессэнсоўнае чарчэнне гарызантальных і нахіленых ліній або завучванне назваў і тэрмінаў. Мастак апалчаецца на сцёртыя традыцыйныя паняцці. Ён не прымае "хараства рысунка", але прызнае яго "дакладнасць". Так, тэхніка — важная, аднак майстар засцерагае "ад віртуознасці або бойкасці пэндзля, шырыні пісьма". Жывапіс, паводле меркавання Заранкі, "ёсць мастацтва, якое адлюстроўвае толькі бачнае ў бачных формах". Таму неабходна дакладна перадаваць прыроду, "рабіць копію з чалавека і з усяго бачнага: што правільна прыродзе — тое добра і цудоўна, што няправільна — то ніжэй за ўсякую крытыку".

Мне здаецца, што некаторыя крайнасці меркаванняў Заранкі пра мастацтва ў чымсьці падобныя па рэзкасці тону, літаратурнай сентэнцыі з выказваннямі яго сучасніка — вялікага нізвяргацеля аўтарытэтаў Дзмітрыя Пісарава…

У 1865 г. Заранка быў выкліканы ў Пецярбург, каб стварыць партрэты імператарскай сям'і для Эрмітажа. Над гэтай замовай ён працаваў пяць гадоў. Потым зноў вярнуўся ў Маскву, дзе паспеў намаляваць два апошнія ў сваім жыцці партрэты: гэта выява графіні Вольгі Шувалавай (народжаная князёўна Беласельская-Белазёрская) і авальны партрэт "Дзяўчынка ў блакітнай сукенцы" (на фоне нізкага пейзажнага гарызонту і шэра-блакітнага неба ён адлюстраваў сваю юную дачку Наташу).

20 снежня 1870-га (1 студзеня 1871 г. па новым стылі) Сяргей Канстанцінавіч раптоўна сканаў ад разрыву сэрца, і, як потым пісалі, "пакінуў сям'ю ў вялікай беднасці". Шчыра кажучы, мне неяк дзіўна ўспрымаць гэтыя словы ў адносінах да Заранкі. Чалавек, што меў мноства дзяржаўных і прыватных заказаў, добра аплачваемы прафесар-педагог, сам не марнатравец, не мантач, не п'яніца, не гулец у рулетку або карцёжнік, не аматар ездзіць па Еўропе і — без маёмасці, без грошай! Штосьці тут не клеіцца, або я проста не ведаю пра нейкія таемныя ўмовы сямейнага і прыватнага жыцця выдатнага мастака.

Сяргей Заранка быў пахаваны на могілках старажытнага Аляксееўскага жаночага манастыра ў Маскве. Яму было 52 гады…

Барыс КРЭПАК

з 21 жніўня

АК Афіша "К"

да 29 жніўня

МУЗЕІ *

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Леніна, 20. Тэл.: 227 45 62.

■ Мастацтва Беларусі XII — XIX стст.
■ Мастацтва Беларусі канца XIX — пач. XXI стст.
■ Мастацтва Расіі XVIII — пачатку XX стст.
■ Мастацтва краін Усходу XV — XX стст.
■ Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.
■ Экспазіцыя жывапісу, скульптуры, графікі мастакоў 1940-х — 1980-х гг.

Выстаўкі:
■ **"Паэзія ў паўсядзённасці"** (жывапіс Барыса Казакова).
■ **"Саюз рускіх мастакоў. Новы час".**
■ **"Усмешкі беларусаў. Вядомых і розных :)".**

Філіялы Нацыянальнага мастацкага музея РБ:

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XIX ст."

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 227 87 96.

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ **"Свет з вышыні".**

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г.п. Мір, Карэліцкі р-н, Гродзенская вобл. Тэл.: (8–01596) 2 30 35.

■ Пастаянная экспазіцыя.

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА ў в. Раўбічы

Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі р-н. Тэл.: 507 44 68.

■ Пастаянная экспазіцыя.

МУЗЕЙ В.К. БЯЛЫНІЦКАГА-БІРУЛІ ў г. МАГІЛЁВЕ

г. Магілёў, вул. Ленінская, 37. Тэл.: (8–0222) 22 48 87.

■ Пастаянная экспазіцыя. Культура I-й пал. XIX ст.
■ **"Чорна-белыя мары"** (выстаўка графікі Вячаслава Паўлаўца).

МУЗЕІ *

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ



г. Мінск, вул. К.Маркса, 12. Тэл.: 227 43 22.

Экспазіцыі:
■ **"Мастацтва ў гарадской культуры XIX — пачатку XX стст.".**
■ **"Старажытная Беларусь".**
■ **"Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы".**
■ **"З крыніц адвечнай прыгажосці".**
■ **"Водбліскі ваеннай славы" (еўрапейская зброя і вайсковае абмундзіраванне XIX — 1-й пал. XX стст.).**
"Якуб Колас. Жыццё і творчасць".
■ Тэатралізаваная экскурсія паводле казак Якуба Коласа.

Выстаўкі:
■ **"Футбол — не толькі гульня"** (выстаўка, прымеркаваная да Чэмпіянату свету па футболе, з калекцыі рупліўца культуры Наднёманскага краю Анатоля Грэкава).

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Янкі Купалы, 4. Тэл.: 227 78 66.

Экспазіцыі:
■ **"Якуб Колас. Жыццё і творчасць".**
■ Тэатралізаваная экскурсія паводле казак Якуба Коласа.

Выстаўкі:
■ **"Футбол — не толькі гульня"** (выстаўка, прымеркаваная да Чэмпіянату свету па футболе, з калекцыі рупліўца культуры Наднёманскага краю Анатоля Грэкава).

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ



г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 25а. Тэл: 226 03 98.

Экспазіцыі:
■ **"Святло стагоддзяў"** (выстаўка, прымеркаваная да юбілейных дат беларускіх асветнікаў).
■ **"Васіль Быкаў. Шлях, вызначаны лёсам".**
■ **"Спадарожнікі дзяцінства".**
■ **"Дарогамі жыцця".**
■ **"Беларускія пісьменнікі XX стагоддзя ў творах выяўленчага мастацтва".**
(ілюстрацыі М.Купавы да аднайменнай кнігі У.Караткевіча).

УВАГА!

Паважаныя чытачы!

ІДЗЕ ПАДПІСКА

на газету "Культура"
Падпісныя індэксы:
індывідуальная падпіска — 63875,
ведамасная падпіска — 638752;

на часопіс "Мастацтва"
Падпісныя індэксы:
індывідуальная падпіска — 74958,
ведамасная падпіска — 749582.

НА ВЕРАСЕНЬ І НАСТУПНЫЯ МЕСЯЦЫ 2010 ГОДА!

■ **"Гіганты Ледавіковага перыяду".**

Выстаўкі:
■ **"Памяць пра Грунвальдскую перамогу"** (прысвечана 600-годдзю перамогі ў Грунвальдскай бітве).

Дом-музей I З'езда РСДРП г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а. Тэл.: 290 68 47.

■ Пастаянная экспазіцыя **"Гісторыя I З'езда РСДРП".**
■ **"Лятаючыя кветкі"** (выстаўка рэдкіх матылькоў і экзатычных насякомых).

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА

г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5. Тэл.: 294 91 96.

■ Пастаянная літаратурна-мемарыяльная экспазіцыя
■ Пастаянная экспазіцыя **"Жыццё і творчасць Янкі Купалы".**
■ Цыкл музейна-педагагічных заняткаў **"Дзядзька Янка, добры дзень!".**

Выстаўкі:
■ **"Курганы шмат чаго нам гавораць"** (да 100-годдзя з моманту напісання паэмы "Курган").
■ Выстаўка жывапісу П.Сергіевіча (ілюстрацыі да твораў Янкі Купалы, партрэты Я.Купалы і яго жонкі).

ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

г. Мінск, вул. М.Багдановіча, 15. Тэл.: 334 72 61.

Выстаўкі:
■ **"Лебядзіны скіт"**
■ Пастаянная экспазіцыя.

Выстаўкі:
■ **"Халодная зброя. Традыцыі і сучаснасць".**
■ **"Как молоды мы были... Семейный альбом".**

Выстаўкі праекта "У пошуках страчанага" У.Ліхадзедава:
■ **"Беларусь. Рэха вайны ў памяці пакаленняў".**
■ **"Беларусь на старых паштоўках канца XIX — пачатку XX стст.".**
■ **"Мінск: падарожжа ў часе".**

ГОМЕЛЬСКІ ПАЛАЦАВА-ПАРКАВЫ АНСАМБЛЬ

г. Гомель, пл. Леніна, 4. Тэл.: (8-0232) 74 19 11.

Цэнтральная частка палаца

Выстаўкі:
■ **"Соколиная охота — царская, псовая — барская".**
■ **Жывапіс Валерыя Шкарубы.**
■ **Жывапіс Юрыя Пэна.**
■ **"Успаміны аб Грунвальдзе".**

Экспазіцыі:
■ **"Культавыя прадметы".** ("Дамавая царква", паўночны рызаліт палаца).
■ **"Загадкавыя фантазіі мора"** (грот палаца).
■ Экспазіцыя, прысвечаная дзяржаўнаму дзеячу СССР А.Грамыку.
■ **"Чырвоная гасцёўня".**
■ **"Зала ўрачыстых прыёмаў".**
■ Экспазіцыя адкрытага захавання археалагічнай калекцыі музея (цокальны паверх паўднёвай галерэі).

Вежа палаца Румянцавых і Паскевічаў

Гісторыка-мемарыяльная экспазіцыя "Уладальнікі Гомельскага маёнтка Румянцавы і Паскевічы".

Выстаўкі:
■ **"Вяртанне забытых кніг".**
■ **"Ад Антычнасці да Сучаснасці".**

Паўночнае крыло палаца

Выстаўкі:
■ **"...Дзе лялькі так падобны да людзей".**
■ **"Свет звяроў Гомельшчыны".**
■ Працуе куток жывых экзатычных рэптылій.

Зімовы сад

Свет субтрапічных раслін і жывёл.

ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ МУЗЕЙ ВАЕННАЙ СЛАВЫ

г. Гомель, вул. Пушкіна, 5. Тэл.: (8-0232) 77 60 60.

■ Ваенна-гістарычная экспазіцыя, прысвечаная гісторыі Гомельшчыны.
■ Лакальныя экспазіцыі ў санітарным вагоне; у партызанскай зямлянцы.
■ На тэрыторыі музея працуе пнеўматычны цір.

Выстаўкі:
■ **"Айчынная вайна 1812 года"** (з фонду Кобрынскага ваенна-гістарычнага музея імя А.В. Суворава).
■ **"Музей крыміналістыкі".**
■ Ваенная тэхніка на адкрытай пляцоўцы.

ГАЛЕРЭІ*

ПАЛАЦ МАСТАЦТВА

г. Мінск, вул. Казлова, 3. Тэл./факс.: 290 60 10.

■ **"Мастакі Прынямоння".**
■ Персанальная выстаўка **Уладзіміра Капшая.**

МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ "УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ"

г. Мінск, Кастрычніцкая плошча, 1 (Палац Рэспублікі). Тэл.: 227 26 12.

■ Фотавыстаўка **"Дарога на Грунвальд".**

ГАЛЕРЭЯ ТЫЗЕНГАУЗА

г. Гродна, пл. Тызенгауза, 4. Тэл./факс: (8–0152) 72 27 57.

■ Выстаўка работ беларускіх мастакоў.
■ Выстаўка жывапісу Сяргея Уткіна **"Шчасце ёсць".**

КАРШІННАЯ ГАЛЕРЭЯ Г.ВАШЧАНКІ

г. Гомель, вул. Карповіча, 4. Тэл.: (8–0232) 77 75 20.

Экспазіцыя:
■ **"Гаўрыла Вашчанка".**
■ Выстаўка-продаж твораў выяўленчага мастацтва, сувеніраў і тавараў для мастакоў.

Выстаўкі:
■ **"Народжаныя морам"** (з серыі "Рамзес": каралы, ракавіны, марскія зоркі, жыхары мора).
■ Арт-праект **"По ту сторонние".**
■ Выстаўка **"Традыцыі і культура Японіі".**

КУЛЬТУРА

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА — АСВЕТНІЦКАЯ ГАЗЕТА

Выдаецца з кастрычніка 1991 года
Заснавальнік — **Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь**
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637

Галоўны рэдактар — Людміла КРУШЫНСКАЯ

Рэдакцыйная калегія:
Лілія АНАНІЧ, Уладзімір АРЛОЎ, Уладзімір ГІЛЕП, Ірына ДРЫГА, Аляксей ДУДАРАЎ, Уладзімір ЗАМЯТАЛІН, Валянцін ЕЛІЗАР'ЕЎ, Міхаіл КАЗІНЕЦ, Віктар КУРАШ, Аляксандр РАШЧУПКІН, Барыс СВЯТЛОЎ, Рычард СМОЛЬСКІ, Святлана СУХАВЕЙ, Міхаіл ФІНБЕРГ, Леанід ШЧАМЯЛЁЎ, Уладзімір ШЧАСНЫ.

Рэдакцыя:
Сяргей ТРАФІЛАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), Пётр ОВАД (адказны сакратар).

Рэдактары аддзелаў:
Канстанцін АНТАНОВІЧ, Надзея БУНЦЭВІЧ, Таццяна КОМАНАВА, Барыс КРЭПАК, Яўген РАГІН, Ілля СВІРЫН, Антон СІДАРЭНКА.

Спецкарэспандэнты:
Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Алена САБАЛЕЎСКАЯ, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ.

Загадчык аддзела фотаілюстрацый — Юрый ІВАНОЎ
Карэктар — Інга ЗЕЛЬГІС
Мастацкі рэдактар — Наталля ОВАД

Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр.Незалежнасці,77.
Тэлефон: (017) 289-34-66 (прыёмная) (017) 286-07-97, (017) 334-57-23
Тэлефон/факс: (017) 334-57-35
Рэкламны аддзел: тэл. (017) 334-57-41
www.kimpress.by
E-MAIL: kultura@tut.by

Выдавец — **Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Культура і мастацтва"**
Ліцэнзія на выдавецкую дзейнасць ЛВ №02330/0494414 ад 17 красавіка 2009 г.
220013, Мінск, пр.Незалежнасці, 77. Тэл. (017) 289-34-66. Бухгалтэрыя: тэл. (017) 334-57-35
Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца.
Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца работы, зваротны адрас.
Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі.
Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.
***Матэрыял на правах рэкламы.**

© "Культура", 2010.

Індэкс 63875
Наклад 8242
Падпісана ў свет 19.08.2010 у 18.30
Замова 3763
РУП "Выдавецтва "Беларускі Дом друку".
ЛП № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
Пр.Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.

ISSN 1994-4780